№ 1 (551) 10 студзеня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# 2008 паваротны?

## У НУМАРЫ

**Чаму кватэры не таньнеюць**

Другасны рынак жылля: вынікі і прагнозы. Піша Раман Мамчыц. **Старонка 6.**

**Ад выбару амэрыканцаў залежыць і цана нафты**



У ЗША стартавала найбольш інтрыгоўная прэзыдэнцкая кампанія апошніх дзесяцігодзьдзяў. Піша Алесь Кудрыцкі. **Старонка 10.**

**На Беларускую елачку**

ў Горадні прыйшло ў 4 разы болей людзей, чым летась. Піша Ігар Кузьмініч. **Старонка 26.**

**Бадзёрая кома**

афіцыёзу і шыкоўныя здабыткі ў кароткім мэтражы і андэграўндзе. Беларускае кіно на мяжы 2008. Піша Андрэй Расінскі. **Старонка 28.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Алесь Таўстыка: Мне ніхто ня зможа перашкодзіць

**Працягваецца забастоўка прадпрымальнікаў. «Усе кажуць пра грошы. А мы губляем ня грошы, а сумленьне і будучыню», — гутарка зь лідэрам прадпрымальніцкіх пратэстаў. Старонка 3.**

# Сустрэчы з нашаніўцамі ў Менску, Віцебску, Полацку, Маладэчне

**У чацьвер 17 студзеня а 17-й у бібліятэцы імя Пушкіна (вул. Гікалы, 4)** адбудзецца прэзэнтацыя **кнігі Артура Клінава «Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца»**.

У прэзэнтацыі возьмуць удзел Валянцін Акудовіч, Уладзімер Арлоў, Адам Глёбус ды іншыя вядомыя дзеячы беларускай культуры.

**18 студзеня ў Менску на Ўправе БНФ (вул. Варвашэні, 8)** пройдзе прэзэнтацыя **раману Наталкі Бабінай «Рыбін горад»**. Апроч аўтаркі ўдзел бяруць Валянцін Тарас, Вольга Іпатава, Міхась Скобла. **Пачатак а 18-й.**

**19 студзеня** пісьменьнік Уладзімер Арлоў, рэдактар ARCHE Валер Булгакаў і рэдактар «Нашай Нівы» Андрэй Скурко наведаюць Полацак і Віцебск. **Сустрэча ў Полацку пачнецца а 16-й, у Віцебску — а 19-й.** У рамках сустрэчы будуць прэзэнтаваныя кніжка У.Арлова «Імёны свабоды», часопіс ARCHE, новыя выданьні з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва». Даведкі па т.: (029) 510-91-06 (Полацак), (029) 662-71-26 (Віцебск).

**26 студзеня ў Маладэчне (вул. Чыстая, 26)** пройдзе прэзэнтацыя гістарычнай публікацыі **«Кароткі нарыс беларускага пытаньня»** з удзелам Валера Булгакава і гісторыка Алеся Пашкевіча. **Пачатак а 16.00.**

# Арыштаваны рэдактар зачыненай «Згоды»

Менскі гарадзкі суд узнавіў крымінальную справу супраць былога намесьніка галоўнага рэдактара газэты «Згода» Аляксандра Зьдзьвіжкова. Яго абвінавачваюць у парушэньні артыкулу 130 ч 1. КК «Распальваньне рэлігійнай варажнечы». Пра гэта «НН» паведаміў тагачасны галоўны рэдактар «Згоды» Аляксей Кароль. 30 сьнежня ён атрымаў пазоў зьявіцца ў Менскі гарадзкі суд 11 студзеня ў якасьці сьведкі па гэтай справе.

Крымінальная справа супраць Зьдзьвіжкова і газэты «Згода» была заведзеная ў 2006 годзе, напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, за зьмяшчэньні ў выданьні карыкатураў на прарока Мухамэда, якія раней былі надрукаваныя ў дацкай прэсе. «Згоду» тады зачынілі, а скончыць справу супраць Зьдзьвіжкова не змаглі, бо той на пэўным этапе сьледзтва некуды зьнік. Дзе ён знаходзіўся да гэтай пары, ніхто ня ведае. Суд тады пастанавіў прыпыніць сьледзтва праз адсутнасьць галоўнага абвінавачанага.

Аляксей Кароль кажа, што карыкатуры на Мухамэда ў газэту трапілі з асабістай ініцыятывы Аляксандра Зьдзьвіжкова. Сам Кароль даведаўся пра гэта толькі па выхадзе нумару, пасьля чаго адразу забараніў яго распаўсюджваць.

Аляксей Кароль кажа, што змог датэлефанавацца ў Менскі гарадзкі суд, дзе яму паведамілі, што Зьдзьвіжкоў знаходзіцца пад арыштам, але не ўдакладнілі зь якога часу. Частку сьведкаў выклікалі на 14 студзеня.

Слуханьні па справе пачнуцца 11 студзеня а 11 гадзіне ў зале Менскага гарадзкога суда (вул. Дуніна-Марцінкевіча, д.1, корп. 3). Паводле гэтага артыкулу Аляксандру Зьдзьвіжкову можа пагражаць да пяці гадоў пазбаўленьня волі.

**Зьміцер Панкавец**

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84

# «Ты зашыбісь, бульбаш!»

Можна было б парадавацца за АНТ, якое нарэшце паспрабавала зрабіць эксклюзіўную навагоднюю перадачу «Паўлінка new». На тле НТВ, якое хацела ў навагоднюю ноч завабіць гледачоў голымі цыцкамі, нашы выглядалі прыстойна.

Шмат беларускіх песень у новай «Паўлінцы», цікавыя вобразы артыстаў. Усё б добра, але сапсавалі настрой апошнія кадры праекту, фінальная песьня пра тое, што «ты бульбаш і я бульбаш». Піша Руслан Равяка. **Старонка 13.**

## ПРАВАПІС

**— Ці можа нацыянальнае выданьне друкавацца на акупацыйным дыялекце — наркамаўцы, што прыдумалі бальшавікі нам на згубу?**

— Наркамаўка — гэта не дыялект, а правапіс. Мова ў нас адна, не паддаваймася на правакацыі падзелу, беларусы. «Наша Ніва» найбольш пасьлядоўна і цьвёрда трымаецца клясычнага правапісу, і таму, хто калі не яе рэдактар мае поўнае права сказаць: правапісныя традыцыі важныя, як любыя традыцыі, а ўсё ж культура мовы найважнейшая. Прывяду паралель з хрысьціянства: сіла веры важнейшая за абрад, важнейшая за тое, хрысьціцца чалавек трыма пальцамі, ці двума, ці пяцьцю, ці ўвогуле ня хрысьціцца. Абрад, бывае, мярцьвее, і тады жывая вера нараджае новы абрад. А вось калі веры не застаецца, тады няма рады. Так і з мовай і правапісамі.

**З адказаў Андрэя Дынька на інтэрнэт-канфэрэнцыі з чытачамі, якую можна прачытаць на сайце nn.by**

# Алесь Таўстыка: Мне ніхто ня зможа перашкодзіць

Гутарка зь лідэрам прадпрымальніцкіх пратэстаў.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Алесь Таўстыка крыху спазьняецца на інтэрвію. У гэты час мяне з Андрэем Лянкевічам чаем з цукеркамі частуе ягоная жонка Натальля. На ўкраінскім тэлеканале «Інтер» ідзе нейкая перадача пра тое, як зьнішчалі аднаасобнікаў у Савецкім Саюзе, пра «спэкулянтаў і таргашоў». Пераглядваемся і ўсьміхаемся, здаецца, больш актуальнай перадачы знайсьці ў тэлераскладзе проста немагчыма. Натальля кажа, што раскулачылі і Алесевага дзеда, якога пасьля яшчэ й саслалі. Зноў угледаемся ў экран. Праз нейкі час зьяўляецца і сам Алесь Таўстыка, толькі з марозу. Моцны поціск рукі і прыязная ўсьмешка.

**«Наша Ніва»: Раскажыце троху пра сябе, ня так і шмат пра Вас вядома?**

**Алесь Таўстыка**: Я нарадзіўся ў мястэчку Крывічы Мядзельскага раёну. Я з шматдзетнай сям'і. Бацька выпіваў, сямейны цяжар несла маці. Галоўную ролю ў маім выхаваньні ў маленстве адыгралі бабуля і дзядуля. У школе быў нават кіраўніком савету атраду піянэрскай арганізацыі. У камсамол зь першага разу не прынялі за нейкія мае погляды. Памятаю, што яшчэ ў школе пры маім удзеле адбылася невялікая рэвалюцыя, калі пераканалі настаўнікаў, што мы таксама людзі і нельга ламаць указкі на нашых сьпінах. Вывучаў ангельскую мову для паступленьня ў ін'яз, удзельнічаў у школьных алімпіядах па ангельскай мове. Марыў быць перакладчыкам на караблі, бо нехта сказаў, што яны шмат атрымліваюць. Удзельнічаў у рэканструкцыі Крывіцкай царквы. Пасьля гэтай працы нешта ў маім жыцьці зьмянілася. Зьвярнуўся да бабулі, каб яна звадзіла мяне ў царкву. Быў такі сьвятар Пётра Кузьмічоў, які пазьней пасябраваў з айцом Аляксандрам Надсанам, ён вельмі паўплываў на мяне. Удзельнічаў у першых крыжовых хадах у Менску. Потым пайшоў у войска. Давялося панасіць бесказырку на флёце ў Таліне. Даслужваў ужо ў Менску.

**«НН»: Дык пасьля службы Вы пайшлі некуды вучыцца?**

**АТ**: Вырашыў, што вучыцца можна пасьпець заўсёды, а трэба жаніцца. Знайшоў сабе дзяўчыну, сёлета ўжо пятнаццаць гадоў як мы разам з жонкай. Спачатку Натальля пайшла вучыцца ў наргас, я за яе нават здаваў іспыты па беларускай мове. Пасьля ўжо я скончыў завочна Горацкую акадэмію, факультэт эканомікі і кіраваньня. Тамсама, дзе некалі вучыўся Лукашэнка. Ведаеце, некалі мне стукнула ў галаву, каб перамагчы Лукашэнку, трэба прайсьці ягоную дарогу, таму паступіў менавіта туды. Давялося пачытаць ягоныя курсавыя і дыплёмныя работы: «дзесяць трактарыстаў павінныя мець у жонках дзесяць даярак, жыць на сваім хутары і працаваць на карысьць дзяржавы».

**«НН»: А прадпрымальніцтвам калі заняліся?**

**АТ**: Трэба было за нешта жыць. Мне сустрэўся мічман, зь якім я служыў, ён і прапанаваў заняцца «бізнэсам». Адкрываўся стадыён «Лякаматыў», які толькі-толькі пачынаў працаваць. Я набываў на Чэрвеньскім рынку ў алькашоў ржавыя ражковыя ключы, адчышчаў, фарбаваў і перапрадаваў. У той час быў вялізны попыт на інструмэнты, бо машынаў тады накуплялі шмат. Хадзілі па розных крамках, шукалі «тармазуху», якую пасьля таксама перапрадавалі. Бізнэс, ведаеце, знаходзіць сваё асяродзьдзе, дзе яго можна хутчэй разьвіваць.

**«НН»: А на сёньняшні дзень, што ўяўляе Ваш бізнэс?**

**АТ**: Пасьля, як кажуць: «Не ўкладайце ў акцыі рэсурсы, укладаеце іх у адрасы IP- і IT». У Беларусь тады толькі пачыналі прыходзіць кампутары. На гэтым пачаў троху зарабляць грошай, будаваўся. Сёньня я працягваю займацца кам-

**Алесь Таўстыка**

нарадзіўся ў 1973 г. у мястэчку Крывічы (Мядзельшчына). Прадпрымальнік. Жыве ў Менску. Гадуе двух дзяцей — сына Антося і дачку Кацярыну.

Працяг на старонцы 4.

# Алесь Таўстыка: Мне ніхто ня зможа перашкодзіць

**Працяг са старонкі 3.**

путарамі, гандлюю ў Ждановічах. Працую адзін. Можна было наняць рабочых, але тады я ўвесь час буду мучацца сумненьнямі, ці зробяць яны за мяне справу. Прызнаюся, што працаваць цяпер стала цяжэй. Скажам, у 2000 годзе арэнднае месца каштавала 15 даляраў, падаткі былі — 50. Сёньня толькі арэнднае месца — 100 даляраў.

**«НН»: Галоўнае патрабаваньне прадпрымальнікаў — адмена ўказу прэзыдэнта № 760, які не дазваляе дробным гандлярам мець наёмных рабочых. Здаецца, што Вас гэты ўказ не закранае, дык дзеля чаго тады ўвязаліся ў змаганьне за правы прадпрымальнікаў?**

**АТ**: Мне часта задаюць гэтае пытаньне. Гэты ўказ не закранае мяне сёньня, але я ня ведаю, што будзе заўтра. Мы патрабуем прыняцьця закону аб малым і сярэднім бізнэсе. У мяне не стаіць пытаньне, каб разбагацець на мільярд. Дайце мне толькі нармальна працаваць, больш я нічога не хачу. Проста заўтра ці пасьлязаўтра зачыняць усіх індывідуальных прадпрымальнікаў і нічога з гэтым ужо не паробіш. Трэба дабівацца свайго цяпер. Я не перарэгістраваўся ў ЧУПа, бо ня бачу ў гэтым сэнсу. Ад назвы нічога, апроч колькасьці падаткаў, ня зьменіцца.

**«НН»: Дык як Вы сталі адным зь лідэраў прадпрымальніцкага руху?**

**АТ**: Ня ведаю. Трэба запытаць у крыві. Проста не люблю няпраўду і несправядлівасьць. Чыноўнікі не займаюцца эканомікай, а толькі душаць прадпрымальнікаў падаткамі. Пасьля нашых першых страйкаў была створаная рабочая група з удзелам чыноўнікаў, дык яны працавалі, як супрацоўнікі КДБ ці сьледчыя: куды езьдзіце? колькі возіце? на якія сумы? Я казаў Туру: «Дайце нам выступіць на тэлебачаньні». Адказу ніякага.

**«НН»: А сысьці з рынку ня хочаце?**

**АТ**: Пакуль не. Насамрэч дзякуючы прадпрымальніцтву выявіў у сабе нейкія лідэрскія якасьці. Можа, гэта і дзякуючы нейкай напорыстасьці, нават калі стамляесься, то ўшчуваеш сябе, што гультай, што трэба працаваць, бо гэтага патрабуюць людзі. Дзеля такіх людзей я і буду працаваць. Прыйдзе час — можа і сыду з гэтага. Але нават калі я чы рынкі таксама не працуюць. Алесь Макаеў таксама паведаміў, што не працуе «Паркінг». Хутчэй за ўсё, працуе толькі Biggz, дзе ўсе ў цяпле.

**«НН»: А калі Вы не даб’яцеся свайго, то 15 студзеня зноў выйдзеце на працу?**

**АТ**: Будзем працаваць зь людзьмі, каб данесьці да ўсіх інфармацыю, што з 1 лютага будзем зноў пачынаць страйк і ня сплачваць падаткаў.

**«НН»: Але ці пойдуць на гэта прадпрымальнікі, бо ад гэтага губляюцца вялікія грошы?**

**АТ**: Усе кажуць пра грошы. Ня варта на іх так часта акцэнтаваць увагу. Мы губляем ня грошы, а сумленьне і будучыню. Мы згубім абавязкова нейкія прыбыткі, час, смачную ежу, не набудзем нейкія рэчы, але гэтым мы і не даможамся новага закону. Часта нават чыноўнікі кажуць, што ў аснове эканомікі дзяржавы ляжыць прыватны бізнэс. Калі прадпрымальнікаў увесь час ціснуць падаткамі, то гэта значыць, што кіраўнікі ўсёй гэтай бюракратычнай машыны зусім неадукаваныя людзі. Яны ня толькі ня ўмеюць кіраваць машынай, але і ў мэханіцы нічога не разумеюць. У такога кіроўцы трэба забраць правы і адправіць на «вольныя хлябы».

> «Некалі мне стукнула ў галаву, каб перамагчы Лукашэнку трэба прайсьці ягоную дарогу, таму пастугіў у Горкі».

сыду на нейкае прадпрыемства, то і там буду змагацца за правы людзей, такі ўжо ў мяне характар.

**«НН»: Ці будзе нейкі плён ад новага страйку прадпрымальнікаў?**

**АТ**: Вынік ужо ёсьць. Калі ў Магілёве, Віцебску і іншых гарадах людзі будуць выходзіць і казаць сваім гарадзкім кіраўнікам, што ў прадпрымальнікаў немагчымыя для працы ўмовы, то сэнс будзе, я перакананы.

**«НН»: Колькі працэнтаў прадпрымальнікаў ад Новага году ня выйшлі на працу?**

**АТ**: Я маю зьвесткі толькі па Менску. У Ждановічах з трох тысячаў кропак працуе толькі трыста. Гарантавана кажу, што палова зь іх нават не зьяўляюцца прадпрымальнікамі, напрыклад, гандляры мабільнымі тэлефонамі. Пра другую палову скажу, што там працуюць не прадпрымальнікі, а наёмныя рабочыя. Дзіва, што падаткавікі не правяраюць гэтыя кропкі. Аўтамабільны і будаўні-

**«НН»: Пры агульнай праблеме прадпрымальнікі ўсё адно не зьяўляюцца маналітнай сілай. Чаму?**

**АТ**: Саюз прадпрымальнікаў Беларусі — гэта людзі, якія ніколі не былі дробнымі гандлярамі. У іх буйны бізнэс — фуры зь півам ці нешта яшчэ. Яны кажуць, што ўжо знаходзяцца на іншым узроўні і ня хочуць мець з намі нічога супольнага. Як гэта так? Некалі яны былі з намі, а цяпер ужо — не. Дзіўна. Дасягнуць дамоўленасьці з Анатолем Шумчанкам удалося, ён падтрымаў нас.

**«НН»: На сваіх мітынгах прадпрымальнікі высоўваюць толькі эканамічныя лёзунгі, ці палітычныя таксама?**

**АТ**: Я асабіста лічу, што абавязкова павінныя. Ня зьменіцца ўнутраная палітыка краіны, то пра якое разьвіцьцё прадпрымальніцтва можна гаварыць тады?

**«НН»: А самі сысьці ў палітыку ня хочаце?**

**АТ**: На парлямэнцкіх выбарах я буду дапамагаць Алесю Лагвінцу. У выбарах павінна ўдзельнічаць сапраўдная каманда, а не адзін чалавек. Я гатовы пайсьці ў палітыку. Насамрэч палітыцы трэба дзесьці вучыцца. Я вельмі ўдзячны лёсу, што мне даводзіцца вучыцца ў Школе палітычных дасьледаваньняў пры Радзе Эўропы. Спадзяюся яе скончыць. Трэба шмат чытаць і ведаць, каб ісьці ў палітыку. Я б запытаўся ў Віктара Ганчара, як ісьці ў палітыку. Запытаўся б у дэпутата Станкевіча, як потым не прадаць краіну [дэпутат у Вярхоўны Савет 12-га скліканьня ад Мядзельскай акругі, родам з Крывічоў]. Што трэба перш піярыць: законы і ўказы, ці ўсё ж краіну і людзей?

**«НН»: Можа і прэзыдэнцкія амбіцыі маеце?**

**АТ**: Раскажу адну гісторыю з жыцьця. Мы былі з жонкай у Жыровіцкім манастыры. Тады яшчэ жыў айцец Мітрафан, гэта сьвятар, які прадказваў людзям іхныя лёсы, да яго шмат зьвярталіся па дапамогу. Мая жонка Натальля запыталася ў айца Мітрафана «а што мне з мужам рабіць?» Сьвятар сказаў, што нічога ня трэба: «Ён ведае, што робіць». Я ведаю, што мне ніхто ня зможа перашкодзіць. Я не хачу быць прэзыдэнтам, я хачу, каб людзям проста добра жылося. Прэзыдэнцкія амбіцыі? Пабачым, я нічога не хачу загадваць наперад.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Рэйтынгі Лукашэнкі і Мілінкевіча падаюць

Зарэгістраваны ў Вільні Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных досьледаў (НІСЭПД) апублікаваў дадзеныя апытаньня жыхароў Беларусі. Незалежныя сацыёлягі адзначаюць падзеньне рэйтынгу Аляксандра Лукашэнкі. На пытаньне «Калі б заўтра адбыліся выбары прэзыдэнта Беларусі, за каго б Вы прагаласавалі?», адказ «за А. Лукашэнку» далі 39,9% апытаных.

Зьнізіўся і рэйтынг асноўнага канкурэнта А. Лукашэнкі ў масавай сьвядомасьці. А. Мілінкевіч атрымаў бы сёньня 9,8%.

Проці аналягічнага апытаньня, праведзенага ў траўні 2007 году, рэйтынг дзейнага прэзыдэнта зьнізіўся на 10 %, а ягонага апанэнта — на 4 %.

**Буг**

## Мілінкевіч сфармуляваў умовы-мінімум удзелу ў выбарах

5 студзеня ў Горадні прайшла сустрэча Аляксандра Мілінкевіча з дэмакратычнымі актывістамі рэгіёну. Адбылося абмеркаваньне стратэгіі ўдзелу ў палітычнай кампаніі 2008 году на Гарадзеншчыне.

Меркаваньні падзяліліся. Моладзь выступіла за ўдзел у выбарчай кампаніі. На думку моладзі, падобныя палітычныя кампаніі даюць дадатковыя магчымасьці камунікацыі з насельніцтвам.

Са свайго боку, актывісты з досьведам выказаліся за няўдзел у так званых «выбарах», бо выбарчыя камісіі цалкам фармуюцца зь людзей, якія задавальняюць уладную вэртыкаль.

На думку Аляксандра Мілінкевіча, удзел у парлямэнцкіх выбарах можа быць толькі пры пэўных умовах:

— Калі будзе забясьпечанае прадстаўніцтва дэмакратычных сілаў у выбарчых камісіях, а таксама калі будзе гарантаваны роўны доступ усіх кандыдатаў да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. У адваротным выпадку, ня варта выключаць, што адбудзецца масавае зьняцьцё дэмакратычных кандыдатаў з выбараў.

**Буг; інф. з сайту А.Мілінкевіча**

## Грузія за Саакашвілі і за НАТО


PHOTO.BYMEDIA.NET

Міхаіл Саакашвілі прайграў у Тбілісі, але ў краіне ў цэлым набраў каля 52 % галасоў. У кандыдата ад аб’яднанай апазыцыі Левана Гачэчыладзэ — каля 27 % галасоў.

Паводле ўсіх зьвестак, абсалютная большасьць выбарцаў прагаласавала за ўступленьне Грузіі ў НАТО на паралельна праведзеным рэфэрэндуме.

Спачатку вынік Саакашвілі балянсаваў на мяжы 50%. Гэта прымусіла апазыцыю паспадзявацца на другі тур. Аднак з паступленьнем зьвестак з рэгіёнаў, вынік Саакашвілі зноў пачаў расьці.

Вінны магнат Леван Гачэчыладзэ перамог у сталіцы (39 % галасоў супраць 31 % у Саакашвілі), але зь вялікім адрывам саступіў у рэгіёнах.

Гачэчыладзэ яшчэ больш нэгатыўна настроены ў дачыненьні да Расеі, чым Саакашвілі, і выступаў за выхад Грузіі з СНД. Дарэчы, 6 з 7 кандыдатаў падтрымлівалі празаходні выбар Грузіі. Толькі адзін, лідэр лейбарыстаў, выступае за пераарыентацыю краіны на Маскву.

Вынікі выбараў, абвешчаныя ЦВК, супадаюць з вынікамі апытаньня на выхадах з участкаў і альтэрнатыўнага падліку галасоў, арганізаванага няўрадавымі арганізацыямі.

Паводле ўсіх зьвестак, абсалютная большасьць, каля дзьвюх трацінаў выбарцаў, прагаласавалі за ўступленьне Грузіі ў НАТО на паралельна праведзеным рэфэрэндуме.

**Буг**

## На псыхбальніцы

перадасьць адсуджаныя ў «Новага часу» грошы **Мікалай Чаргінец.**

Пра гэта ён заявіў на прэс-канфэрэнцыі 3 студзеня. Па словах сэнатара, ідэю яму падказалі публікацыі «Народнай волі».

Нагадаем, што 20 сьнежня суд задаволіў пазоў Мікалая Чаргінца да газэты «Новы час» і журналіста Аляксандра Тамковіча аб абароне гонару і годнасьці.

Паводле рашэння Першамайскага суду Менску прыватнае прадпрыемства «Час навінаў» мусіць выплаціць дэпутату Савету Рэспублікі 50 млн рублёў, журналіст Аляксандр Тамковіч — 1 млн рублёў.

Адначасова Чаргінец даў адказы на актуальныя палітычныя пытаньні. Вось што ён паведаміў пра «Канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы Беларусі і Расеі»:

«Папраўдзе кажучы, Канстытуцыйныя акты — гэта мой нейкі душэўны боль. Я ўдзельнік усіх рабочых груп па падрыхтоўцы Канстытуцыйных актаў. Спачатку ён ствараўся ў рамках парлямэнтаў Беларусі і Расеі, пасьля ў рамках кожнай з краін, затым — стварылі нейкі сымбіёз з папярэдніх груп, а ўжо затым два прэзыдэнты стварылі рабочую групу. Мы працавалі вельмі прадуктыўна, бо мелі добрыя напрацоўкі. Я лічу, што мы падрыхтавалі вельмі добры Канстытуцыйны акт. Там засталося некалькі нявысьветленых момантаў, якія будуць рашаць самі кіраўнікі дзяржаваў. Гэта пытаньне, каму кіраваць саюзнай дзяржавай: прэзыдэнту зь віцэ-прэзыдэнтам, ці пакінуць вышэйшы савет, як цяпер, ці прыдумаць яшчэ нешта. І другое пытаньне: адзіны эмісійны цэнтар. Я лічу, што гэтыя пытаньні не такія ўжо складаныя. Цяпер да выбараў прэзыдэнта ў Расеі, пытаньне акту вырашацца, ясная справа, ня будзе. Сёлета мы, магчыма, дайшлі ўжо да той кропкі пасьля якой дарогі назад няма. На гэта трэба спадзявацца».

**Зьміцер Панкавец**

# Чаму кватэры не таньнеюць

Другасны рынак жыльля ў Менску.

Сёлета экспэрты прагназавалі зьніжэньне цэнаў на жыльлё ў Менску, асабліва на другасным рынку. Аднак паводле вынікаў дасьледаваньня на падставе дадзеных прадстаўніцтва ўкраінскай інвэстыцыйнай кампаніі Kings Capital, пакуль другасны рынак паказвае станоўчую дынаміку. Гэта сьведчыць пра тое, што ва ўмовах нізкіх магчымасьцяў вядзеньня легальнага бізнэсу ў Беларусі нерухомасьць застаецца найбольш ліквідным фінансавым інструмэнтам і сродкам хэджаваньня фінансавых рызык.

Паводле вынікаў 2007 году, сярэдняя вартасьць квадратнага мэтра нерухомасьці ў шматкватэрным жыльлі на другасным рынку складае цяпер 2017 даляраў, што вышэй за паказьнік сьнежня мінулага году на 14,47 адсоткаў. Безумоўна, у параўнаньні з тым ростам цэн, які адбываўся ў 2006 годзе, у наяўнасьці значнае зьніжэньне тэмпаў прыросту, аднак гэткія лічбы зусім ня сьведчаць пра тое, што рынак можа абрынуцца — гэта нармалёвы, стандартны паказьнік для большасьці эўрапейскіх краін. Хутчэй, гэта сьведчыць пра тое, што другасны рынак менскай нерухомасьці ўваходзіць у цывілізаваную фазу, калі рыэлтары ўжо не намагаюцца штучным чынам «накруціць» цану кватэры.

Насамрэч, сапраўдны адсотак так званых «інвэстыцыйных закупаў» жыльля ў Менску невядомы нікому, можна толькі здагадвацца пра іх аб’ёмы. З гледзішча здаровага сэнсу, якраз паслугаў гэтага кшталту меней ня стала: крэдыты на жыльлё сталі больш даступнымі, тады як даходы насельніцтва і агульная эканамічная сытуацыя не паказваюць асабліва пазытыўнай дынамікі (прынамсі, у параўнаньні з цэнамі на жыльлё). Калі б на рынку не было спэкулянтаў, дык тады б сапраўды мела месца стагнацыя: наадварот, шматлікія менчукі прадаюць кватэры, каб на гэтыя грошы пабудаваць катэдж у перадмесьцях. Колькі б менскія ўлады ні палохалі спэкулянтаў нейкімі санкцыямі, менавіта яны будуць замаўляць музыку на гэтым рынку, напрыклад, у цэнавай структуры па раёнах.

Пра тое, што другаснае жыльлё працягвае выконваць біржавую функцыю, сьведчыць захаваньне лідэрскіх пазыцыяў, мякка скажам, ня вельмі прыдатнымі для жыцьця адзінкамі нерухомасьці — пакоямі ў камуналках. Квадратны мэтар у камунальнай кватэры каштуе, у сярэднім, 2500 даляраў — гэта найдаражэйшы сэгмэнт жылой нерухомасьці ў Менску. У суседніх сталіцах — Кіеве, Маскве, Варшаве, Вільні — пакоі ў камуналках даўно ўжо зьяўляюцца неліквідам. Нават у Сімфэропалі, сталіцы Аўтаномнай Рэспублікі Крым, дзе я працаваў зь нерухомасьцю дастаткова доўга, цяпер камунальнае жыльлё папулярнае нават меней за стары жылы фонд у гарадзкіх трушчобах — Старым Горадзе. У Кіеве і Маскве прадаць жылплошчу ў камуналцы вельмі цяжка. Выкарыстаньне рыэлтарамі гэтых пакояў пры альтэрнатыўных угодах (разьездах і г. д.) звычайна не выклікае такой дыспрапорцыі цэнаў:

**Табліца 1: сярэдняя вартасьць жылплошчы ў кватэрах з рознай колькасьцю пакояў ($/кв.м.)**

| Раён | Пакоі ў камунальных кватэрах | 1-пакаёвыя кватэры | 2-пакаёвыя кватэры | 3-пакаёвыя кватэры | Шматпакаёвыя кватэры |
|---|---|---|---|---|---|
| Завадзкі | 2167 | 1853 | 1740 | 1694 | 1488 |
| Ленінскі | 2397 | 2024 | 1930,5 | 1864 | 2017 |
| Маскоўскі | 2357 | 2061,5 | 1982,5 | 1890 | 1879 |
| Кастрычніцкі | 2564 | 2028,5 | 1840 | 1908 | 2200 |
| Партызанскі | 2085 | 1978,5 | 1785 | 2179,5 | 2136,5 |
| Першамайскі | 2694 | 2153 | 2000 | 2258 | 1975 |
| Савецкі | 2525 | 2202 | 2120 | 2177 | 2250 |
| Фрунзэнскі | 2500 | 2059 | 1931 | 1898 | 1820,5 |
| Цэнтральны | 3333 | 2167 | 2142 | 2279,5 | 2456 |
| Сярэдняе па горадзе | 2500 | 2059 | 1931 | 1908 | 2017 |




**Дыяграма прапановы другаснага рынку нерухомасьці па раёнах Менску.**

Зь іншага боку, мы бачым, што вартасьць кв.м. у шматпакаёўках дастаткова высокая, нават вышэйшая за паказьнікі ў сэгмэнце двухпакаёвых кватэр. Відавочна, значны адсотак у агульнай масе гэтых кватэр складаюць тыя кватэры, якія былі купленыя альбо на стадыі будаўніцтва, альбо пабудаваныя праз долевыя схемы — на першасным рынку апошнім часам значна павялічыўся адсотак кватэраў вялікай плошчы.

Структура прапановы другаснага рынку па раёнах цалкам пацьвярджае гіпотэзу пра «спэкулятэўны рухавік» працэсаў: як і на першасным рынку, дамінуюць прапановы па Фрун-

зэнскім раёне, які, як вядома, займае ў гэтым годзе першае месца па колькасьці здадзенага дзяржкамісіі жыльля.

Найбольшая колькасьць прапановаў кватэр на другасным рынку нерухомасьці (22 %) прыпадае на Фрунзэнскі раён, найменшая — на Партызанскі, таксама прапанова абмежаваная ў Цэнтральным і Кастрычніцкім раёнах. У структуры прапановы дамінуюць двухпакаёвыя кватэры (25 %). Менш за ўсё прапановаў пакояў у камунальных кватэрах (5 %). Раней, да буму нерухомасьці, у структуры прапановы двухпакаёвыя кватэры былі дэфіцытам, яны ж былі і найдаражэйшымі, паколькі набываліся для пражываньня, а не для перапродажу.

Цэнавая структура па мікраараёнах досыць складаная. Хаця звычайна рыэлтары выкарыстоўваюць афіцыйны падзел на раёны, больш слушна выглядае разьмеркаваньне мікраараёнаў паводле аддаленасьці ад цэнтру і кірунку адносна яго. Прынамсі, такая сыстэма выкарыстоўваецца аналітыкамі буйных заходніх кампаніяў (Colliers, Knight Frank, Jones Lang LaSalle і іншых). Таму выходзіць наступная структура:




**Дыяграма прапановы другаснага рынку нерухомасьці ў Менску па якасьці жыльля.**

| Раён | Мікрараён | Вартасьць кв.м. па мікрараёнах | Вартасьць кв.м. па раёнах |
|---|---|---|---|
| **Цэнтар — I (гістарычная частка)** | Парк Горкага — Чырвонаармейская | 3331 | **2968** |
| | Траецкае прадмесьце — Старажоўка | 3143 | |
| | Р-н адм. Прэзыдэнта | 3107 | |
| | Гарадзкі Вал — Няміга — Пл. Свабоды | 3103 | |
| | Опэрны тэатар | 2968 | |
| | Вакзал — ст. «Дынама» — Студгарадок — Ліцэй БДУ | 2842 | |
| | Плошча Перамогі | 2791 | |
| | Плошча Незалежнасьці — Плошча Мясьнікова | 2663 | |
| | Раманаўская Слабада | 2439,5 | |
| **Цэнтар- II (у межах Другога кальца)** | пр. Пераможцаў — Камсамольскае возера | 2862,5 | **2136,75** |
| | Акадэмія навук | 2500 | |
| | Заслаўская | 2424 | |
| | Камароўка | 2380 | |
| | Залатая Горка | 2306,5 | |
| | Аэрадромная | 2217 | |
| | Чэрвеньскі рынак | 2191 | |
| | пл. Бангалор — унівэрсам «Рыга» | 2187 | |
| | Пуліхава | 2139,5 | |
| | Чкалаўскі | 2134 | |
| | к/т «Кіеў» | 2094,5 | |
| | к/т «Ракета» — пр. Менск-Усходні | 2075 | |
| | Грушаўка | 2032 | |
| | Карла Лібкнэхта — Розы Люксэмбург | 1984 | |
| | Харкаўская | 1908 | |
| | Кальварыя | 1875 | |
| | Даўгабродзкая — Уральская | 1867,5 | |
| | Трактарны завод | 1827 | |
| **Субцэнтральныя раёны** | Парк Чалюскінцаў | 2635 | **2056,5** |
| | Парнікова-цяплічны камбінат — БТРК | 2364 | |
| | Трыкатажная фабрыка | 2208 | |
| | Прылуцкая | 2092 | |
| | Арлоўская — Карастаянавай | 2021 | |
| | Валгаградзкая — Калініна | 1968 | |
| | М. Партызанская — унівэрмаг «Беларусь» | 1874,5 | |
| | Эканамічны ўнівэрсытэт | 1873 | |

| Раён | Мікрараён | Вартасьць кв.м. па мікрараёнах | Вартасьць кв.м. па раёнах |
|---|---|---|---|
| Заходнія спальныя раёны | Захад | 2111 | 2005 |
| | Кунцаўшчына | 2081 | |
| | Чырвоны Бор | 2016,5 | |
| | Сухарава | 1993,5 | |
| | р-н ст. м. «Пушкінская» | 1941 | |
| | р-н ст. м. «Спартыўная» | 1912 | |
| Усходнія спальныя раёны | Сьцяпянка | 2021 | 2001 |
| | Сьляпянка — Дражня | 1981 | |
| Паўднёвыя спальныя раёны | Менск-Паўднёвы — Маякоўскага | 1990,5 | 1925 |
| | Серабранка | 1970 | |
| | Лошыца | 1925 | |
| | Сярова | 1855 | |
| | Курасоўшчына | 1817 | |
| Паўночныя спальныя раёны | Сельгаспасёлак — Усходняя | 2167 | 2134 |
| | Шчадрына — Навінкі — Цнянка | 2134 | |
| | Зялёны Луг | 2043,5 | |
| Паўднёва-заходнія спальныя раёны | Паўднёвы Захад | 1983 | 1979,5 |
| | Малінаўка | 1976 | |
| Паўночна-заходнія спальныя раёны | Вясьнянка | 2193 | 2056,75 |
| | Масюкоўшчына, Пятра Глебкі | 1920,5 | |
| Паўночна-ўсходнія спальныя раёны | М. «Маскоўская» — Севастопальскі парк | 2661 | 2197 |
| | Уручча | 2212 | |
| | Усход | 2182 | |
| | Усходні | 2097 | |
| Паўднёва-ўсходнія спальныя раёны | Заходні пасёлак | 1956 | 1788 |
| | Сосны | 1800 | |
| | р-н м. Аўтазаводзкая — МАЗа | 1800 | |
| | Паўночны пасёлак | 1788 | |
| | Чыжоўка | 1770 | |
| | Ангарская | 1762 | |
| | Шабаны | 1735 | |

Як мы бачым, найдаражэйшыя кватэры ў раёне парку Горкага. Відавочна, што ў сэгмэнце элітных, найдаражэйшых кватэр — жыльля ў «сталінках» альбо ў новых дамах клясы дэ люкс альбо бізнэс, адыгрывае ролю наяўнасьць побач прыгожых краявідаў, асабліва водных аб’ектаў. Спэкулятыўны момант тут прысутнічае ў меншай ступені. Таму лідэрамі застаюцца парк Горкага, Траецкае перадмесьце і Старажоўка. Найбольшы рост цэнаў назіраецца ва ўсходніх спальных раёнах, найменшы — у паўднёва-заходніх. Пры гэтым, раёны Зялёны Луг, р-н вуліцы Ўсходняя абышлі паводле гэтых паказьнікаў шэраг цэнтральных раёнаў.

**Раман Мамчыц, куратар рэгіянальнага разьвіцьця Kings Capital у Беларусі**

**Табліца: рост цэнаў за 2007 год (%):**

| | |
|---|---|
| Цэнтар- I (гістарычная частка) | 40,4638 |
| Цэнтар- II (у межах Другога кальца) | 16,57119 |
| Субцэнтральныя раёны | 22,59314 |
| Заходнія спальныя раёны | 14,24501 |
| Усходнія спальныя раёны | 50,11253 |
| Паўднёвыя спальныя раёны | 20,84118 |
| Паўночныя спальныя раёны | 22,08238 |
| Паўднёва-заходнія спальныя раёны | 16,13376 |
| Паўночна-заходнія спальныя раёны | 7,767881 |
| Паўночна-ўсходнія спальныя раёны | 13,30583 |
| Паўднёва-ўсходнія спальныя раёны | 16,25488 |

## СЬЦІСЛА

### Імпарт аўтамабіляў вырас на 20 %, мабільнікаў — на 50 %

Колькасць увезеных у Беларусь легкавых аўтамабіляў у студзені—лістападзе 2007 году склала 166,2 тыс. коштам $985,7 млн. Гэта амаль у 1,2 разы больш проці таго ж пэрыяду 2006 году. Большасць аўтамабіляў была ўвезена зь Нямеччыны, Францыі, Расеі і Японіі.
За той жа час было ўвезена амаль у 1,5 разы больш сотавых тэлефонаў проці 2006 году. Найбольшая колькасьць мабілаў была ўвезеная з Вэнгрыі — 129,9 тыс. штук, Карэі — 103,5 тыс. штук і Кітаю — 96,8 тыс. штук.

### Беларусь захоўвае імпарт сельгастэхнікі

Урад рыхтуе адпаведны праект дакумэнту, што грунтуецца на прапановах аблвыканкамаў. Пры канцы мінулага году А. Лукашэнка заявіў пра забарону імпарту сельгастэхнікі цягам 2008 году. А. Лукашэнка падкрэсьліў тады, што выключэньні будуць магчымыя толькі зь ягонай асабістай згоды. Заява Лукашэнкі па часе супала з адмовай нямецкага канцэрну Claas беларускаму «Гомсельмашу» ў арганізацыі сумеснай вытворчасьці зернеўборачных камбайнаў на базе камбайна Lexion.

### Ад Новага году ў Гомелі не працуюць 90 % маршрутак

Гэта зьвязана зь пераафармленьнем уладальнікаў таксі —

# Золатавалютныя запасы дасягнулі амаль 5 мільярдаў

За год яны вырасьлі прыкладна на 3,2 мільярда, збольшага за кошт росту замежнай запазычанасьці, што вырасла за год на 5 млрд даляраў.

На пачатак сьнежня 2007 г. міжнародныя рэзэрвовыя активы Беларусі ў нацыянальным вызначэньні складалі $3402,8 млн, павялічыўшыся за студзень—лістапад на $1679,5 млн. Да канца сьнежня золатавалютныя рэзэрвы дасягнулі амаль $5 млрд, бо краіна атрымала 1,5 мільярда даляраў крэдыту ад Расеі.

Гэты прырост быў пераважна забясьпечаны за кошт замежных пазыкаў, якія за 2007 год вырасьлі прыкладна на 5 мільярдаў даляраў, з 6,7 млрд на пачатак году да больш чым 11,5 млрд пры канцы.

Калі ад сумы набраных крэдытаў (5 млрд) плюс сумы, атрыманай ад продажу 12,5 % акцый «Белтрансгазу» (0,625 млрд) і кантрольнага пакету «Вэлкаму» (апошняя лічба трымаецца ў таямніцы: магчыма, гэта каля 0,7 млрд), адняць лічбу прыросту золатавалютнага запасу (3,2 млрд), можна ацаніць страты Беларусі ад павышэньня цэнаў і зьмены ўмоваў паставак расейскіх энэрганосьбітаў — прыкладна 3 мільярды даляраў.

Да 2010 году краіна мае намер нарасьціць міжнародныя рэзэрвовыя активы да $10 млрд. Гэта неабходна, каб дасягнуць стандартаў Міжнароднага валютнага фонду па наяўнасьці рэзэрваў у памеры 3-месячнага імпарту, што мае забясьпечыць Беларусь ад паўтору расейскага энэргетычнага шантажу.

Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2008 год прадугледжана, што міжнародныя рэзэрвовыя активы краіны павялічацца ня менш як на $280 млн, галоўным чынам за кошт наплыву замежнага капіталу па фінансавым рахунку. У той жа час пры прыцягненьні ў эканоміку $2,5 млрд непасрэдных замежных інвэстыцый прырост золатавалютных рэзэрваў дзяржавы прагназуецца ў памеры амаль $2,2 млрд.

**Буг; інф. БЕЛТА**

# Heineken набывае «Сябра»

Галяндзкая кампанія Heineken набывае бабруйскі бровар «Сябар». Набыцьцё адбудзецца праз паглынаньне яе матчынай структуры, зарэгістраванай на Кіпры ды ўтворанай пры ўдзеле амэрыканскай інвэст-групы Detroit Investment Ltd. і Міжнароднай фінансавай карпарацыі (IFC). У прэс-рэлізе не паведамляецца пра суму ўгоды. Вядома, што фінансаваньне яе распачнецца ў гэтым годзе і завершыцца ў 2012 г.

Рэгіянальны дырэктар Heineken па Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе Ніка Нусмэйер адзначыў, што «гэтая ўгода адпавядае нашай стратэгіі займаньня лідэрскіх пазыцыяў на рынку». «Беларусь — гэта дынамічны рынак і гэта дазволіць стварыць цудоўную плятформу для разьвіцьця нашых брэндаў на такім жа ўзроўні, як і ў Расеі», — паведаміў Ніка Нусмэйер.

Расейскія СМІ называюць цану ўгоды. Паводле іх, бабруйскі бровар ацэнены на 100 даляраў за гекталітар, гэта значыць — на 60 мільёнаў даляраў (толькі ў мадэрнізацыю бровару «Сябар» ціперашнія акцыянэры ад 2004 г. уклалі каля 35 мільёнаў даляраў). Гэта менш, чым Heineken заплаціў за пакупку ПИТа (160 даляраў за гекталітар), але болей, чым аддаў SUN InBev за «Тинькофф» ($83,75 за гекталітар).

Аналітык Deutsche Bank Аляксей Крывашапка лічыць ацэнку «Сябра» завышанай, аднак, зважаючы на палітычныя рызыкі, зь якімі можа сутыкнуцца замежны бізнэс у Беларусі, называе цану ўгоды апраўданай. У прыклад ставіцца сытуацыя вакол няўдалай спробы расейскай «Балтыкі» прыватызаваць беларускі бровар «Крыніца».

Галяндзкая кампанія Heineken N.V. упэўнена прасоўваецца на піўным рынку ня толькі Цэнтральнай, але і Ўсходняй Эўропы. Нядаўна яна набыла сэрбскую піваварную кампанію Rodic Brewery.

Па выніках мінулага году ў Бабруйску зварылі 5,08 млн дал піва, што на 50 % больш, чым пазалетась. Гэта стала магчымым дзякуючы чарговай рэканструкцыі вытворчасьці. Доля бровару на беларускім рынку складае каля 15 %, што дазволіла яму апынуцца на другім месцы пасьля «Крыніцы». Кіраўніцтва піваварні не хавае сваіх намераў стаць № 1 у Беларусі.

СЗАТ «Броварная кампанія «Сябар» утворанае ў 2004 г. Заснавальнікамі зьяўляюцца кампанія Detroit-Belarus Brewing Company LLC (DBBC), утвораная пры ўдзеле амэрыканскай інвэстыцыйнай групы Detroit Investment Ltd. і Міжнароднай фінансавай карпарацыі, і ААТ «Дзеднава» (г. Бабруйск).

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

індывідуальных прадпрымальнікаў у юрыдычныя асобы.

### КДК загадвае рыэлтарам выйсьці зь ценю

Паводле папярэдніх разьлікаў Камітэту дзяржкантролю, рыэлтарскія арганізацыі штогод хаваюць ад бюджэту ня менш за $10 млн. Паводле праверкі КДК распачатыя 6 крымінальных справаў, ануляваныя 5 ліцэнзіяў, 8 рыэлтарскіх арганізацыяў атрымалі загад выправіць парушэньні.

### БВФБ у 2007 годзе прадала 6 млрд даляраў і 1 млрд эўра

Аб’ём біржавых угодаў з замежнымі валютамі ў мінулым годзе вырас у параўнаньні з 2006 г. на 6,6 %. Цягам мінулага году на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы (БВФБ) было прададзена 6 млрд 168 млн даляраў, 1 млрд 22 млн эўра, 75 млрд 636 млн расейскіх рублёў ды іншых валютаў на суму 223 млрд 496,671 млн беларускіх рублёў. Дзясятка вядучых апэратараў па аб’ёмах падпісаных угодаў з замежнай валютай на БВФБ у 2007 г. выглядае наступным чынам: Нацбанк, ААТ «Прыёрбанк», ААТ «АСБ Беларусбанк», ААТ «БПБ-Банк», ЗАТ «Банк ВТБ (Беларусь)», ААТ «Белінвэстбанк», ААТ «Банк Масква—Мінск», ЗАТ «Межторгбанк», ААТ «Белзьнешэканомбанк» і ЗАТ «Белаграпрамбанк».

**СП; БЕЛТА**

# Так выбіраюць амэрыканцы

У ЗША стартавала найбольш інтрыгоўная прэзыдэнцкая кампанія апошніх дзесяцігодзьдзяў. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Прадказаць яе вынік немагчыма. Абама можа зрабіцца першым у амэрыканскай гісторыі прэзыдэнтам-мулатам, Хакабі — першым прэзыдэнтам-пастарам, Ромні — першым прэзыдэнтам-мармонам, Маккейн, якому 71 год, — найстарэйшым прэзыдэнтам, а Клінтан — першай прэзыдэнткай.

Неяк наведаўся да дзядоў у вёску. Палесьсе, Чарнобыльская зона, праблемаў хапае. Зайшла ў госьці знаёмая цётка, пагаманіць. Прысела тэлевізар паглядзець, а там — навіны. Ужо праз якую хвіліну ажно ўсхадзілася ўся: «А што ён, Буш енты, усё лезе ды лезе? Што яму трэба?» Вось жа, не пра цану на торфабрыкет, не пра тое, што каня няма ў каго ўзяць, ці што пэнсія малая — а пра Джорджа Буша пачалася размова. Сьвярбіць нам тая Амэрыка зь яе прэзыдэнтамі, як той мазоль.

А можа, і ня варта сьмяяцца з той цёткі? Усё-ткі, глябалізацыя на двары, і нават цана на торфабрыкет, хоць і ўскосна, але залежыць ад таго, колькі тэрактаў адбываецца ў акупаваным амэрыканцамі Іраку, прымушаючы вагацца кошт нафтавага барэля, а зь ім і іншых энэрганосьбітаў. Можа і сапраўды, каб ня лез «Буш енты», куды ня трэба, то і не расьлі б цэны на чорнае золата? Так ці іначай, а за падзеямі на іншым баку зямной паўкулі сачыць варта, тым больш, калі там распачынаецца перадвыбарчы маратон.

Па традыцыі, першыя перадвыбарчыя зборы партыйных актывістаў адбыліся ў мінулы чацьвер у Аёве. Партыйцы вызначаліся з кандыдатам,

> Упершыню ў гісторыі прэзыдэнтам можа стаць мулат (Абама), пастар (Хакабі), мармон (Ромні) або найстарэйшы прэтэндэнт на пост прэзыдэнта ў гісторыі ЗША (Маккейн, якому 71 год). Ці першая жанчына — Хілары Клінтан.

якога яны жадаюць выставіць на сёлетніх прэзыдэнцкіх выбарах. Вынікі аёўскіх перадвыбараў сапраўды сэнсацыйныя. Сэнатарка Хілары Клінтан, якую лічылі фаварыткай гонкі, апынулася ажно на трэцім месцы ў сьпісе кандыдатаў ад дэмакратаў, а на першым — чарнаскуры сэнатар Барак Абама, які апярэдзіў былую першую лэдзі на 9 %, набраўшы каля 38 % галасоў выбаршчыкаў.




**Сэнатар Маккейн найлепш абазнаны ў беларускім пытаньні.**

У Клінтан, якая год трымалася лідэрам нацыянальных апытаньняў, толькі 29 %, і ў яе штабе пануе паняверка. Яе абагнаў яшчэ й няўдачнік папярэдняй выбарчай кампаніі Джон Эдвардз. Праўда, Біл Клінтан нагадвае, што ён у свой час у Аёве заняў толькі чацьвертае месца.

У рэспубліканцаў нечакана перамог былы губэрнатар Арканзасу Майк Хакабі (34 %), пра якога яшчэ пару месяцаў таму за межамі ягонага роднага штату мала хто чуў. На другім месцы былы арганізатар Алімпійскіх гульняў Міт Ромні (25 %). Трэцяе і чацьвертае падзялілі сэнатары Джон Маккейн і Фрэд Томпсан (па 13 %). Іншы фаварыт, былы мэр Нью-Ёрку Рудзі Джуліяні, прыйшоў на фініш толькі шостым.

А вось на перадвыбарах у штаце Нью-Гемпшыр сітуацыя кардынальна зьмянілася. Клінтан дыхтоўна перастрэсла сваю каманду, набраўшы новых палітычных дарадцаў. Яны параілі ёй праяўляць больш эмоцыяў, а замест былых паплечнікаў мужа накшталт Мадлен Олбрайт выводзіць падчас сваіх выступаў на сцэну звычайную моладзь. У выніку Хілары здолела заваяваць галасы большасьці нью-гемпшырскіх дэмакратаў, набраўшы 39%. Аднак Барак Абама адстае ад яе толькі на 3% галасоў.

Нью-Гемпшырскія рэспубліканцы таксама падрыхтавалі сюрпрыз, аддаўшы большасьць сваіх галасоў за сэнатара Маккейна, ветэрана в'етнамскай вайны.

У мінулым той, што выйграваў



**За пастара Хакабі (на фота з бас-гітарай) у Аёве агітаваў актор-каратыст Чак Нарыс.**



**Жанчыны-дэмакраткі ў Аёве больш схільныя галасаваць за Абаму.**

праймэрыз у Нью-Гемпшыры, станавіўся прэзыдэнтам ЗША. Праўда, гэта заканамернасьць парушылася ў 1992 г. у выпадку Біла Клінтана і сёньняшняга прэзыдэнта Джорджа Буша ў 2000 г. Натуральна, вынікі передвыбараў у Аёве ды Нью-Гемпшыры не перадвызначаюць вынік кампаніі, але прымушаюць зрабіць сякія-такія высновы, а дзе-нідзе нават правесьці паралелі зь беларускай сытуацыяй. Апошнім часам усё часьцей і часьцей у сьвеце пакепліваюць з амэрыканскай


**Хілары Клінтан дарадцы параілі праяўляць больш эмоцыяў.**

сыстэмы. Маўляў, гэта такая дэмакратыя, дзе ўсё перадвырашана, дзе палітыкі перамагаюць адно дзякуючы сувязям ды ўплывовым дынастыям, дзе ўсёмагутныя лабісты торгаюць лідэраў за нітачкі, бы тыя лялькі, дзе ў выніку ўсё вырашаюць грошы, укладзеныя ў кампанію. Але першыя раўнды амэрыканскіх перавыбараў пацьвердзілі: у дэмакратычнай сыстэме — той самай, якая, паводле Чэрчыля, «найгоршая, калі не лічыць усіх астатніх» — ня ўсё вырашаюць грошы.

Лабісты, агрэсіўны палітычны маркетынг і іншыя заганы дэмакратычнай сыстэмы сапраўды існуюць у ЗША. Больш за тое, у часе прэзыдэнцтва Буша-малодшага яны, бадай, узмацніліся. І калі Буш гэтак турбуе цётку з Палесься, то лёгка зразумець, як ён абрыд амэрыканскім прыхільнікам дэмакратычнай партыі. Поўныя рашучасьці не дапусьціць рэспубліканцаў кіраваць краінай яшчэ чатыры гады, яны мабілізавалі ўсе свае сілы, і вынік не прымусіў сябе доўга чакаць. Гэтак, на передвыбары ў Аёве зьявіўся рэкордны лік дэмакратаў — больш за 239 тысячаў чалавек (у 2004 г. было толькі 125 тысячаў). Рэспубліканцы, дарэчы, змаглі сабраць толькі 108 тысячаў выбрцаў — але гэта таксама рэкрод. Калі ўлічыць, што ў Аёве, аддаленым сельскагаспадарчым штаце, жыве толькі 3 мільёны чалавек, гэта вельмі добрыя паказчыкі палітычнай актыўнасьці.

46-гадовы Барак Абама — малады палітык. Здавалася, як мулат ён ня меў вялікіх шанцаў перамагчы Хілары Клінтан у штаце, населеным пераважна беласкурымі амэрыканцамі. Ажно выявілася, што Хілары не заўжды дапамагае нават жаночая салідарнасьць: у Аёве нават жанчыны-дэмакраткі былі больш схільныя галасаваць не за яе, а за Абаму. У чым тут справа? Бадай, у тым, што і Абама, і Эдвардз абяцаюць радыкальна зьмяніць краіну. Яны здолелі абудзіць у людзях энтузіязм.

Хілары Клінтан рабіла акцэнт не на зьменах, а на сваім палітычным досьведзе, прыдатнасьці да прэзыдэнцкай пасады. Ажно, як выявілася, амэрыканцы жадаюць ня проста зьмены прэзыдэнта, але зьмены палітыкі краіны. Фэрмэры з Аёвы выявілі сваю грамадзянскую пазыцыю, дзе важная сутнасьць кандыдата, а ня пол ці колер скуры. А вось у Нью-Гемпшыры Клінтан ужо выступала пад слоганамі, якія таксама заклікалі да пераменаў — і перамагла.

Ёсьць яшчэ і іншы нюанс, які грае не на карысьць Хілары Клінтан. Яе перамога дала б падставы казаць, што Амэрыка ператвараецца ў свайго роду дынастыйную дэмакратыю: калі Хілары зробіцца прэзыдэнткай, то ад 1989 да як найменш 2012 году ўлада ў краіне будзе належаць па чарзе сем'ям Клінтанаў ды Бушаў. Але правал у Аёве ды цяжкая перамога ў Нью-Гемпшыры сьведчаць: мець тату ці мужа — сабраць рэкордныя 100 мільёнаў даляраў на передкампанію, як Клінтан, яшчэ ня значыць гарантавана перамагчы. Экс-губэрнатар штату Масачусэтс, рэспубліканец Міт Ромні інвэставаў у сваю кампанію ў Аёве 20 мільёнаў даляраў, а экс-губэрнатар Арканзасу Майк Хакабі — у 15 разоў меней, але ўсё роўна атрымаў першае



**Міт Ромні, які ўклаў у сваю кампанію 20 млн даляраў, спрабуе сябе ў ролі грылера перад аёўскімі выбарцамі.**

**Працяг на старонцы 12.**


**Зьлева направа: Барак Абама, Майк Хакабі, Міт Ромні, Джон Эдвардз у перапынку дэбатаў у Нью-Гэмпшыры.**

# Так выбіраюць амэрыканцы

Працяг са старонкі 11.

месца сярод рэспубліканцаў. У чым сакрэт Хакабі? У тым, што яго падтрымала актыўная сетка вернікаў-пратэстантаў — сам ён баптысцкі пастар. Але таксама ў асабістай сымпатычнасьці. Ён іграе на бас-гітары і мае выдатнае пачуцьце гумару. Арганізаваная і добра матываваная каманда падтрымкі можа зрабіць тое, чаго не дасягнуць мільёнамі даляраў.

У беларускіх пытаньнях найбольш абазнаны сэнатар Маккейн, і яго перамога ў Нью-Гемпшыры ня можа ня цешыць. Пра дэмакратаў гаварыць складана: Барак Абама ў галіне замежнай палітыкі — абсалютнае белае поле. Якой была б ягоная замежная палітыка, невядома.

Сыстэма передвыбараў у ЗША цікавая. У кожным штаце яна свая, прычым людзі трымаюцца за традыцыі. У Аёве выбары адбываюцца на сходах партыйных актывістаў, якія дужа нагадваюць шляхецкія соймікі.

Рэспубліканцы агітуюць за сваіх кандыдатаў лямантам, хто каго перакрычыць. Так «галасуюць» у першасным сэнсе гэтага слова хвілінаў 10, а часам і гадзіну. Пасьля таго галасуюць, укідваючы паперкі ў капялюш. Гэтак, у Аёве такіх соймікаў адбылося 1787 — столькі ў штаце адміністрацыйных адзінак.

А ў дэмакратаў людзі галасуюць, зьбіраючыся ў розных месцах залі, адзеленых лініямі. Пасьля пачынаюць агітаваць адзін другога, урэшце праз пэўны час параўноўваюць, колькі ў якой частцы народу засталося.

А вось у Нью-Гэмпшыры традыцыі іншыя – тут адбываецца звыклае прамое галасаваньне.

Наступнымі эстафэту перадвыбараў пераймаюць жыхары малога штату Нью-Гэмпшыр. Тут ужо адбываецца звыклае простае галасаваньне.

Кандыдаты ад абедзьвюх партыяў шчэпяцца між сабой, прайшоўшы праз чысьцец стамляльнага маратону. У кожным штаце перад галасаваньнем яны ладзяць сотні сустрэчаў з выбарцамі. Часам апошняя сканчаецца а 2.30, а 6.00 ужо адбываецца наступная ў суседнім мястэчку. Амэрыканскія СМІ поўняцца пералікамі праколаў і памылак, зробленых кандыдатамі, якія тыднямі сьпяць па тры—чатыры гадзіны ў суткі. Трэніроўка! Прэтэндэнты выступаюць у актавых залях школаў, у судах, у пажарных станцыях — дзе заўгодна, абы сабраліся людзі. Выбарцы слухаюць іх, задаюць пытаньні, спрачаюцца да хрыпаты. Які кантраст зь беларускімі выбарамі, калі ўлады імкнуцца абмежаваць кантакт кандыдатаў з народам да мінімуму.

Перадвыбарчая гонка ў ЗША працягваецца. 15 студзеня пройдуць праймэрыз у Мічыгане, 19 студзеня — рэспубліканскія ў Нэвадзе і Паўднёвай Караліне. 26 студзеня дэмакраты правядуць свае праймэрыз у Паўднёвай Караліне, 29 студзеня агульныя перадвыбары ў Фларыдзе.

5 лютага — супэраўторак. У гэты дзень праймэрыз пройдуць у 20 штатах уключаючы Нью-Ёрк, Нью-Джэрзі і Каліфорнію, там і вызначацца кандыдаты, што будуць змагацца за прэзыдэнцкую пасаду.

**КАМЭНТАР**

## За каго быць беларусам у амэрыканскіх перадвыбарах?

У чацьвер выбарцы амэрыканскага штабу Аёва даюць старт доўгаму маратону. Камэнтар.

У чацьвер выбарцы амэрыканскага штабу Аёва даюць старт доўгаму маратону амэрыканскіх перадвыбараў, у часе якіх партыйныя актывісты абіраюць кандыдата ад сваёй партыі на прэзыдэнцкія выбары, што адбудуцца пад канец наступнага году. Амэрыканская дэмакратыя такая, што з пэўнасьцю прадказаць, хто стане пераможцам, надзвычай цяжка. Сымпатыі мяняюцца, фармуюцца, гартуюцца ў часе незьлічоных публічных дэбатаў і сустрэчаў з выбарцамі.

Вялікая частка беларускай эміграцыі традыцыйна падтрымлівала рэспубліканцаў як правых і схільных да больш жорсткай палітыкі ў дачыненьні да Савецкага Саюзу.

Сёньня ранейшыя падзелы мяняюцца. Дэмакраты вабяць новую хвалю эміграцыі больш лібэральным стаўленьнем да чужынцаў і меншасьцяў.

Сярод рэспубліканцаў асабіста знаёмы зь беларускай сытуацыяй сэнатар Маккейн. Ён жа добра падрыхтаваны да вядзеньня справаў з Расеяй.

У дэмакратаў найлепш абазнаная ў міжнародных пытаньнях сэнатарка Клінтан.

А вось хто з кандыдатаў — Маккейн, Хакабі, Ромні, Джуліяні або Клінтан, Абама — прапанаваў найясьнейшае бачаньне будучыні Амэрыкі і сьвету, хто здолее заручыцца даверам, стане больш бачным, бадай, толькі пасьля супэраўторку.

Падставовым жа беларускім нацыянальным інтарэсам ёсьць на сёньня пытаньне цэнаў на нафту і іншыя энэрганосьбіты. Кіраваньне Буша выпала для Беларусі фатальным, бо цэны на нафту дасягнулі пры ім рэкордных памераў. Ёсьць іронія лёсу ў тым, што напярэдадні перадвыбараў у Аёве цана барэля нафты перакрочыла сымбалічную мяжу 100 даляраў. Можна спрачацца, ці залежыць гэта ад інтарэсаў Буша і ягонай каманды ў нафтавым бізнэсе Тэхасу, але амаль адназначна, што беларускім інтарэсам на сёньня найлепш адпавядаў бы той кандыдат, які здолеў бы зьнізіць цэны на нафту. Гэта быў бы найлепшы ўнёсак у беларускую дэмакратыю, гаспадарчае працьвітаньне, але і найбольшы ўдар па тыранічных рэжымах у сьвеце, большасьць якіх на сёньня грунтуецца на даходах ад нафты або субсыдыях ад багатых нафтаю патронаў.

Вось толькі хто здатны? Адгадаць няпроста.

**Барыс Тумар**

# Стэрэатыпы праз прызму «Паўлінкі-нью»

У ноч на 1 студзеня тэлеканал АНТ прадставіў разрэклямаваны праект — мюзыкал «Паўлінка-New», пастаўлены паводле п’есы Янкі Купалы. Мясцовая публіка чакала праект даўно — і пацірала рукі ад задавальненьня.

«Першая навагодняя пастаноўка!» — «Паводле Янкі Купалы!» — «На беларускай мове!» — «Нарэшце!» — «Моўная палітыка дзяржавы зьмянілася!»

Панове дарэмна радаваліся…

Нахабны прадусар-авантурнік пан Адальф Быкоўскі (рэзыдэнт «Comedy Club» Яўген Булка) прагне ажаніцца з Паўлінкай (салістка гурту «Топлес» Вольга Вайніловіч). Але сама Паўлінка, насуперак волі бацькоў (Іна Афанасьева і Сяргей Журавель), цягнецца да лазьніка Якіма (Георгі Калдун), чый брат (Дзьмітры Калдун) і выкрывае прайдзісьвета.

Экакурорт «Крынічка», турысткі ў кімано і камізэльках, тэлевядоўца Яўген Лашкоўскі пад абцасам малавядомай сьпявачкі Таццяны Лазоўскай (у ролі «садамазахісткі» Агаты Пустарэвіч). Грудастыя танцоркі, бліскучы цэляфан…

«Паўлінка-New» паходзіць ад навагодніх расейскіх «Галубых агалькоў». «Заходнія мары» ўвасабляюць турысты, якія мараць пра аграгарадкі (!) — і Дзьмітры Калдун, які сьпявае па-ангельску.

Паўлінка — і ейныя бацькі — мусяць размаўляць на чысьцюткай расейскай мове.

Дробныя беларускія фразачкі з «тудэма-сюдэма» дазволеныя «садзюшнай» Агаце і навасьпечанай сяброўцы Паўлінкі (удзельнік КВЗ Яўген Смарыгін).

Але — nihil novi — беларуская мова застаецца мовай з паніжаным рангам. Гэта мова песень, а таксама мова камічных пэрсанажаў — Адольфа Быкоўскага, у дзікунскім крыўляньні Булкі. Нагадаю, што ў Купалы Быкоўскі размаўляў з «шляхоцкім» польскім акцэнтам.



# «Ты зашыбісь, бульбаш!»

Можна было б парадавацца за новую «Паўлінку», каб не фінальнае «ты бульбаш і я бульбаш». Піша **Руслан Равяка**.

Можна было б парадавацца за АНТ, якое нарэшце паспрабавала зрабіць эксклюзіўную навагоднюю перадачу «Паўлінка new». На тле НТВ, якое хацела ў навагоднюю ноч завабіць гледачоў голымі цыцкамі, нашы выглядалі прыстойна.

Шмат беларускіх песень у новай «Паўлінцы», цікавыя вобразы артыстаў. Усё б добра, але сапсавалі настрой апошнія кадры праекту, фінальная песьня пра тое, што «ты бульбаш і я бульбаш».

Гэта, на мой погляд, зьяўляецца паказчыкам дзяржаўнай палітыкі па стварэньні беларускага грамадзтва, апірышчам якой застаўся СССР. Немагчыма ўявіць сабе Білана, які сьпявае: «І маскаль я, маскаль», ці Данілку, які б сьпяваў, што ён хахол.

На жаль, колькі год таму даводзілася ўжо пісаць пра гэта. Калі народныя і заслужаныя дзеячы культуры, чынавенства ў дзяржаўнай газэце шчыра і папростаму прызнаюцца, што яны бульбашы, то робіцца жахліва. Такое падобна да прызнаньня цёмнага селяніна на пачатку XX стагодзьдзя ў «тутэйшасьці». Нічога не зьмянілася ў лепшы бок. І адукацыя не прыносіць чалавеку нацыянальнай годнасьці.

Чынавенства ад культуры засталося з савецкімі поглядамі ў галовах. А маладое пакаленьне, што гадуецца на дзяржаўнай ідэалёгіі, таксама, відаць, не зусім разумее, дзе жыве і што такое нацыянальны гонар. Якая ў іх галовах мяшанка сечкі зь мякінаю — ужо выразна відаць.

Мусіць быць у кожнага беларуса хаця б нейкі малы гонар за сваю Бацькаўшчыну. Думаецца, тады б чалавек адмовіўся сьпяваць пра сваю бульбашнасьць. Пра сцэнарыстаў годзе й казаць. Ня мусяць крыўдаваць, калі назавем іх «ганаровымі бульбашамі краіны».

Ня раз даводзілася чуць ад старэйшага пакаленьня, якое служыла ў савецкім войску, што мы, бульбашы, самыя добрыя салдаты. Бо толькі нам расейскія браты і камандзіры маглі даверыць розныя справы і службу. Да хахлоў, лабусаў і чарнамазых нямашака даверу. «Ты зашыбісь, бульбаш!» — казалі ім у войску, паляпваючы па плячы. На маё пытаньне, ці спрабаваў адказаць таму: «А ты таксама зашыбісь, маскаль!» — я атрымліваў толькі зьдзіўленыя погляды, маўляў, як так можна казаць.

# Саакашвілі перамог, але без элегантнасьці

На выбарах у нядзелю ён набраў трохі болей за палову галасоў.

Аднак ня толькі праз арытмэтычны чыньнік гэтая перамога харызматычнага лідэра, адрозна ад ягонага трыюмфу чатыры гады таму, ужо ні ў якім разе ня будзе выглядаць элегантнай.

Імідж палымянага дэмакрата назаўжды сапсаваны восеньскім разгонам апазыцыі.

Хаця, што б ні закідалі дзейнаму прэзыдэнту, ступень празрыстасьці тамтэйшых выбараў непараўнальная з нашай: пачынаючы ад літаральных рэчаў — празрыстых скрыняў — і канчаючы відэаздымкай падліку галасоў. Паказальна, што місіі назіральнікаў, як ад СНД, так і ад АБСЭ, пры тым што ў Беларусі іхныя высновы нязьменна палярныя, там, у Грузіі, пакуль што кажуць толькі пра шэраг тэхнічных хібаў, але, здаецца, гатовыя прызнаць выбары ўвогуле справядлівымі.

А цяпер перакінем масток да нашых рэаліяў.

Многім змагарам за сьветлую нацыянальную будучыню мроіцца, што яна, гэтая будучыня, надыдзе нейкім



цудадзейным чынам, адразу. Што ў нейкі дзень Х ля стырна дзяржаўнае ўлады трывала стане маналітная каманда нацыянальна сьвядомых сілаў — і далей усё пойдзе бы маслам памазалі… І што народ будзе толькі пляскаць у ладкі ўсім новаўвядзеньням, сярод якіх, пэўна, ж будуць і даволі мулкія.

Пры тым, што ўсе паралелі кульгаюць, досьвед шэрагу каляровых рэвалюцыяў паказвае: калі не стае палітычнай культуры ні ў паспалітага люду, ні ў рэвалюцыйных правадыроў, з заганнага кола нацыі вырвацца надзвычай цяжка.

Так што зноў дазволю сабе прывесьці вельмі важную, на мой погляд, думку Юр’я Дракахруста: «Ад якасьці апазыцыі не залежыць, калі адбудзецца зьмена рэжыму. Ад гэтай якасьці залежаць формы, у якіх адбудзецца зьмена: чым ніжэйшая якасьць — тым большая імавернасьць крывавага пераходу. А самае галоўнае — ад якасьці апазыцыі залежыць тое, што будзе пасьля зьмены».

Вось пра гэта варта разважаць ужо сёньня.

Ну а што да Саакашвілі… У тэлесюжэтах ягоная белая кашуля ды блакітны гальштук выглядаюць элегантна, як заўсёды. Але час сапраўды элегантных перамогаў для яго мінуў назаўсёды.

Зрэшты, прэзыдэнты прыходзяць і сыходзяць. Важна, каб урэшце Грузія спраўдзілася як незалежная і дэмакратычная краіна. А на яе цісьнуць ведаеце як і ведаеце хто.

**P.S.** Дарэчы, Масква ўжо атрымала анучай па твары: на адначасным з выбарамі рэфэрэндуме большыня грузінаў выказалася за ўваходжаньне ў НАТО.

# На тле «інфляцыйнага спалоху»

На сайце Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (Вільня) зьявілася нізка новых матэрыялаў.

Яны грунтуюцца на выніках сьнежаньскага апытаньня. Сацыёлягі адзначаюць «інфляцыйны спалох» беларусаў. Калі ў чэрвені 2006-га рост цэнаў хваляваў 60,1 % жыхароў, то ў мінулым месяцы — ужо 84,2 %. Зьнікла славутае пачуцьцё «стабільнасьці». Прыходзіць асэнсаваньне хісткасьці «беларускай мадэлі»: яна зьведала вялікія праблемы, варта было Расеі толькі трохі прыкруціць кранік…

На гэтым тле падае давер да палітыкі ўлады. Калі ў верасьні летась 50,2 % беларусаў лічылі, што краіна разьвіваецца ў правільным кірунку, то ў сьнежні — толькі 41,2 %.

Ну і нарэшце што да пэрсаналіяў.

Зь верасьня па сьнежань 2007 году электаральны рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі зьменшыўся з 44,9 % да 39,9 % (для параўнаньня: у красавіку 2006-га, адразу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў, гэты паказчык складаў 60,3 %).

Зрэшты, нагадваюць сацыёлягі, рэйтынг афіцыйнага кіраўніка зьведваў і горшыя часы. «Пасьля другіх прэзыдэнцкіх выбараў на мяжы 2002—2003 гг. ён дасягнуў свайго абсалютнага мінімуму — 27 %. Аднак да чаканага многімі апазыцыйнымі палітыкамі росту пратэставай актыўнасьці гэта не прывяло. Аўтарытарны рэжым у Беларусі абапіраецца ў значнай ступені не на падтрымку насельніцтва, а на ягоную пасыўнасьць», — рэзюмуюць аўтары дасьледаваньня.

Не растуць, паводле сацыёлягаў, і рэйтынгі апазыцыйных палітыкаў. А вось незалежныя мэдыі ў сэнсе даверу — наперадзе дзяржаўных.

# Новы год у аточанай крэпасьці?

Уразіла антызаходняя, канфрантацыйная стылістыка навагодняй прамовы Аляксандра Лукашэнкі.

Гадзінай раней расейскія каналы круцілі сьпіч Пуціна. Пры тым, што цяпер у Масквы антызаходні трэнд, крамлёўскі лідэр выглядаў міралюбна і ні словам не абмовіўся пра нейкія пагрозы.

У нашым жа выпадку — рэмэйк савецкай стылістыкі 1920—30-х. Варожы імпэрыялізм і ўсё такое.

Адкуль жа гэты імпэт? З аднаго боку, напэўна, робіць сваё расейскі крэдытна-газавы допінг. Зь іншага, адчуваецца, што Амэрыка ўсё ж закранула за жывое сваімі санкцыямі. Зрэшты, атрымала сваё й Масква за «маштабны ўдар» у выглядзе росту цэнаў на энэрганосьбіты.

Карацей, з усіх бакоў ворагі.

Беларусам прапануюць адчуваць сябе, як у аточанай крэпасьці. Гэта, пэўна, адэкватна адлюстроўвае ўладныя фобіі. Але падаецца, што большыні беларусаў такая ваяўнічая рыторыка глыбока… мякка кажучы, чужая.

# Міністэрства юстыцыі настойвае на ліквідацыі ПКБ

Міністэрства падало пазоў у Вярхоўны суд аб ліквідацыі Партыі камуністаў.

У пазове адзначаецца, што нават пасьля пісьмовых папярэджаньняў, камуністы працягвалі парушаць заканадаўства.

2 жніўня Вярхоўны суд прыпыніў дзейнасьць ПКБ тэрмінам на шэсьць месяцаў, аднак, як мяркуе Міністэрства юстыцыі, партыя за гэты пэрыяд рабіла дзеяньні, якія ёй былі забароненыя заканадаўствам. У прыватнасьці, ПКБ ставіцца ў правіну ўваходжаньне ў аргкамітэт па правядзеньні «Эўрапейскага маршу», а таксама падпісаньне 30 жніўня ўгоды аб прынцыпах удзелу ў парлямэнцкіх выбарах. Яшчэ ПКБ закідваецца актыўная міжнародная дзейнасьць — удзел Сяргея Вазьняка ў кастрычніку ў канфэрэнцыі Партыі эўрапейскіх левых у Кішынёве, а Сяргея Калякіна — у зьезьдзе Партыі эўрапейскіх левых у Празе.

Ліквідацыя ПКБ разам з падаўжэньнем зьняволеньня Артура Фінькевіча і пагрозамі «вышпурнуць» пасла ЗША зь Беларусі можа быць праявамі новага павароту ў палітыцы пасьля атрыманьня гіганцкага крэдыту ад Масквы і абяцаньняў новых пазык.

**Зьміцер Панкавец**

# Мітрапаліт Філарэт згадаў пра Канстанціна Астроскага

Мітрапаліт Менскі і Слуцкі Філарэт у сваім сёлетнім калядным пасланьні згадаў праваслаўнага магната Вялікага Княства Літоўскага Канстанціна Астроскага. Не таго, які атрымаў знакамітую перамогу над маскоўцамі пад Воршай, а ягонага нашчадка, які задушыў казацкае паўстаньне Севярына Налівайкі. «Прыгадаем словы, якія прагучалі ў 1593 годзе з вуснаў дабравернага князя Канстанціна Канстанцінавіча Астроскага. «Мы не паветра і ня вецер сьцеражэм, — зьвяртаўся ён да сваіх адзінаверных суайчыньнікаў, — але ісьцінную веру, трымаючыся яе, захоўваем». Гэты верны сын Праваслаўнай Царквы і сапраўдны герой нашай Бацькаўшчыны ўмеў быць цьвёрдым у сваёй веры, у яе абароне і ўмацаваньні. У надыходзячым годзе нам належыць аддаць князю Канстанціну Астроскаму даніну вечнай і ўдзячнай памяці, бо ўжо чатыры стагодзьдзі мінула з дня ягонага спачыну. За гэты час гісторыя нашага народу шмат разоў пацьвярджала ісьціннасьць ягонага глыбокага перакананьня ў тым, што толькі праваслаўная вера бацькоў можа зьяўляцца асноваю для нашай свабоды ад ілжэвучэньняў, для нашай незалежнасьці ад стыхій сьвету гэтага і для нашага ўмацаваньня ў запаведзях Госпада Ісуса Хрыста», — адзначае Філарэт.

Характэрна, што сёлета калядная трансьляцыя сьвяточнай літургіі са Сьвята-Духавага катэдральнага сабору вялася на беларускай мове. Усе рэпартажы з рэгіёнаў былі таксама па-беларуску.

**ЗП**

# Кватэры ў сталіцы журналістам БТ

Група работнікаў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі напярэдадні Новага году атрымала цудоўны падарунак ад прэм’ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага. Ён падпісаў пастанову Саўміну аб выдзяленьні падначаленым Аляксандра Зімоўскага службовых кватэр, паведамляе інтэрнэт-газэта «Белорусский партизан».

Згодна з дакумэнтам, жытлом забясьпечылі ў асноўным супрацоўнікаў Агенцыі тэлевізійных навінаў. Так, кватэры ў новых дамах у прэстыжным сталічным квартале Ціміразева—Нарачанская—Радужная атрымалі рэдактары АТН Вольга Ермакова (ёй далі кватэру агульнай плошчай 45,20 кв.мэтраў на адну) і Юры Круглік (плошча кватэры 45,50 кв.мэтраў). Самую маленькую кватэрку плошчай 39,89 мэтраў на вуліцы Прытыцкага далі палітычнаму аглядальніку АТН Максіму Кароткіну. Як напісана ў пастанове Саўміну, службовае жытло групе тэлевізійшчыкаў выдзелена «на пэрыяд захаваньня працоўных адносінаў з НДТРК».

На сёньня ў Менску такая аднапакаёвая кватэра каштуе каля 2200 даляраў за кв. мэтар.

**буг**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Ордэны, званьні, падзякі**

Старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Аляксандар Зімоўскі ўзнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны — «за высокія дасягненьні ў прафэсійнай дзейнасьці, значны асабісты ўнёсак у падрыхтоўку і забесьпячэньне пасьпяховага ўдзелу беларускіх выканаўцаў у дзіцячых конкурсах песьні «Эўрабачаньне». Ганаровае званьне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь» прысвоенае намесьніку старшыні НДТРК Юр’ю Азаронку.

Ну а хлопчыку Аляксею Жыгалковічу аб’яўленая «падзяка прэзыдэнта».

# Лябедзька: Буду палітычным невыязным № 1


PHOTO.BYMEDIA.NET

Кіраўніку «Аб'яднанай грамадзянскай партыі» забаронены выезд за мяжу.

Апавяшчэньне пра гэта Анатоль Лябедзька атрымаў 1 студзеня. Падзабытая справа (паклёп на прэзыдэнта Беларусі) была адкрытая ў 2004 годзе. Яе наяўнасьць тры гады не замінала палітыку выяжджаць. Раней такія накаты на апазыцыю папярэднічалі вялікім палітычным кампаніям.

У апавяшчэньні з Аддзелу па грамадзянстве і міграцыі Цэнтральнага РУУС Менску палітыку паведамляецца, што рашэньне было прынятае на падставе таго, што ў дачыненьні да яго Менскай гарадской пракуратурай узбуджаная крымінальная справа паводле арт. 367 ч.2 КК (паклёп на прэзыдэнта).

Таксама А. Лябедзька атрымаў позву з пракуратуры, дзе гаворыцца, што пракуратура разглядае палітыка падазраваным, аднак мера спыненьня не абіралася, а абвінавачваньне не было прад'яўленае.

«Цяпер вытворчасьць папярэдняга сьледзтва паводле крымінальнай справы прыпыненая на падставе п.5 ч.1 арт.246 КПК РБ, у сувязі зь немагчымасьцю вытворчасьці сьледчых дзеяньняў. Падставай для прыняцьця рашэньня паслужыла невыкананьне праваахоўнымі органамі Расеі ўзбуджанага пракуратурай гораду Менску хадайніцтва аб аказаньні прававой дапамогі», — паведамляецца ў лісьце пракуратуры, які цытуе telegraf.by.

Анатоль Лябедзька заявіў, што яму забаранілі выяжджаць за мяжу з палітычных матываў: «Палітычныя ніткі тырчаць у кожным радку адказаў».

Тая падзабытая справа была адкрыта ў 2004 годзе (паклёп у дачыненьні да прэзыдэнта Беларусі) пасьля інтэрвію А. Лябедзькі праграме «Зеркало» (тэлеканал «Россия») і публікацыі ў газэце «Народная воля» аб ценявым бюджэце ў Беларусі і продажах зброі. Дагэтуль яе наяўнасьць тры гады не замінала А. Лябедзьку выяжджаць за мяжу і вяртацца.

Зьвяртае на сябе ўвагу, што апавяшчэньне Лябедзьку амаль супала ў часе з намерам Міністэрства юстыцыі ліквідаваць Партыю камуністаў. За два дні да таго А. Лукашэнка выступіў з рэзкімі заявамі на адрас ЗША, а перад тым быў падоўжаны тэрмін зьняволеньня Артура Фінькевіча.

Раней такія накаты на апазыцыю папярэднічалі вялікім палітычным кампаніям. Ці выбары, прызначаныя на восень, дастатковая нагода для гэтага? Ці ня будуць яны спалучаныя зь нейкім рэфэрэндумам? Мікалай Чаргінец учора заявіў, што рэфэрэндум па Канстытуцыйным акце саюзнай дзяржавы мае ўсе шанцы адбыцца да канца 2008 году. Падпісаньне такога акту, нават з выхалашчаным тэкстам, напэўна, гарантавала б новыя фінансавыя ўліваньні з Расеі для адміністрацыі А. Лукашэнкі, а таму такога варыянту няможна выключаць.

Што да забароны на выезд за мяжу для дзеячаў апазыцыі, то час пакажа, будзе гэта адзіночная ці масавая мера.

**Мікола Бугай**

**«Наша Ніва»: Што за гісторыя з крымінальнымі справамі і адмовай Вам у выезьдзе за мяжу?**

**Анатоль Лябедзька:** Справа ў тым, што ў сакавіку 2004 году Генэральная пракуратура завяла на мяне дзьве крымінальныя справы на факт абразы гонару і годнасьці Лукашэнкі. Справы былі заведзеныя на факт майго інтэрвію расейскаму тэлеканалу РТР, а таксама артыкулу ў «Народнай волі», дзе былі мае выказваньні пра ценявы бюджэт, а таксама пра гандаль зброяй. Некалькі месяцаў я, як на працу, хадзіў да сьледчага ў гарадзкую пракуратуру. Падалося, што я прадставіў сьледчаму ўсе доказы, што мае словы цалкам грунтуюцца на заявах А. Лукашэнкі ў СМІ. Болей мяне па гэтых справах не турбавалі, але іх не спынілі. Мне яны абсалютна ніяк не заміналі ў працы. За гэты час я пасьпеў памяняць тры замежныя пашпарты і ніякіх праблем не было.

**«НН»: А калі даведаліся пра новы паварот у гэтай справе?**

**АЛ:** У пачатку лістапада я здаў дакумэнты для атрыманьня новага пашпарту. Заплаціў грошы за дазвольны штамп на выезд за мяжу на два гады, бо тады яшчэ ніякай пэўнасьці ці адмены яго не было. Мне сказалі, што ніякіх праблем ня будзе і праз два тыдні я змагу атрымаць яго назад. Праўда, пасьля пачалі цягнуць з выдачай. 10 сьнежня, калі я вярнуўся з Вашынгтону, мне паведамілі, што дазвольны штамп паставіць ня могуць, бо на мяне ў 2004 годзе распачатыя крымінальныя справы.

**«НН»: А тыя крымінальныя справы ня могуць атрымаць новае дыханьне?**

**АЛ:** Наўрад ці. Калі я

апошні раз вяртаўся з-за мяжы, то знаёмыя памежнікі мне паведамілі, што я ёсьць у сьпісах невыязных. Што ж, буду палітычным невыязным № 1. Перакананы, што невыязных будзе шмат. Нават не дзясяткі чалавек. Упершыню ўлады пачалі парушаць артыкул 30 Канстытуцыі, які гарантуе грамадзянам бесьперашкоднае перамяшчэньне. Ёсьць першы прэцэдэнт.

**«НН»: Пасьля гэтай забароны ў Вас не зрываюцца нейкія замежныя паездкі?**

**АЛ:** У мяне ўжо сарвалася сустрэча ў літоўскім Сойме. На шчасьце, сучасныя сродкі камунікацыі дазваляюць мне кантактаваць з замежнымі партнэрамі нават не выходзячы з офісу. Я не адзін, таму за мяжу будзем адпраўляць іншых сябраў партыі ці сябраў АДС.

**«НН»: Як зьбіраецеся змагацца з гэтым рашэньнем?**

**АЛ:** Самае цікавае, што гэтую пастанову няможна абскардзіць у судовым парадку. Пастараюся зрабіць нейкі свой унёсак у перамовы, якія вядуцца між Менскам і Брусэлем аб паляпшэньні адносін. Буду рабіць усё, што ад мяне залежыць. Мне падаецца, што жорсткі прысуд Фінькевічу, зьбіцьцё Хведарука, заявы аб ліквідацыі ПКБ, адмова мне ў выездах за мяжу могуць быць зьвёнамі аднаго ланцуга. У атачэньні ідзе барацьба між групоўкамі тых, хто хоча лібэралізацыі, і тых, хто хоча працягнуць сёньняшні курс. Па ўсім бачна, што перамагаюць апошнія, да якіх схіляецца і сам Лукашэнка. Разам з тым, гэта дае нам дакладны прагноз на 2008 год. Ці гэта будзе годам адлігі, ці годам беззаконьня.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Тыраж «Советской Белоруссии» ўпаў на сотню тысячаў асобнікаў

Наклад суботняга выпуску ад 5 студзеня склаў 404 496 экзэмпляраў. Такім жа накладам выйшаў нумар ад 9 студзеня. Тады як наклад апошніх леташніх нумароў складаў 500 687.

Рэдактар «Советской Белоруссии» ня раз сьцьвярджаў, што наклад газэты фармуецца натуральным чынам, без абавязковай падпіскі, і што сьпісаньне газэты з кіёскаў «Белсаюздруку» знаходзіцца ў межах нормы.

Зьніжэньне накладу з новага году можна, аднак, зьвязаць зь неабходнасьцю эканоміі сродкаў. Загадка, чаму такая эканомія рэсурсаў ажыцьцяўляецца на пачатку году значнай палітычнай кампаніі.

**Мікола Бугай**


Вручены премии «За духовное возрождение»
Беларусь сегодня
СБ
Основана в августе 1927 года
Советская Белоруссия
№ 3 (22901) www.sb.by Среда, 9.01.2008.
стр. 2
ГДЕ @ ЗАРЫТА?
Крупнейшая хакерская атака на белорусские серверы

# Суд апраўдаў Гарбачова



У Барысаўскім раённым судзе адбыўся разгляд адміністрацыйнай справы лідэра кампаніі «За свабоднае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» Віктара Гарбачова.

Ён быў затрыманы ў аўторак і абвінавачаны міліцыянтамі ў нібыта ўчыненай ім бойцы на канцавым прыпынку электрычкі Крупкі—Барысаў. Сьведкі — а зь ім ішлі жонка і 13-гадовы сын — заяўляюць, што інцыдэнт быў справакаваны знарок: да яго падскочыў мужчына і стаў правакаваць бойку, піхаць ягоную жонку і сына, а зараз жа падбеглі міліцыянты. Гарбачова пацягнулі ў ізалятар, жонка і сын паехалі за ім.

Зазначым, што судзьдзя Юры Кобец напачатку заявіў самаадвод, а калі яго ўсё ж паставілі судзіць, вынес рашэньне на карысьць Гарбачова.

**МБ**

# Валэнса, Гавал і Квасьнеўскі заклікалі зьнізіць цану візаў для беларусаў

Былыя прэзыдэнты Чэхіі й Польшчы заклікалі зьнізіць кошт шэнгенскай візы для грамадзянаў Беларусі з 60 да 35 эўра.

Палітыкі пішуць у звароце, што Эўрасаюз з аднаго боку дэкляруе падтрымку беларускай грамадзкасьці ў яе дэмакратычных памкненьнях, а з другога — ускладняе беларусам уезд у Эўропу. Да звароту далучыліся таксама дзясяткі дэпутатаў і грамадзкіх дзеячаў Усходняй Эўропы.

**Польскае радыё**

### 19 сьнежня

#### Аднавілі крымінальныя справы

Крымінальныя справы за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі аднавілі супраць актывістаў «Маладога фронту» **Андруся Цянюты** ў Гомелі, **Кірылы Атаманчыка** ў Жлобіне і **Арсеня Ягорчанкі** ў Сьветлагорску. Гэта адбылося напярэдадні суду над **Артурам Фінькевічам**.

#### Прымусілі адмовіцца ад страйку

У Берасьці прадпрымальнікі рынку «Цэнтральны» не падтрымалі агульнанацыянальны страйк пад націскам кіраўніцтва гандлёвага аб'екту. Напярэдадні прадпрымальнікам было заяўлена, што калі яны ня выйдуць на працу 19 сьнежня, то будуць пазбаўленыя гандлёвых месцаў на рынку.

#### Вінавацяць у захопе зямлі

У Гарадку супраць **Леаніда Аўтухова**, аўтара крыжа ў памяць расстраляных бальшавікамі беларусаў, зьбіраюцца завесьці справу. «Мне прыслалі пазоў у міліцыю. Супрацоўнік паведаміў, што на мяне хочуць скласьці пратакол паводле адміністрацыйнага правапарушэньня, толькі пакуль ня вырашылі, па якім менавіта артыкуле. Але ім загадана любым чынам мяне пакараць і, магчыма, гэта будзе справа па самавольным захопе зямлі пад крыж», — адзначыў Леанід Аўтухоў. Месяц таму крыж «Змагарам за Свабоду», усталяваны ля вёскі Фралова, зьнік. Распачатая па факце зьнікненьня крымінальная справа прыпыненая.

### 21 сьнежня

#### Стань 1768-м!

Актывісты «Руху «За Свабоду» выпусьцілі сэрыю значкаў зь лічбай «1768». Нагадаем, кажучы пра апазыцыю на сваёй першай прэс-канфэрэнцыі, старшыня КДБ **Юры Жадобін** адзначыў: «Я б не сказаў, што яны ўяўляюць нейкую пагрозу нацыянальнай бясьпецы, у так званую супольнасьць дэструктыўных элемэнтаў уваходзіць усяго 1767 асобаў, і іх ня робіцца ні больш, ні менш».

### 23 сьнежня

#### Выслалі ксяндза да сьвятаў

Грамадзянін Польшчы ксёндз **Гжэгаж Худак** вымушаны быў пакінуць Беларусь. 14 гадоў сьвятар служыў у парафіі каталіцкага касьцёлу Рэчыцы. Рэчыцкія вернікі ўрачыста праводзілі ксяндза ў Польшчу. На пачатку лістапада мясцовыя ўлады адмовілі ксяндзу ў далейшай рэгістрацыі. Паводле неафіцыйнай вэрсіі, прычынай сталі выказваньні сьвятара аб сацыяльных праблемах у Рэчыцы, апублікаваныя ў польскай газэце **Tygodnik wschodni**.

### 24 сьнежня

#### Дзе Захаранка?

24 сьнежня сканчаецца тэрмін сьледзтва паводле справы экс-міністра ўнутраных справаў **Юр'я Захаранкі**. У верасьні сьледзтва паводле справы палітыка было працягнутае на чарговыя тры месяцы. Нагадаем, былы міністар ўнутраных справаў і адзін зь лідэраў апазыцыі Юры Захаранка зьнік пры нявысьветленых абставінах у траўні 1999 г.

### 25 сьнежня

#### Каляднае прывітаньне ад Мірона

У Віцебску над вуліцай Церашковай залунаў бел-чырвона-белы сьцяг. Ён быў прымацаваны да высакавольтнага дроту. Да сьцягу прыкладалася цыдулка: «Віншую ўсіх з надыходзячым Новым 2008 годам — годам Беларускай Народнай Рэспублікі. Слава героям БНР! Жыве Беларусь! Жыве вечна! Мірон». А ў ноч з 31 сьнежня на 1 студзеня нацыянальны беларускі сьцяг залунаў недалёка ад чыгуначнага вакзалу — над жылым домам па вуліцы Кірава.

### 26 сьнежня

#### Фінькевіч падаў касацыйную скаргу

Адзін зь лідэраў незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» **Артур Фінькевіч** падаў касацыйную скаргу на рашэньне суду Кастрычніцкага раёну Магілёва. А. Фінькевіч цалкам адмаўляе сваю віну, прызнаньне, зробленае ў часе суду, і лічыць прысуд незаконным. Свае дзеяньні на судзе ён тлумачыць тым, што ў той момант быў у дрэнным фізычным і псыхалягічным стане і ня мог адэкватна рэагаваць на ход працэсу. Касацыйная скарга павінна быць разгледжаная Магілёўскім абласным судом цягам месяца. Увесь гэты час А. Фінькевіч будзе знаходзіцца ў СІЗА. Нагадаем, 20 сьнежня А. Фінькевіч быў прысуджаны да 1,5 году пазбаўленьня волі з адбываньнем пакараньня ў калёніі агульнага рэжыму паводле арт. 415 КК (ухіленьне ад адбываньня пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі).

#### Салідарныя зь Фінькевічам

Менская моладзь правяла акцыю салідарнасьці з **Артурам Фінькевічам**. Яны разгарнулі расьцяжку «Свабоду Фінькевічу» і бел-чырвона-белы сьцяг насупраць будынку КДБ, а таксама гукалі: «Артуру — свабоду». Акцыя доўжылася блізу пяці хвілінаў. З КДБ да пікетоўцаў ніхто ня выйшаў, але было бачна, што шмат хто з супрацоўнікаў камітэту назіраў з вокнаў. Нікога не затрымалі. У той жа дзень 12 маладзёнаў выйшлі з партрэтамі Фінькевіча да дэпартамэнту выкананьня пакараньняў. Міліцыяй былі затрыманыя пяцёра ўдзельнікаў акцыі **— Мікіта Шуцянкоў**, **Наста Ліпніцкая**, **Паліна Курыновіч**, **Паліна Дзьякава**, **Філіп Біканаў**). Іх адвезьлі ў РУУС Ленінскага раёну.

### 28 сьнежня

#### Выганяюць з офісаў

У Магілёве не была падоўжаная дамова аб арэндзе памяшканьня з партыямі **ПКБ** і **БСДП**. Офіс гэтых арганізацыяў месьціўся на вуліцы Ленінскай, 29. Яшчэ на пачатку тыдня існавала вусная дамоўленасьць, што арэнда будзе працягнутая, аднак у апошні момант уласьнік памяшканьня адмовіўся заключаць новы кантракт. З АГП новая дамова заключаная, але толькі на паўмесяца. Намесьнік старшыні БСДП **Анатоль Сідарэвіч** мяркуе, што такім чынам магілёўскія ўлады спрабуюць пазбавіць партыйныя структуры легальных офісаў.

### 2 студзеня

#### Гамяльчук змагаецца за беларускамоўныя шыльды

Дэмакратычны актывіст **Канстанцін Жукоўскі** змагаецца супраць зьмены шыльдаў з назвамі вуліцаў Гомелю зь беларускай на расейскую мову. Ён накіраваў у Міністэрства юстыцыі, Адміністрацыю прэзыдэнта, Канстытуцыйны суд і абласную пракуратуру адпаведную заяву. Старшыня КС **Рыгор Васілевіч** паведаміў, што ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй дадзенае пытаньне разглядаць ня мае права і пераадрасаваў зварот актывіста ўпаўнаважанаму па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў. У пракуратуры К. Жукоўскаму адказалі, што выкарыстаньне расейскай мовы не зьяўляецца парушэньнем закону.

#### У Аўтуховіча сканфіскавалі маёмасьць

Ваўкавыскі суд вызначыў, што з супольнай маёмасьці сям'і Аўтуховічаў належыць прадпрымальніку **Мікалаю Аўтуховічу**, а што — ягонай жонцы Алене, і пастанавіў сканфіскаваць мужаву частку. Гэтак спагналі штраф, які ўваходзіў у склад пакараньня ваўкавыскага прадпрымальніка. Цяпер, паводле новага судовага рашэньня, будуць сканфіскаваныя 13 таксовак, кватэра і два склады. Сям'і, аднак, пакінулі дом, які належыць ім разам. У зьняволенага засталася таксама аўтабаза, палова ягоных таксовак і адзін асобны будынак. Агулам спагнаць належыць больш за 350 мільёнаў рублёў.

Нагадаем, што 7 ліпеня 2006 г. Мікалая Аўтуховіча зьняволілі на 3,5 гады, абвінавацiўшы ў нявыплаце падаткаў у асабліва буйным памеры.

### 4 студзеня

#### Міністэрства юстыцыі настойвае на ліквідацыі ПКБ

Мін'юст падало пазоў у Вярхоўны суд аб ліквідацыі ПКБ. 2 жніўня суд прыпыніў дзейнасьць ПКБ тэрмінам на 6 месяцаў, аднак, як мяркуе Мін'юст, партыя рабіла дзеяньні, якія ёй былі забароненыя заканадаўствам. ПКБ ставіцца ў правіну ўваходжаньне ў аргкамітэт па правядзеньні «Эўрапейскага маршу», падпісаньне 30 жніўня ўгоды аб прынцыпах удзелу ў парлямэнцкіх выбарах.

#### Яшчэ адну газэту выкінулі з шапікаў

Нясьвіскае аддзяленьне «Белсаюздруку» з Новага году адмовілася браць на рэалізацыю недзяржаўную газэту «Нясьвіжскі час». На працягу больш за 5 гадоў каля 300 асобнікаў газэты разыходзілася праз нясьвіскія шапікі «Белсаюздруку» літаральна за некалькі дзён. Але на 2008 г. начальніца ўпраўленьня падпісаць пагадненьне адмовілася, спаслаўшыся на ўказаньне аднекуль «зьверху».

Цяпер рэалізацыяй выданьня зоймуцца супрацоўнікі рэдакцыі.

**СП**

# У стылі Вайновіча

Хочам вам распавесьці пра некалькі момантаў з жыцьця невялікага гораду Навалукамля, што на Віцебшчыне.

У сьнежні 2007 г. споўнілася 15 год першаснай арганізацыі Свабоднага прафсаюзу Лукамскай ДРЭС. Арганізацыя даўно працуе, зарэестраваная, стаіць на ўліку. Таму дырэктару ЛДРЭС Генадзю Каралёву была ад Свабоднага прафсаюзу пададзеная заява пра правядзеньне прафсаюзнага сходу, прысьвечанага юбілею арганізацыі, у Палацы культуры «Энэргетык». Тым больш, паводле Калектыўнай дамовы, Наймальнік павінен даваць памяшканьні для правядзеньня прафсаюзных мерапрыемстваў.

Дырэктар быў ня супраць і нават сам прапанаваў правесьці сход 20 сьнежня, але параіў запрасіць на мерапрыемства старшыню Навалукамскага гарвыканкаму Мікалая Мацкевіча і старшыню Чашніцкага райвыканкаму Анфіма Міхалевіча. Абодвум былі накіраваныя пісьмовыя запрашэньні на сход Свабоднага прафсаюзу. І вось праз чатыры дні прафсаюз атрымлівае афіцыйны ліст ад дырэктара, у якім адміністрацыя паведамляе, што ня супраць правядзеньня ў Палацы культуры прафсаюзнага сходу Свабоднага прафсаюзу пры ўмове выкананьня палажэньняў Закону Рэспублікі Беларусь «Пра масавыя мерапрыемствы ў Рэспубліцы Беларусь» ад 1997 г. Савет Свабоднага прафсаюзу разгледзеў дырэктарскі адказ і вырашыў, што такім лістом нічога абмежаваць або забараніць немагчыма, бо закону ад 1997 г. не існуе, а закон ад 2003 г. нашага мерапрыемства ня тычыцца. А ўжо ўвечары 19 сьнежня старшыні Свабоднага прафсаюзу ЛДРЭС пад подпіс прынесьлі афіцыйны ліст ад старшыні Навалукамскага гарвыканкаму М. Мацкевіча, у якім правядзеньне статутнага мерапрыемства прафсаюзу забаранялася на падставе Закону «Пра масавыя мерапрыемствы». На гэты час у ведамасны Палац культуры ўжо былі запрошаныя чальцы Свабоднага прафсаюзу, ветэраны вытворчасьці й госьці ад іншых арганізацыяў. На наступны дзень старшыня Сабоднага прафсаюзу Аляксей Габрыэль прыйшоў па тлумачэньні ў кабінэт М. Мацкевіча, маючы на руках вытрымку з памянёнага заканадаўчага акту, дзе, у прыватнасьці, у артыкуле 3, гаворыцца, што Закон «Пра масавыя мерапрыемствы» не распаўсюджваецца на прафсаюзныя сходы.

— А што гэта ў вас за закон, ад 2003 г.? — цікавіўся старшыня. — Дык у нас ёсьць найноўшы.

І дастае гэты самы закон, надрукаваны ў 2006 г. У друкарнях, у нас, дзякаваць Богу, законаў пакуль не выдумляюць, і мэр быў вымушаны ня толькі прызнаць правамоцнасьць закону ад 2003 г., але нават і прачытаць ягоны тэкст. І ў выніку зьняць забарону.

Але пасьля гэтага візыту дзень у прафсаюзнага старшыні выдаўся надзвычай складаным. Тэлефон разрываўся. Тэлефанавалі з самых розных дзяржаўных установаў. Усіх цікавіла тое самае: «Што гэта ў вас за зьезд такі «круты» пачынаецца?»

— Чаму зьезд? Чаму «круты»? — дзівіўся старшыня.

Раптам зразумеў:

— «Крутыя» госьці запрошаныя! Адразу два вэртыкальшчыкі! Гарадзкі ды раённы! Сапраўды «круты зьезд»!

А ў Палац культуры «Энэргетык» энэргетыкаў усё роўна не пусьцілі. Працоўныя прыйшлі разам зь сем'ямі, сьвяточна апранутыя, ва ўрачыстым настроі. Дзьверы ў залю былі зачыненыя…

А. Габрыэль тэрмінова зьвязаўся з дырэктарам ДРЭС.

— Дык я ж ня супраць, — «шчыра» здзівіўся той і параіў, — вы гэтае пытаньне праз мэра вырашайце.

Дзверы ў залю, дзе мела адбыцца статутнае мерапрыемства Свабоднага прафсаюзу, так і не адчыніліся. Нягледзячы на тое, што абодва самыя «крутыя» ў Навалукамлі чалавекі — дырэктар ЛДРЭС і старшыня гарвыканкаму былі «ня супраць». Але сход адбыўся. У рэстарацыі.

Можа, яно так і было заплянавана. Ад самага пачатку. У рэстарацыі прыбыткі невялікія. А тут адразу столькі кліентаў!

Трэба дадаць, што гатуюць у навалукамскай рэстарацыі добра. А ўлады — пільныя. І далікатныя. Ані дырэктар, ані абодва запрошаныя вертыкальшчыкі ў рэстарацыю не прыйшлі. Хаця прадстаўнікоў сваіх дэлегавалі. Пакуль чальцы прафсаюзу паміж стравамі абмяркоўвалі свае статутныя справы, на кухні сядзелі два малойцы ў штацкім. Галодныя, бо нічога ня елі, і сьціплыя, бо на ўсе спробы А. Габрыэля пакарміць іх прынамсі супам, адмаўляліся стандартна: «Не положено».

**Запісаў Андрусь Мычык са словаў старшыні Савету Свабоднага прафсаюзу працаўнікоў Лукамскай ДРЭС Аляксея Габрыэля і іншых відавочцаў ды ўдзельнікаў імпрэзы.**

**P.S.** Дакладна вядома, што першасная арганізацыя дзяржаўнага прафсаюзу свае мерапрыемствы з органамі дзяржаўнае ўлады не ўзгадняе. Што цалкам адпавядае Закону «Пра масавыя мерапрыемствы» ад 2003 г.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# 1948

«Яны адразу з машыны былі зьнятыя і расьціснутыя грузавой аўтамашынай». Піша **Віталь Тарас.**

## «У выніку наезду машыны»

Сёлетні сьпіс трагічных гадавінаў гісторыі адкрывае 12 студзеня. Гэтая дата пазначаная далёка не ва ўсіх календарах. Між тым, у гэты дзень 60 гадоў таму адбылося адно з найбольш гнюсных злачынстваў ХХ стагодзьдзя…

13 студзеня 1948 году рабочыя аднаго зь менскіх заводаў, ідучы на ранішнюю зьмену, на вуліцы ўбачылі мёртвыя целы двух чалавек. Гэта былі знакаміты яўрэйскі актор Саламон Міхоэлс і тэатральны дзеяч Голубаў-Патапаў. (Як потым высьветліцца — сакрэтны супрацоўнік дзяржбясьпекі.)

Празь некалькі дзён Сталін атрымаў рапарт МУС СССР, заснаваны на папярэднім сьледстве беларускай міліцыі.

Трупы былі знойдзеныя ў 7 гадзінаў 10 хвілінаў раніцы. Міліцыя, якая выехала на месца здарэньня, знайшла «...два мужчынскія трупы, якія ляжалі тварам долу. Каля трупаў была вялікая колькасьць крыві. Вопратка, дакумэнты і каштоўнасьці не былі кранутыя… У абодвух былі паламаныя рэбры…Каля трупаў выяўленыя сьляды грузавых машынаў, часткова занесеныя сьнегам. Паводле агляду месца здарэньня і першаснага заключэньня мэдычных экспэртаў, сьмерць Міхоэлса і Голубава-Патапава адбылася ў выніку наезду аўтамашыны, якая ехала зь перавышанай хуткасьцю і нагнала іх, ідучы пад крутым ухілам…» (З матэрыялаў «Асобай папкі» Сталіна, якая захоўваецца ў дзяржаўным архіве РФ.)

З Масквы ў Менск выехала апэратыўная група. Міліцыя праверыла амаль 4 тысячы аўтамашын, якія ўначы з 12-га на 13-га студзеня адсутнічалі ў гаражах. Але сьлядоў крыві альбо футраў, якія былі на загіблых, ні на адной машыне не знайшлі. Не было выяўлена й сьлядоў алькаголю ў крыві загіблых. Сьледзтва нават не спрабавала высьветліць, якім чынам два чалавекі, якія спыніліся ў гатэлі ў цэнтры беларускай сталіцы, апынуліся ўначы на ўскраіне гораду.

Пра сьмерць Міхоэлса афіцыйна паведаміла радыё 14 студзеня: «Савецкі тэатар панес цяжкую страту…» Пра прычыны сьмерці нічога не гаварылася. Нэкралёг ня быў падпісаны нікім зь вядомых дзяржаўных ці партыйных кіраўнікоў СССР. Але на пахаваньні ў Маскве прысутнічалі вядомыя дзеячы культуры, а таксама жонка Молатава Паліна Жамчужына. (Пазьней яе сашлюць у лягер.) Імя Міхоэлса было прысвоена Дзяржаўнаму яўрэйскаму тэатру, у якім ён шмат гадоў працаваў. Яшчэ некалькі месяцаў яўрэйскі тэатар працягваў ставіць спэктаклі, перш чым быў зачынены. Гэтаксама ў 49-м годзе будзе зачынены Дзяржаўны яўрэйскі тэатар у Менску, які існаваў з 1926 году.

13 студзеня 1953 году — яшчэ адна круглая дата савецкай гісторыі — агенцтва ТАСС паведаміла пра раскрыцьцё змовы «тэрарыстычнай групы лекараў, якія ставілі на мэце шляхам шкодніцкага лекаваньня скараціць жыцьцё актыўных дзеячаў Савецкага Саюзу». Роля лідэра «шкоднікаў» адводзілася прафэсару Мірону Воўсі. Галоўны тэрапэўт Савецкай Арміі, генэрал-маёр мэдычнай службы Воўсі, нібыта, атрмліваў дырэктывы ад арганізацыі «Джойнт», створанай амэрыканскай выведкай, празь «вядомага буржуазнага нацыяналіста Міхоэлса». Прафэсар быў стрыечным братам Міхоэлса, сапраўднае імя й прозьвішча якога — Шлоймэ Воўсі. Абодва браты родам зь Дзьвінску Віцебскай губэрні.

У адрозьненьне ад іншага знакамітага нараджэнца Беларусі Марка Шагала, Міхоэлсу «пашчасьціла» загінуць у Менску не паводле лёсу, але воляю правадыра, які думкамі пра Беларусь наўрад ці сябе абцяжарваў.

## Ліквідацыя

Пасьля сьмерці Сталіна Лаўрэнці Берыя, які ўзначаліў Міністэрства дзяржаўнай бясьпекі, накіраваў у прэзыдум ЦК КПСС сакрэтную запіску «Аб прыцягненьні да крымінальнай адказнасьці асобаў, вінаватых у забойстве Міхоэлса і Голубава». У гэтым дакумэнце Берыя спасылаецца на паказаньні арыштаванага яшчэ ў 1951 годзе Віктара Абакумава, які да таго быў міністрам дзяржбясьпекі: «Наколькі я памятаю, у 1948 годзе кіраўнік Савецкага ўраду І.В.Сталін даў мне тэрміновае заданьне — хутка арганізаваць работнікамі МДБ СССР ліквідацыю МІХОЭЛСА пад выглядам няшчаснага выпадку, гэта значыць, каб МІХОЭЛС і ягоны спадарожнік загінулі, трапіўшы пад аўтамашыну.

У гэтай жа размове перабіраліся кіруючыя работнікі МДБ СССР, якім можна было б даручыць правядзеньне ўказанай апэрацыі. Было сказана — ускласьці правядзеньне апэрацыі на АГАЛЬЦОВА, ЦАНАВУ І ШУБНЯКОВА.

Пасьля гэтага АГАЛЬЦОЎ і ШУБНЯКОЎ, разам з групай падрыхтаваных імі для гэтай апэрацыі работнікаў, выехалі ў Менск, дзе сумесна з ЦАНАВАМ і правялі ліквідацыю МІХОЭЛСА».

Лаўрэнцій Цанава, даўні паплечнік Берыі, на той момант займаў пост міністра дзяржаўнай бясьпекі Беларускай ССР. Сяргей Агальцоў быў першым намесьнікам міністра дзяржбясьпекі СССР. Як і Цанава, ён меў званьне генэрал-лейтэнанта. А палкоўнік Фёдар Шубнякоў быў начальнікам сакрэтнага аддзелу контравыведкі, які займаўся, паміж іншага, дывэрсіямі і ліквідацыямі ў межах СССР.

Цанаву, які з 1952 году быў «на пэнсіі», дапыталі па справе, таксама, як перад тым Агальцова. Цанава напісаў у сваёй дакладной запісцы:

«...АГАЛЬЦОЎ сказаў нам, што паводле рашэньня Ўраду і асабістага ўказаньня таварыша І.В.Сталіна павінен быць зьліквідаваны МІХОЭЛС, які празь дзень ці два прыяжджае ў Менск у справах службы… Забойства МІХОЭЛСА было ажыцьцёўлена у дакладнай адпаведнасьці з гэтым плянам…Прыкладна а 10-й гадзіне вечара МІХОЭЛСА і ГОЛУБАВА завезьлі ў двор лецішча. (Лецішча Цанавы пад Менскам — **В.Т.**) Яны



**Апошняе прыжыцьцёвае фота Саламона Міхоэлса (у першым шэрагу ў цэнтры).**

адразу з машыны былі зьнятыя і расьціснутыя грузавой аўтамашынай. Прыкладна ў 12 гадзінаў начы, калі па горадзе Менску рух людзей зьмяншаецца, трупы МІХОЭЛСА і ГОЛУБАВА былі пагружаныя на грузавую машыну, адвезеныя і кінутыя на адной з глухіх вуліц гораду. Раніцай яны былі знойдзеныя рабочымі, якія аб гэтым паведамілі ў міліцыю».

Вынікам дакладной запіскі Берыі ў прэзыдыюм ЦК стаў арышт Агальцова, а потым і Цанавы. Шубнякоў на той момант ужо сядзеў у турме ў сувязі зь іншай справай. Аднак, у 1953-м, пасьля «выкрыцьця» і расстрэлу Берыі як замежнага шпіёна, Шубнякова і Агальцова выпусьцілі. А Цанава скончыў жыцьцё самагубствам у камэры.

## Бязродныя касмапаліты

Напэўна, у Берыі ў 1953-м маглі быць нейкія свае, не зусім ясныя матывы для арышту сталінскіх «гэбістаў». Але гэта не азначае, што ўказаньне зьліквідаваць выдатнага яўрэйскага артыста не магло сыходзіць ад Сталіна. Праўда, Жарэс Мядзьведзеў у сваёй рабоце, прысьвечанай забойству Міхоэлса, выказвае думку, што Сталін мог зьнішчыць яго ў сувязі з датычнасьцю да «справы Алілуевай» — жонкі правадыра.

Як бы там ні было, імя Міхоэлса было выкарыстана напоўніцу пры канцы 1948 году пры арганізацыі справы «Яўрэйскага антыфашысцкага камітэту». Гэты камітэт быў утвораны ў 1942-м годзе з ініцыятывы Берыі з мэтай атрымаць міжнародную падтрымку ў барацьбе з нацысцкай Нямеччынай — у тым ліку й матэрыяльную. У камітэт, які ўзначаліў Міхоэлс, увайшлі пісьменьнікі Ільля Эрэнбург і Самуіл Маршак, знакамітыя на ўвесь сьвет музыкі Давід Ойстрах і Эміль Гілельс, іншыя дзеячы культуры. Падчас паездак у Англію, ЗША і Канаду Міхоэлсу разам зь пісьменьнікам Іцыкам Фэфэрам удалося сабраць мільёны даляраў у дапамогу савецкім Узброеным сілам. Пасьля вайны ЯАК спрычыніўся да збору дакумэнтацыі, якая тычылася Галакосту (масавага зьнішчэньня яўрэяў гітлераўцамі). У СССР, аднак, гэтая дзейнасьць не ўхвалялася. Выданьне на расейскай мове так званай «Чорнай кнігі», прысьвечанай зьнішчэньню яўрэяў, у Савецкім Саюзе было забароненае.

Сябры камітэту былі абвінавачаныя ў буржуазным нацыяналізьме і касмапалітызьме. У 1952 годзе 13 сябраў ЯАК, сярод якіх былі выдатныя паэты Леў Квітко і Пэрэц Маркіш, расстралялі.

Варта нагадаць, што за пятнаццаць гадоў да гэтага, 29 кастрычніка 1937-га году ў Менску былі расстраляныя 19 беларускіх паэтаў. Сярод іх пяцёра пісалі на ідыш — Браніштэйн, Дунец, Кульбак, Харык і Юдэльсон.

У 1921 годзе, дэкрэтам ЦВК мова ідыш была абвешчаная адной зь дзяржаўных моваў БССР. З 1926-га па 1937-ы на афіцыйным гербе Беларускай ССР надпіс «Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!» дубляваўся яшчэ на трох мовах — ідыш, польскай і расейскай.

Мінскі яўрэйскі тэатар і яго лёс пасьля забойства Міхоэлса ўжо згадваліся вышэй. У канцы 1948-га ня толькі ўсе кнігі Міхоэлса, але ўвогуле ўсе кнігі на ідыш у СССР былі забароненыя і сканфіскаваныя зь бібліятэк.

Здавалася б, пасьля Другой сусьветнай вайны, асабліва пасьля Нюнбэргскага трыбуналу, калі ўвесь сьвет даведаўся пра злачынствы супраць чалавечнасьці, пра гітлераўскі генацыд славянскіх народаў і пра Галакост, антысэмітызм — тым больш, дзяржаўны, павінен быў адысьці ў нябыт разам з гітлерызмам. Але фашызм ідэйна ня быў разгромлены. Ды гэтага й не магло адбыцца ў СССР, дзе панавала ідэалёгія ня менш бесчалавечная.

9 траўня 1945 году Сталін абвесьціў тост на прыёме ў Крамлі: «…Я п’ю, перш за ўсё, за здароўе расейскага народу, таму што ён зьяўляецца найбольш выдатнай нацыяй з усіх нацыяў, што ўваходзяць у склад Савецкага Саюзу, …за здароўе расейскага народу як кіроўнай сілы Савецкага Саюзу».

Пытаньне самавызначэньня нацыяў было закрытае на бліжэйшыя сорак гадоў. Як і пытаньне павагі да «нярускіх».

Пасьля вайны слова «жыд», якое мае зьняважлівае значэньне ў расейскай мове, хочам мы таго альбо не, набыло такі самы сэнс і ў беларускай. Але ж і літаратурнае слова «яўрэй» у канцы 1940-х пачало гучаць як сынонім «бязроднага касмапаліта», і тысячы савецкіх грамадзянаў, у тым ліку і ў Савецкай Беларусі, спрабавалі ўсімі сіламі зьмяніць «ганебны» пяты пункт у пашпарце. Праўда, ня ўсе. Таму, думаецца, «габрэй» ці «гэбрай» пакуль ня могуць служыць адэкватнай заменай слова «яўрэй», бо выглядаюць усяго толькі ягоным сарамлівым заменьнікам.

**Працяг на старонцы 22.**

# 1948

Працяг са старонкі 21.

## 5-ы дзень месяца Іяра

14 траўня 1948 году (паводле яўрэйскага календара, на 5-ы дзень месяца Іяра 5708 году) была абвешчана Дзяржава Ізраіль. Цяпер шмат дзе можна прачытаць пра тое, што ізраільская дзяржава нібыта абавязаная сваім існаваньнем Сталіну. Савецкі Саюз сапраўды падтрымаў рэзалюцыю ААН 1947 году аб стварэньні дзьвюх палестынскіх дзяржаваў — арабскай і яўрэйскай. Брытанская імпэрыя тады імкліва губляла свой уплыў у сьвеце, у прыватнасьці, і на Блізкім Усходзе. Сыход брытанскіх акупацыйных войскаў з палестынскіх тэрыторыяў быў выгадны Савецкаму Саюзу, які імкнуўся да экспансіі дзе толькі можна. Брытанцы шукалі апірышча сярод арабаў. І Сталін, натуральна, разглядаў ізраільцянаў як процівагу брытанскаму ўплыву. А Ізраіль — у якасьці патэнцыйнага хаўрусьніка СССР у міжнароднай палітыцы.

Але ў тагачаснай няпэўнай і напружанай сытуацыі на Блізкім Усходзе мала хто мог прадбачыць, што Ізраілю ня толькі ўдасца абвесьціць незалежнасьць, але й стварыць моцную дзяржаву, якая здолее абараніць свой сувэрэнітэт у варожым атачэньні, прычым самастойна. Ёсьць шмат літаратуры і дакумэнтаў, якія сьведчаць: многія ізраільцяне — удзельнікі тагачасных падзеяў — лічаць стварэньне дзяржавы Ізраіль амаль што цудам. Якому паспрыяў, безумоўна, Галакост.

Кіраўнік савецкай дэлегацыі ў ААН Андрэй Грамыка некалькі разоў выступаў з палымянымі прамовамі ў падтрымку стварэньня яўрэйскай дзяржавы. Але што характэрна — у самім Савецкім Саюзе гэтыя прамовы нідзе не друкаваліся. Яны прызначаліся для замежнай палітыкі, а не для ўнутранай.

Адзін з дасьледчыкаў тэмы — Віктар Балан, які жыве ў ЗША, прыводзіць цікавую дэталь. Напярэдадні новага, 1948 году Міхоэлс выступіў на вечарыне памяці Мэндэле Мойхер-Сфорыма (яшчэ аднаго выдатнага сына Беларусі) у Політэхнічным музэі ў Маскве. Але не абмежаваўся культурніцкай тэмай і распавёў аб рашэньні ААН пра стварэньне яўрэйскай дзяржавы і аб прамовах Грамыкі. Прысутныя сустрэлі гэтую навіну радаснымі авацыямі й воклічамі. Балан мяркуе, што ў той вечар лёс Міхоэлса быў прадвырашаны. Цяжка з гэтым не пагадзіцца.

Ужо ў верасьні 1948-га Ізраіль адхіліў прапанову Масквы накіраваць туды «інтэрнацыянальную дапамогу». Сталінскі ідэоляг Суслаў пасьля гэтага запрасіў да сябе актывістаў Антыфашысцкага камітэту і перадаў ім меркаваньне ЦК КПСС: Ізраіль, замест таго, каб клапаціцца пра патрэбы яўрэйскага народу, апынуўся ў фарватэры дзяржаваў, «варожых справе міру». У якасьці альтэрнатывы прапаноўвалася стварыць дзяржаву на грунце… ужо абвешчанай раней Бірабіджанскай АССР у складзе Расейскай Фэдэрацыі.

## Мэндэлісты-марганісты

Каб ня зводзіць тэму 1948 году да аднаго толькі нацыянальнага пытаньня, варта коратка згадаць яшчэ адну заўважную і ня менш злавесную падзею ў гісторыі. У жніўні таго году прайшла сумнавядомая сэсія УАСГНІЛ (Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна). На сэсіі пад старшынствам акадэміка Трафіма Лысенкі адбыўся канчатковы разгром у СССР генэтыкі — навукі, безь якой немагчыма ўявіць агромністую колькасьць дасягненьняў дваццаць першага стагодзьдзя ў галіне біялёгіі й мэдыцыны. Навукі, асновы якой вядомыя сёньня кожнаму школьніку.

Вось толькі адзін прыклад, які сьведчыць пра ўзровень тагачаснай навуковай дыскусіі: «Яшчэ не спыніўся грукат гарматаў на палёх бітваў, не перастала ліцца кроў верных сыноў народу, якія адстойвалі гонар, свабоду і незалежнасьць нашай Радзімы, працаўнікі тылу дапамагалі фронту і адначасова аднаўлялі разбураныя гарады й вёскі, фабрыкі й заводы, а прадстаўнікі мэндэлеўска-морганаўскага кірунку біялёгіі тым часам былі занятыя вырашэньнем «найважнейшай» задачы: у якіх суадносінах у папуляцыі гінулі пладовыя мухі у разбураным захопнікамі Варонежы».

Тэрмін «мэндэлізм-марганізм» утвораны ад імёнаў чэскага манаха Грэгара Мэндэля, які адкрыў законы спадчыннасьці і амэрыканскага навукоўца Томаса Моргана. Ён першым стаў выкарыстоўваць у сваёй лябараторыі мух-дразафілаў, якія выявіліся найбольш зручным аб'ектам для генэтычных дасьледаваньняў (і выкарыстоўваюцца дагэтуль).

Адным з «мэндэлістаў-марганістаў», якому ўдалося выступіць тады на сэсіі УАСГНІЛ, быў беларускі акадэмік Антон Жэбрак. Ужо зьняты на той момант з пасады прэзыдэнта Акадэміі навук БССР Жэбрак адстойваў мэтады сучаснай генэтыкі і крытыкаваў тое, што ў 1960-я гады назавуць лысенкаўшчынай.

Тут няма месца гаварыць аб лёсах Жэбрака й Лысенкі. Важна памятаць, што пры канцы 1940-х у савецкай навуцы (за выключэньнем, мабыць, атамнай фізыкі), панавалі дагматызм і цемрашальства. Акадэмік Лепяшынская, напрыклад, без усялякіх ваганьняў заяўляла, што ў яе лябараторыі ўдалося зафіксаваць нараджэньне жыцьця ў прабірках літаральна зь нічога. Потым выявілася, што тыя прабіркі проста кепска мылі, і ў іх заставаўся бруд, зь якога выводзіліся жывыя арганізмы.

Дзяржаўны абскурантызм, як і дзяржаўны антысэмітызм 1948 году, напрыклад, падаюцца зьявамі, насамрэч, аднаго парадку.

Станіслаў Ежы Лец пісаў некалі, што кожны век мае сваё сярэднявечча.

Выглядае, што гэта досыць аптымістычны погляд на гісторыю. Шмат якія рэчы ў сёньняшняй Беларусі прымушаюць сумнявацца ў тым, што на пачатку новага тысячагодзьдзя мы з таго сталінскага сярэднявечча ўжо вырваліся. І размова тут, вядома, ня толькі пра Бабруйск…

## P.S.

Дарэчы, тыя, каму падалося, што лічбы ў назьве артыкулу ім штосьці нагадваюць — не памыляюцца. Славуты раман-антыўтопія «1984» Джорджа Орўэла быў апублікаваны акурат у 1948 годзе.

# Шрэк–3 па-беларуску




У перакладзе на беларускую мову выходзіць трэцяя частка мультыплікацыйнай эпапэі пра самага вядомага ў сьвеце людажэра — Шрэка. Дзякуючы «хуліганству зь беларускімі тэкстамі і перакладамі» школа Worrestershire стала нагадваць Коласаўскі ліцэй, яе вучаніцы скандуюць «Верым! Можам! Пераможам!» ды абмяркоўваюць магчымае разьмеркаваньне ў Крупкі, а з вуснаў герояў гучаць вядомыя цытаты беларускіх дзеячоў.

**Ул. інф.**

## Бабіна і Севярынец прэтэндуюць на «Глінянага Вялеса»

Паэт Алесь Аркуш апублікаваў сьпіс намінантаў на атрыманьне літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес» за 2007 год. Два выданьні з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» апынуліся ў шорт-лісьце.

Гэта раман Наталкі Бабінай «Рыбін горад», а таксама кніга Паўла Севярынца «Лісты зь лесу». Сярод іншых прэтэндэнтаў кінараманфарс Ўладзіслава Ахроменкі і Максіма Клімковіча «Янкі, альбо Астатні наезд на Літве», «Фрашкі да пляшкі» Севярына Квяткоўскага і зборнік вершаў Алега Мінкіна «Пэнаты».

Ляўрэата «Вялеса» звычайна называюць напрыканцы зімы. Летась прэмію атрымаў Валянцін Акудовіч за кнігу «Код адсутнасьці».

**Зьміцер Панкавец**



## Новая аўдыёкніга для дзетак

Кампанія «Белтонмэдыя» выпусьціла чарговую аўдыёкнігу для маленькіх слухачоў — «Дзікія лебедзі». На кампакт-дыску запісаныя казкі Ганса Хрысьціяна Андэрсэна па-беларуску. Тэкст чытае акторка Галіна Кухальская. Гэта дзясятая аўдыёкніга кампаніі. Стваральнікі кніжкі ажывілі яе гукамі прыроды: слухачы пачуюць сьпевы птушак і гукі жамяры. Каардынатар праекту Франак Вячорка абяцае, што неўзабаве выйдуць у сьвет кніжкі з школьнай праграмы: «Палеская хроніка» Івана Мележа, «Сымон-музыка» Коласа, п’есы Янкі Купалы. Рыхтуецца таксама аўдыёкніжка Антуана дэ Сэнт-Экзюпэры «Маленькі прынц».

**Ул. інф.**

## Данчыку — 50

Юбілей сьвяткуе сьпявак Данчык (Багдан Андрусішын). Ягоны бацька Паўло — украінец, а маці Юлія — беларуска. Ён заслужыў папулярнасьць у Беларусі пры канцы 1980-х. Цяпер ён займаецца пераважна журналісцкай працай. На гэты момант ён выконвае абавязкі кіраўніка Беларускай службы радыё «Свабода».

«НН» далучаецца да віншаваньняў.

## Спыніўся выхад «Музыкальной газеты»

Нумар ад 28 сьнежня 2007 году стаў апошнім для яе.

Галоўны рэдактар «МГ» Алег Клімаў так тлумачыць сытуацыю: «Белсаюздрук» прапанаваў нам загадзя нявыгадныя эканамічныя ўмовы. Яны прапанавалі нам павысіць цану на газэту ў два разы, тады як Камітэт па цэнах дазволіў павышаць кошт выданьня толькі на 0,5% у месяц. Таму прычыны абсалютна эканамічныя. Цяпер засяродзімся над працай над інтэрнэт-вэрсіяй газэты. Ужо ў студзені плянуецца, што сайт займее новы дызайн, будзем далей разьвівацца ў гэтым кірунку. Спадзяюся, што калектыў аўтараў выданьня застанецца ранейшым».

«Музыкальная газета» выходзіла ад 1996 году, за гэты час выйшаў 491 нумар. Апошнім часам наклад вагаўся ў межах 2,5 тысячаў асобнікаў. Напрыканцы 1990-х газэта выходзіла накладам 20 тысячаў асобнікаў.

**ЗП**

## «Свабодны тэатар» у 2008-м

У студзені тэатар правядзе тры тыдні на гастролях у Нью-Ёрку і Лос Анджэлесе. Таксама ў ЗША плянуецца зрэалізаваць сумесны пэдагагічны праект з Каліфарнійскай школай мастацтваў. Тэатар чакаюць таксама трохтыднёвыя гастролі ў Англіі. У красавіку ў Салёніках (Грэцыя) «Свабоднаму тэатру» будзе ўручана тэатральная прэмія Эўропы. У плянах трупы таксама стварэньне ў Менску тэатральнай студыі.

**Ул. інф.**

# «Белсат» па кабельным тэлебачаньні

Тэлеканал «Белсат» ад 1 студзеня пачаў вяшчаньне ў кабэльнай сетцы польскай Гайнаўкі. Там жыве шмат этнічных беларусаў, і беларускамоўнага ТВ яны чакаюць.

Ці магчыма гэта ў Беларусі? Дырэктарка «Белсату» Агнешка Рамашэўская паведаміла, што бліжэйшым часам канал мае намер зьвярнуцца да кабэльных апэратараў з прапановамі аб супрацы. Адбудзецца гэта пасьля сканчэньня тэставага вяшчаньня і пачатку паўнавартаснага.

Ад аўторка ў этэры «Белсату» зьявіліся тэлесэрыялы. Перавод каналу з спадарожніка «Астра» на «Сырыос» адкладзены з тэхнічных прычынаў.



## Нацыянальныя сьцягі ў Лідзе і Віцебску

На Новы год нацыянальныя сьцягі былі вывешаныя ў цэнтры Ліды. Зрабілі гэта, быццам бы, хлопцы з «Маладога фронту». А ў Віцебску «адказнасьць» узяў на сябе Мірон.

Як паведамляюць інтэрнаўты зь Ліды, народ пры выглядзе сьцягоў расплываўся: мужыкі нават пачыналі скандаваць «Жыве Беларусь».

## Маразы ўжо адступілі

Мінулы год быў адным з самых цёплых за апошнія дзесяцігодзьдзі, ён на два градусы перавысіў кліматычную норму. Цяплей было толькі ў 1989 г.

Надзвычай цёплым летась быў студзень, сярэдняя тэмпэратура якога на 7,8 С перавышала кліматычную. Рэкордна каноткай была і кліматычная зіма, якая пачалася толькі пры канцы студзеня і скончылася ўжо ў пачатку сакавіка. Самым халодным месяцам быў люты, самым цёплым — жнівень. Галоўны сыноптык Гідрамэтцэнтру» Вольга Фядотава паведаміла, што маразы, якія прыйшлі ў Беларусь у пачатку году, ужо адступаюць. Бліжэйшымі днямі чакаецца барацьба між холадам і цяплом, мокры сьнег, галалёд. Тэмпэратуры на захадзе краіны паднімуцца да плюсавых, а на ўсходзе — да нуля.

Паводле прагнозаў, сярэдняя тэмпэратура ў лютым складзе -4 — -7. Раньняя вясна прыйдзе наўрад.

**ЗП**

## Фінькевіч ня ходзіць на пошту, але езьдзіць у тралейбусах




PHOTO.BYMEDIA.NET

**На інфармацыйных стэндах у менскіх паштовых аддзяленьнях зьявіліся самаробныя плякацікі з фатаздымкам Фінькевіча і надпісам: «Артур Фінькевіч ня можа хадзіць на пошту, бо сядзіць у турме за тое, што любіць Беларусь». Выявы Фінькевіча і Дашкевіча зьявіліся таксама ў сталічным транспарце.**

**Ігар, Менск**

## Якія аматары гулялі за Лукашэнку?

«Каманда прэзыдэнта Беларусі» выйграла чацьверты калядны турнір аматараў хакею. У фінале яна перамагла расейцаў зь лікам 6:2.

Толькі аднойчы прыз зьехаў зь Беларусі. Летась у фінальным матчы каманда Лукашэнкі саступіла «Газпрому». Можа, акурат таму Расею сёлета прадстаўляў не «Газпром», а клюб «Аўтатрэйд» з Тальяцці.

На адкрыцьці турніру Лукашэнка параўнаў яго з чэмпіянатам сьвету сярод аматараў. У дзяржаўных СМІ таксама ўвесь час падкрэсьлівалася, што турнір аматарскі. І што ж за аматары гулялі ў складзе беларускай каманды поплеч з прэзыдэнтам і ягонымі сынамі? Сяргей Шыткоўскі, Аляксандар Макрыцкі, Вадзім Бекбулатаў, Алег Раманаў, Уладзімер Цыплакоў, Алег Хмыль, Аляксандар Андрыеўскі, Андрэй Кавалёў, Алег Мікульчык доўгія гады былі лідэрамі нацыянальнай зборнай і зусім нядаўна сышлі зь вялікага хакею. Некаторыя зь іх нават пагулялі ў НХЛ. Дзьмітрый Карпікаў і сёньня абараняе вароты лідэра нацыянальнага першынства «Кераміну» і зборнай краіны. Такім чынам, пакуль канадцы зь фінамі прывозяць у Менск дваровыя каманды, мы выстаўляем склад зборнай сямігадовай даўніны. І — ура! — перамагаем.

**ЗП**

# Дзякуй

**Паўлу С.**, **Георгію Ш.**, **А.С.**, **Васілю Г.**, **П.С.**, **Л.К.**, **Сяргею К.**, **Анатолю П.** зь Менскага раёну.

**Віталю Г.** з Чачэрскага раёну.

**Уладзімеру В.** з Кобрынскага раёну.

**В.Н.** з Капыльскага раёну.

**Валянціне А.** з Талачынскага раёну.

**Міхаілу С.** з Пухавіцкага раёну.

**Мікалаю Ш.** з Салігорску.

**Міхаілу М.** са Стаўпецкага раёну.

**Валер'ю П.**, **Віктару К.** з Рэчыцкага раёну.

**Вользе Б.** са Столінскага раёну.

**Юліі Е.** з Навагрудзкага раёну.

**Івану Д.** зь Мядзельскага раёну.

**Л.Я.** з Пухавіцкага раёну.

**Валянціне М.** з Навагрудзкага раёну.

**Уладзімеру Х.** з Шаркаўшчынскага раёну.

**Аркадзю К.** з Івацэвіцкага раёну.

**У.Ш.** зь Віцебскага раёну.

**Валер'ю С.** зь Віцебску.

**Уладзімеру М.** з Гомельскага раёну.

**Валянціну М.**, **Анатолю Л.**, **Мікалаю Х.**, **Зьміцру П.**, **С.І.**, **Фёдару Ш.**, **Я.Б.**, **Валер'ю Г.** з Гомелю.

**Юр'ю К.**, **М.К.**, **Аляксандру С.**, **Аляксандру С.**, **Грыгорыю К.** з Мазырскага раёну.

**Віктару З.**, **Уладзімеру В.**, **Уладзімеру В.**, **Андрэю К.**, **Уладзімеру М.**, **Міхаілу Ш.** зь Берасьця.

**Геаргіне В.**, **Васілю Л.** з Аршанскага раёну.

**А.Г.**, **Зоі Ж.**, **Івану Р.**, **Уладзімеру В.**, **Аксане М.**, **І.П.**, **Ірыне Д.**, **Алене А.**, **Хрысьціне М.**, **Валянціну К.**, **А.С.** з Горадні.

**Анатолю Б.** з Магілёва.

**Аляксандру П.** з Глыбоцкага раёну.

**Аляксандру А.** зь Пінскага раёну.

**Барысу Я.**, **Мікалаю Ю.** зь Нясьвіскага раёну.

**Уладзімеру Т.** з Жабінкаўскага раёну.

**Георгію С.** зь Бешанковіцкага раёну.

**Іосіфу Дз.** з Гарадзенскага раёну.

**Вячаславу В.**, **Івану М.** з Маладэчанскага раёну.

**Фёдару К.** з Талачынскага раёну.

**П.Л.**, **Івану Х.** з Глыбоцкага раёну.

**Сягею К.** са Слуцкага раёну.

**Пятру Д.** са Сьвіслацкага раёну.

**Сяргею С.**, **Кацярыне С.** з Барысаўскага раёну.

**Ніне А.** з Клімавіцкага раёну.

**Лідзіі А.**, **М.Н.**, **Аляксандру Р.**, **Л.А.**, **Вячаславу С.** з Баранавіцкага раёну.

**Ірыне Ц.**, **Анатолю В.**, **Міхаілу Ж.**, **А.А.**, **Андрэю К.**, **Уладзімеру Б.**, **Яўгену Л.**, **Аляксею П.**, **Ніне К.**, **Алегу Т.**, **Алесю Дз.**, **Н.Б.**, **У.Дж.**, **Эдварду К.**, **Б.Я.**, **Генадзю К.**, **Т.В.**, **Аляксандру Ф.**, **Ірыне В.**, **Д.М.**, **Леаніду Г.**, **Аляксандру М.**, **Станіславу Р.**, **В.П.**, **Кастусю Ж.**, **Уладзімеру Г.**, **Т. П.**, **Мікалаю С.**, **Генадзю Ц.**, **Анатолю К.**, **Натальлі А.**, **Т.В.**, **В.Б.**, **Д.К.**, **Мікалаю Л.**, **Уладзімеру С.**, **Уладзімеру Ц.**, **Н.Б.**, **Ігару Я.**, **В.Я.**, **Георгію М.**, **Тамары К.**, **Валеру К.**, **Алісе К.**, **А.Л.**, **Усеваладу С.**, **Мікалаю Ш.**, **І.С.**, **Тарэсе Р.**, **А.С.**, **С.О.**, **Валянціне Д.**, **Ліліі Ж.**, **Я.А.**, **Аляксею К.**, **Валянціну Ш.**, **А.Р.**, **В.Н.**, **В.С.**, **Вользе А.**, **Паўлу М.**, **Паўлу С.**, **Мікалаю К.**, **В.В.**, **Валер'ю С.**, **Сьвятлане Р.**, **Сьвятлане Р.**, **І.Н.**, **Аляксандру П.**, **Валянціне Л.**, **Сьвятлане Б.**, **Анатолю А.**, **Аляксандру Л.**, **Тамары К.**, **М.П.**, **У.Ф.**, **Г.П.**, **Аляксандру Ш.**, **Аляксандру К.**, **А.А.**, **Ірыне Г.**, **Тамары Л.**, **В.А.**, **Юр'ю Я.**, **Алегу С.**, **Віктару Дз.**, **А.К.**, **Віталю К.**, **Віталю К.**, **Уладзімеру Ш.**, **Іне К.**, **Вандзе К.**, **Т. П.**, **Рыгору Р.**, **Мікалаю С.**, **Ігару Б.**, **Барысу Л.**, **Юр'ю Л.**, **А.А.**, **Паўлу Н.**, **К.М.**, **А.С.**, **Раману М.**, **Валер'ю Ш.**, **М.Ж.**, **В.П.**, **К.П.**, **Уладзімеру Г.**, **Т.Я.**, **А.К.**, **Тацяне Я.**, **А.Д.**, **Ю.Ф.**, **Аляксандру М.**, **Уладзімеру Г.**, **Алене М.**, **Тацяне К.**, **Багуславу У.**, **Г.П.**, **Аляксандру Ш.**, **Аляксандру К.**, **А.А.**, **Ірыне Г.**, **Тамары Л.** зь Менску

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014**   Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014**   Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перавода дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

# Людзьмі, а не для людзей

На Беларускую елачку ў Горадні прыйшло ў чатыры разы болей людзей, чым летась.

Увечары 26 сьнежня ў Палацы тэкстыльшчыкаў, які месьціцца ў самым цэнтры гораду, другі раз адбылося сьвяткаваньне Беларускай елачкі.

Летась ідэя арганізаваць Елачку ўзьнікла нечакана, падчас размовы пра дзетак і іхныя патрэбы. Тады да Новага году заставалася пятнаццаць дзён…

Дзіўна, але за дзесяць дзён некалькі энтузіястаў, якія згуртаваліся вакол ідэі зрабіць сьвята для беларускамоўных дзетак, здолелі вырашыць усе арганізацыйныя, фінансавыя і творчыя пытаньні, зьвязаныя з правядзеньнем сьвята. Ці ня праўда, добрай справе ўсё спрыяе? Хаця было шмат экспромту, удалося стварыць па-сапраўднаму сьвяточную атмасфэру для больш як пяцідзесяці дзетак і іхных бацькоў, якія прыйшлі на сьвяткаваньне.

Сёлета арганізатары паставіліся да падрыхтоўкі сур’ёзьней. Распачалі ўсё больш як за паўтара месяца да сьвята.

Сёлета ўдалося сабраць 83 дзіцяці і больш за 150 дарослых, сабраць добры калектыў, напісаць уласны сцэнар… Але гэтага не дастаткова для таго, каб сьвята было ідэальным. Вось тут і ўзьнікла пытаньне: ці можа гэтае сьвята стаць традыцыяй? Ці варта яго рабіць традыцыяй? Чым гэтае сьвята адрозьніваецца ад іншых беларускіх ці савецкіх сьвяткаваньняў, акрамя таго, што робіцца па-беларуску?

Ідэя сьвяткаваньня Беларускай елачкі моцная тым, што на сёньня гэта ці не адзінае беларускае сьвята,



разьлічанае ня толькі на дарослых, ці ня столькі на дарослых, колькі на дзетак і на іхныя сем’і. Гэта сьвята для сем’яў, якое людзі з радасьцю сьвяткуюць супольна.

На маю думку, Беларуская елачка мае шанцы стаць традыцыяй, бо запатрабаваная беларускай супольнасьцю, але для таго, каб стаць традыцыяй, патрабуе асаблівай адказнасьці арганізатараў сьвяткаваньня. Гэтае сьвяткаваньне ня можа быць простай калькай з савецкай традыцыі Навагодняй ёлкі, разам зь яе імпрэзамі і пасіўнай роляй дзетак і дарослых, якія разглядаюцца як спажывальнікі прадукту, што вырабляюць на сцэне ці перад ялінкай казачныя пэрсанажы.

Людзі, якія бяруць на сябе адказнасьць арганізаваць сьвяткаваньне ялінкі, як правіла, не зьяўляюцца прадстаўнікамі шоў-бізнэсу і нават ня маюць адпаведнай адукацыі «масавікоў-забаўнікоў», а значыць, ня могуць стварыць канкурэнцыю Навагодняй ёлцы, якую ладзяць адміністрацыя, рэжысэры і акторы.

На маю думку, альтэрнатыва і асноўнае адрозьненьне Беларускай елачкі павінна заключацца акурат у актыўным удзеле саміх бацькоў і іхныя дзяцей, калі не ў падрыхтоўцы Ялінкі, то ў самім сьвяткаваньні. Гэта мае перакананьне, якое базуецца на двухгадовым досьведзе. У наступным годзе трэба паспрабаваць найбольш увагі надаць уцягваньню ўдзельнікаў ня толькі ў гульні, але і ў сьпяваньне калядак, развучваньне танцаў.

Елачка стане традыцыяй, калі мы хочам клапаціцца пра сваіх дзетак. Гэта ня проста сьвята — гэта частка іхнага дзяцінства, што ў іхных сэрцах застанецца на працягу жыцьця.

І напрыканцы хацелася б пазычыць усім нам, нашым малюпахам-дзеткам і нашым сем’ям здароўя, шчасьця і дабрабыту ў новым годзе.

**Ігар Кузьмініч, Горадня**

* * *

Перачытваючы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, 200-годзьдзе з дня нараджэньня якога будзе адзначацца ў лютым 2008, натрапіў на цікавыя радкі зь вершаванага апавяданьня «Літаратарскія клопаты» (частка 3, «Гасьцяваньне. Літаратарскі посьпех»):

Ня той край сябе праславіць,
Што на лёдзе замкі ставіць,
Што ў тэорыях дзесь кружыць,
А той, што народу служыць!
Той шчасьлівым край быць мусіць!
За здароўе Беларусі!

Напісана гэта амаль 150 гадоў таму — 10 сьнежня 1856 году — у Менску.

**Эдвард Карбановіч, Менск**

# Беларусь, якую лёгка зьняць, а цяжка зразумець

Уражаньне фільм «Музычныя партызаны» пакідае дваістае. З аднаго боку, героі стужкі кідаюць у вочы праўду, а зь іншага… зноў нас адсылаюць да спрэчкі, узьнятай колісь Ластоўскім. Піша **Сяргей Будкін**.




Па сканчэньні стужкі «Музычныя партызаны» ня ведаеш, што рабіць. Пляскаць у далоні? Ці тое асьвістаць? Уражаньне фільм польскага рэжысэра Міраслава Дэмбіньскага пакідае дваістае. З аднаго боку, героі стужкі кідаюць у вочы праўду, а зь іншага… зноў нас адсылаюць да спрэчкі, узьнятай колісь Ластоўскім.

Гаротны наш край, усё тут не як у людзей, і добра тут жыць толькі неталенавітым і безыніцыятыўным. Такая сытуацыя вельмі цікавіць замежных дакумэнталістаў.

Дэмбіньскі ўжо зьняў адну стужку пра Беларусь — «Урок беларускай мовы» яна звалася і была прысьвечаная самаахвярнай моладзі. Там было больш-менш усё ясна. Чаму і каму прысьвечаная «Партызанка» і дзеля чаго зьнятая, зразумела менш.

Калі гэта фільм пра музычны супраціў ды пра сытуацыю на беларускай роксцэне, то зусім незразумела, чаму Лукашэнка ў спартовых нагавіцах і бязь іх (у пагонах) зьяўляецца ў кадры часьцей за Вольскага. Куды цікавей было б зазірнуць у адну зь менскіх камуналак, дзе жыве адзін з удзельнікаў культавай беларускай рок-каманды. Або пацікавіцца незайздросным лёсам тых, хто стаяў ля вытокаў нашага незалежнага року. Або з схаванай камэрай схадзіць ва ўпраўленьне культуры з арганізатарам рок-канцэрту.

Калі гэта фільм пра супраціў маладых беларусаў, то чаму ў кадры ані маладафронтаўца, а толькі чуюцца жартаўлівыя кпіны Лявона і Піта пра мора, пальмы і электрычнае сонца. Няўжо маладыя беларусы толькі і робяць, што бегаюць уначы зь бел-чырвона-белымі сьцягамі па праезжай частцы ды расьпяваюць «Я нарадзіўся тут» у грамадзкіх месцах?

Пры ўсёй павазе да Сьветы Сугакі, былой вакалісткі «Тарпача» — аніяк яна ня цягне на лідэра маладога пакаленьня. А нараканьні на злачынны рэжым падаюцца тут (тут!) ня больш, чым звычайным узроставым максымалізмам. Можа падацца, што маладому рок-сьпеваку так хочацца адчуць сябе забароненным, што пры канцы ён сам пачынае даваць веры ў тое, што ўладам не даспадобы ягоная творчасьць. Вядома ж, што беларускамоўныя рок-музыкі ніколі не атрымаюць лукашэнкаўскі грант на падтрымку, але на тое яны і РОК-музыкі, каб знаходзіцца ў андэграўндзе. А таму прэтэнзіі, што даводзіцца будаваць з падручных сродкаў сцэну ў дыскаклюбе аніяк ня вяжуцца са зьбіцьцём мірных дэманстрантаў.

Калі ж гэтая стужка пра сучасную Беларусь, то чаму наша краіна падаецца тут такой убогай і прыгнечанай — адно толькі калгаснікі ў нас, што цягнуць дамоў з працы шыфэр, пашарпаныя бочкі з квасам, спэцназаўцы, што галавой разьбіваюць цагліны ды саўковыя клюбы, дзе танчаць пад «Руки вверх». Дык а чым тады ганарыцца? Хіба толькі імпэтам маладых? А чаму так сталася? І дзе выйсьце? Стужка не дае адказаў на гэтыя пытаньні.

І ўрэшце, калі гэта фільм-замалёўка, фільм-нарыс, фільм-рэпартаж, то чаго ён такі даўгі (амаль на гадзіну). Чыста рэжысэрская прыдумка — гурты «Тарпач» і «Сьцяна» спачатку без праблемаў граюць у Варшаве, а потым едуць у тур па Беларусі і сутыкаюцца з рознымі цяжкасьцямі — яна даволі прыцягальная. Але рэжысэр намагаецца ахапіць як мага болей, а тое ў яго выходзіць куды горш, чым у Хашчавацкага. Таму фільм пераўтвараецца ў чарговую баявую тэлеўлётку.

# Бадзёрая кома

афіцыёзу і шыкоўныя здабыткі ў кароткім мэтражы і андэграўндзе. Беларускае кіно на мяжы 2008. Піша **Андрэй Расінскі**.

Ідэоляг Уладзімер Замяталін, прызначаны на пасаду дырэктара «Беларусьфільму», распачаў маштабную рэканструкцыю з мэтаю выпускаць па 12 фільмаў у год да 2009 году. Студыйныя тэрыторыі, куды даўно не ступала нага чалавека, прызначаныя на распродаж. Ласыя кавалкі зямлі ў самым цэнтры сталіцы вабяць інвэстараў, але гаварыць пра дасягненьні ў самім кіно пакуль ніяк не выпадае.



**«Чаклун і Румба».**

Заштампаваная тэма «Вялікай Айчыннай вайны» заставалася галоўнай на «Беларусьфільме». І гаварылі на гэтую тэму самай сталінскай мовай.

У беларуска-расейскім фільме Алы Крыніцынай **«Радзіма альбо сьмерць»** крыклівая НКВДоўніца перавэрбоўвае беларускіх дзетак-шпегаў (!). Дэбют Андрэя Голубева **«Чаклун і Румба»** — «партнэрскае» кіно пра сапэра й ягоную аўчарку са сьціплым сюжэтам, патрыятычнымі штампамі і апэратарскімі ляпамі.

Патрыятычна-вайсковую тэму працягвае стужка Дзяніса Скварцова **«Шчыт Айчыны»**, пракат якой пачнецца ў канцы студзеня. Гэтая карціна, зьнятая на замову Міністэрства абароны, палохае гледачоў заходнімі шпегамі ў Беларусі, якія мараць выкрасьці сакрэт супрацьпаветранага шчыта сінявокай рэспублікі. «Беларусьфільм» падкрэсьлівае, што ў фільме шмат кампутарных эфэктаў.

«Вайсковым» фільмам можна лічыць і чатырохсэрыйнага **«Маёра Ветрава»**, пастаўленага Аляксандрам Франскевічам паводле твораў Мікалая Чаргінца. Гэта трэшавы баявік на мілітарна-чачэнскую тэму.

Марыя Мажар у расейска-беларускім фільме **«Ворагі»** спрабуе адысьці ад сталінскіх штампаў і паглядзець на вайну вачыма жанчыны. У ейнай стужцы нямецкія акупанты суіснуюць разам зь беларускімі вяскоўцамі, пакуль вайна не прымусіць зрабіць усіх жудасны выбар. Але сама карціна хутчэй студэнцкая, а беларускія бабы, якія сварацца на чысьцюткай расейскай мове — недаравальны фальш.



**«Ворагі».**

З чарговай мэлядрамай выступіў Аляксандар Яфрэмаў. Ягоная карціна **«Рыфмуецца зь любоўю»** пра хворую дзяўчынку, не вылазіць з эсэнгоўскіх фэстаў, але разьлічваць на нешта большае ёй не выпадае.

Калі поўнамэтражныя ігравыя стужкі выглядаюць архаічнымі, то сапраўднае беларускае кіно яшчэ жывое ў «кароткім мэтражы».

Дакумэнталіст Віктар Асьлюк дэбютаваў невялічкай ігравой стужкай **«Нябачаны край»**, якую паказвалі ў асобных правінцыйных кінатэатрах. Гэта экранізацыя апавяданьня Міхася Зарэцкага «Ой, ляцелі гусі». Дзеяньне мэлядраматычнай навэлі перанесенае ў сучаснасьць, стужка цалкам зробленая на беларускай мове. Але рэжысэр ставіцца да свайго ігравога дэбюту досыць крытычна.

Затое ягоная дакумэнтальная карціна **«Марыя»**, ужо прадстаўленая на Ляйпцыгскім фэсьце, — бездакорны шэдэўр. Гераіня гэтага фільму калісьці была знакамітай, але цяпер засталася сам-насам са сваімі ўспамінамі. Віктар Асьлюк



**Шматсэрыйнае рэактыўнае парася.**



**«Завядзёнка» Галіны Адамовіч трыюмфальна прайшла на міжнародных фэстах.**

робіць неверагоднае: у дакумэнтальным кіно, якое лічыцца «пабытова-рэчыўным», матэрыяльным — паказвае душу жанчыны.

На мяжы 2007-га з рэжысэрскімі дэбютамі выступіла і Вольга Дашук, якая складала сцэнары да фільмаў Віктара Асьлюка. Ейная першая рэжысэрская стужка — партрэт Леаніда Левіна. А карціна **«Адзінаццаць манэтак»** паказвае імпэтнага селяніна, які вярнуўся да родных мясьцін, дзе ўсё зьмянілася.

Адразу тры дакумэнтальныя стужкі былі зьнятыя на Палесьсі зь ягонай унікальнай традыцыйнай культурай. Карціна **«Завядзёнка»** Галіны Адамовіч, зьнятая напрыканцы 2006, але паказаная ў 2007 — трыюмфальна прайшла на міжнародных фэстах. Гэтая карціна паказвае шматдзетную палескую сям’ю. Яе штодзённы клопат прасякнуты сьвятасьцю жыцьця.

Другі фільм Адамовіч **«Мужчынская справа»** — пра апошніх народных музыкаў, якія шчэ засталіся ў палескіх вёсках.

Фільм тэлевізійнага рэжысэра з АТН Сяргея Рыбакова **«Сонцам асьвячуся»** быў запрошаны на Нью-Ёрскі фэст. Гэтая стужка з Іванам Кірчуком паказвае магію старых палескіх песень.

Казкі — нявычарпаная крыніца для беларускіх аніматараў. **«Залатыя падковы»** Ірыны Кадзюковай — мэлянхалічная экранізацыя Ганса Хрысьціяна Андэрсана. **«Жабка-вандроўніца»** — анімацыя Ўладзімера Пяткевіча паводле Ўсевалада Гаршына.

Уладзімер Пяткевіч — адзін з самых цікавых аніматараў. Ягоныя **«Прыгоды Мюнхгаўзэна ў Расеі»** — мультфільм, разьлічаны на суседзкі рынак. А вось **«Дзедавы прымаўкі»** Міхаіла Тумелі — экранізацыя беларускіх прымавак.

Аляксандар Ленкін працягвае ствараць прыгоды **«Рэактыўнага парасяці»**. Зьнятыя ўжо 7-я і 8-я часткі.

На вялікі жаль, убачыць гэтыя цуды амаль немагчыма. Крыху выпраўляюць сытуацыю фэсты.

На VI Рэспубліканскім фэсьце беларускіх фільмаў, які адбываецца ў Берасьці раз у два гады, былі прадстаўленыя 11 анімацыйных, 13 дакумэнтальных і 8 іґравых стужак. На Міжнародным каталіцкім фэсьце хрысьціянскіх фільмаў і тэлепраграм «Магніфікат» (43 карціны з 14 краінаў!), што праходзіць у Глыбокім — беларускія стужкі займаюць годнае месца. На кінафэсьце «Лістапад» (42 краіны) упершыню пачаўся паказ і кароткамэтражных стужак.

Але сапраўднае беларускае кіно на тэлевізіі ня бачна, у кінатэатрах зьўяляецца зрэдку.

«Падпольнае» дый «замежнае» беларускае кіно — куды больш вядомае.

Забаронены ў Беларусі Юры Хашчавацкі зьняў стужку «**Плошча»** — пра супрацію аўтарытарнае дыктатуры.

«Навінкі» ў сярэдзіне 2006 г. засьвяціліся з палітычным відэакоміксам **«Гуд-бай бацька!»**, які ў 2007 набыў папулярнасьць.

Сцэнар Андрэя Курэйчыка паводле ягонае п’есы «Выканаўца жаданьняў» быў пастаўлены ў Расеі. Стужка «Любоў-морква» сталася адной з самых касавых (зборы болей за $11 млн; у той час, як гадавая каса ўсяго беларускага кінапракату не перавышае $8 млн). А Андрэй Кудзіненка, якому не даюць працаваць на радзіме, завяршае ў Маскве на студыі Паўла Лунгіна паўтор стужкі **«Розыгрыш»**. Карціна, зьнятая паводле сцэнару Аляксандра Качана, абяцае быць вельмі моцнай.

Для тэлеканалу «Белсат» тэатральны рэжысэр Валер Мазынскі паставіў **«Тутэйшых»** паводле п’есы Янкі Купалы.

Год таму Андрэй Кудзіненка акрэсьліў стан беларускага кіно як «кому».

Сёньня — гэта бадзёрая кома, энэргічныя адміністрацыйныя захады пры мастацкім спарахненьні — але, на шчасьце, на пэрыфэрыі, яшчэ не прыціснутай ідэалягічным кантролем, ідзе сапраўднае жыцьцё.

**Андрэй Расінскі**




**«Навінкі» засьвяціліся з палітычным відэакоміксам «Гуд-бай бацька!».**

# Ці вы любіце тэатар?




Аднойчы мне ўжо давялося пісаць пра тэатар імя Янкі Купалы, і я шчыра спадзяваўся, што мне больш ніколі не давядзецца гэтага рабіць. Проста таму, што я яго надта люблю. Я думаў, у прастаце душэўнай, што акторам трупы, у якой гралі вялікія Платонаў і Глебаў, Маўчанаў і Ўладзімірскі, Станюта і Макарава, не давядзецца тлумачыць, што беларуская мова — гэта ня толькі лексыка ці артаграфія, але і фанэтыка, а вымаўленьне зацьвярдзелага, як я памятаю са школьнай лаўкі, гуку «Ч» як «Ч`» у беларускай мове катэгарычна забароненае. Я верыў, што сцэна, на якой ставіў свае спэктаклі вялікі Саньнікаў, заслугоўвае лепшага відовішча, чым пастаўлены слупам Плюшкін-Мілаванаў, якому дазволена вымавіць каля паловы дзясятка рэплікаў. Патлумачыўшы ўсё гэта ў рэцэнзіі на відавочна слабы спэктакль, якім я палічыў «Чычыкава», я вычакаў паўзу і вырашыў схадзіць у Купалаўскі. Але спачатку падышоў да афішы.

Тое, што я прачытаў на афішы, мяне ўзрушыла. Хвілін дзесяць я праціраў акуляры, спадзеючыся, што запацелае шкло проста не дазваляе мне спасьцігнуць сапраўдны сэнс напісанага. Напісана ж было проста: «Карла Гальдоні. Слуга двух гаспадароў. Пераклад з расейскай Анатоля Бутэвіча».

Не, паважаныя чытачы! Я разумею, што многія з вас маюць усе падставы мяне не любіць. Дапускаю, што сярод гэтай катэгорыі ёсьць супрацоўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, можа быць — і супрацоўнікі Купалаўскага. Але нават гэтыя рабы Мэльпамэны ня маюць маральнага права даводзіць няшчаснага філёляга да сардэчнага крызісу! Ці няхай аплочваюць мне маральныя выдаткі і візыт да мануальнага тэрапэўта па поўнай праграме!

Кожны выпускнік філфаку пацьвердзіць, што нябожчык Карла Гальдоні НІКОЛІ НЕ ПІСАЎ ПА-РАСЕЙСКУ! І для таго, каб ягоныя

героі — у тым ліку і славуты Труфальдзіна — загаварылі на мове Аляхновіча, п'есу Гальдоні трэба перакласьці З ІТАЛЬЯНСКАЙ! А Анатоль Іванавіч Бутэвіч, вельмі прыстойны чалавек, што любіць сваю краіну, сваю культуру, італьянскай мовы ня ведае, у чым шчыра прызнаўся ўсім нам.

Але тады назавіце свой спэктакль як заўгодна іначай. Гэта можа лічыцца «перапрацоўкай». «Аўтарскай варыяцыяй». «П'есай па матывах» — крыху меней літаральнасьці, крыху болей фантазіі, і «піпл схавае»: ён жа, піпл гэты самы, упэўнены, што тэлеверсія «Труфальдзіна з Бэргама» з Канстанцінам Райкіным і Натальляй Гундаравай — таксама Гальдоні, хаця п'еса вялікага вэнэцыянца напісаная прозай, і вершаваны «пераклад» абазначае сур'ёзнае адхіленьне ад задумы. Але гэта было б нашмат большай праўдай, чым тое, што напісана на афішы галоўнага тэатру Рэспублікі Беларусь і зьвернута да мінакоў галоўнага праспэкту яе сталіцы. Бо «ПЕРАКЛАД ЗЬ ПЕРАКЛАДУ НА РАСЕЙСКУЮ» абазначае, што гэта — што заўгодна, але не пераклад Гальдоні, і што ў краіне няма пісьменьнікаў, якія б ведалі італьянскую мову.

Стоп-стоп, спадарства! Ёсьць у нас такія пісьменьнікі! Цудоўныя перакладчыкі ёсьць! Той жа Лявон Баршчэўскі, скажам! Па-мойму, сярод моваў, вядомых спадару Лявону, ня толькі нямецкая (Гётэ) з французскай (Апалінэр) і грэцкай (Эсхіл), але і італьянская. Вось няхай бы яму міністэрства наша і замовіла адпаведны пераклад. Дарэчы, там яшчэ нехта Скарынкін лічыцца, за свайго Дантэ нават нечым там італьянскім уганараваны. Вось і ён няхай перакладае — калі, канечне, ён перакладаў Дантэ, а не Лазінскага. Або Аксана Данільчык з БДУ, якая на перакладах з італьянскай спэцыялізуецца. Урэшце, адзін з рэдактараў газэты, якую вы трымаеце ў руках, таксама перакладаў Пірандэла і Эка, і ён бы замову Мінкульту, напэўна, таксама палічыў бы за гонар.

А Анатоль Іванавіч няхай перакладае Нямцэвіча і Багамольца — з польскай мовы, якой, наколькі я разумею, гэты паважаны перакладчык Станіслава Лема мусіць валодаць больш-менш прыстойна. І ня трэба яго няславіць, даючы яму замовы, якія не адпавядалі б ягонай натуры, талентам і ведам.

Я пішу пра гэта зусім не для таго, каб кінуць камень у агарод спадара Бутэвіча. Якраз Бутэвіч, хутчэй за ўсё, вінаваты менш за іншых. Я ўяўляю сабе, як ён адмаўляўся, калі яму прапанавалі зрабіць гэты, дазвольце сказаць, пераклад. Як ён пакутаваў, уяўляючы сабе зласьлівасьць калегаў-перакладчыкаў: бачыш ты, італьянец знайшоўся! Але папрасілі, паабяцалі заплаціць... Трэба ж жыць на нешта пісьменьніку, які не спадзяецца на несьмяротнасьць, падобную да несьмяротнасьці Гальдоні!

А вось вінаватыя якраз тыя, хто падставіў шаноўнага Анатоля Іванавіча.

Па-першае, мастацкі кіраўнік Купалаўскага тэатру спадар Раеўскі. Былыя заслугі не даюць мандат зьдзяйсьненьня глупстваў пры ўсеагульным маўклівым ухваленьні. Дэманстрацыя відавочнай непавагі да гледачоў уласнага тэатру — глупства. Калі ня горш. Калі гэта ня сьведчаньне таго, што мастацкага кіраўніка рэпутацыя даверанай яму ўстановы ўжо папросту не хвалюе.

Па-другое, вінаваты намесьнік міністра культуры, які курыруе тэатры. Міністраў у нас прэзыдэнт прызначае. Яны — людзі ня творчыя, а палітычныя, таму можна прызначыць шкляра, і будзьце ўдзячныя, што вам яшчэ партача не падсунулі. А вось намесьнікамі міністраў павінныя быць — і гэта практыкуецца ва ўсім сьвеце, уключаючы Расею і Нямеччыну, як ні дзіўна, — прафэсіяналы. Розьніцу паміж ПЕРАКЛАДАМ і ПЕРАРОБКАЙ (ПЕРАКАЗАМ, ВАРЫЯЦЫЯМІ і г. д.) яны павінныя разумець. А калі не разумеюць, то няхай едуць на гуту памочнікамі шкловыдзімальшчыкаў. Там праца шкодная, небясьпечная, а раптам яны хаця б чаму-небудзь і навучацца. І будуць ведаць, што кожнаму належыць займацца сваёй непасрэднай справай. У тым ліку і перакладчыкам. Гальдоні мусіць перакладаць чалавек, што валодае італьянскай. Гэта БЯССПРЭЧНАЯ ІСЬЦІНА.

І толькі ў тым выпадку, калі гэтым двум вышэйназваным спадарам чарговае «купалаўскае» «бязладзьдзе» дарма пройдзе, вінаватым будзе міністар. Таму што не выконвае сваёй найпростай функцыі — не кіруе культурай, а спакойна назірае, як яна ідзе пад адхон пры маўклівым пакусваньні спадаром Раеўскім сваёй жа ўласнай барады. А дэградацыя галоўнага тэатру краіны — службовае злачынства чалавека, што адказвае за гэтую самую культуру.

І апошняе.

Я абяцаю спадару Раеўскаму, што з 1 студзеня і да канца сэзону я паспрабую пабачыць усе п'есы, што ідуць у ягоным тэатры, і шчыра сказаць чытачам, што я пра іх думаю.

**Аляксандар Фядута**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**11 (пт)** — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**12 (сб)** — «Ромул Вялікі».
**13 (ндз)** — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**14 (пн)** — «Ідылія».
**15 (аўт)** — «Больш чым дождж».
**16 (ср), 17 (чц)** — «Сны аб Беларусі».
**18 (пт)** — «Сымон-музыка».
**19 (сб)** — «Памінальная малітва».
**20 (ндз)** — «Макбэт».
*ранішія спэктаклі*
**13 (ндз)** — «Афрыка».
**20 (ндз)** — «Сьнежная каралева».
*малая сцэна*
**13 (ндз)** — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

**Тэатар юнага гледача**

**17 (чц)** — «Таямніцы блакітных азёраў».
**18 (пт)** — «Залатое сэрцайка».
**18 (пт)** — «Тарас на Парнасе».
**19 (сб)** — «Мешчанін у шляхецтве».
**19 (сб)** — «Паліяна».
**20 (ндз)** — «Маленькія трагедыі».
**20 (ндз)** — «Дзень народзінаў ката Леапольда».
**20 (ндз)** — «Прыгоды Бібігона».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**11 (пт)** — «Чорны квадрат».
**15 (аўт)** — «Жан і Бэатрыса»
**17 (чц)** — «Іванаў».
**18 (пт)** — «Адвечная песьня»
**19 (сб)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**20 (ндз)** — «Дамавічкі».
**20 (ндз)** — «Сёстры Псыхеі».

# Пётар Лысенка: чалавек, які зьдзіўляе



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Археоляг, доктар гістарычных навук, прафэсар Пётар Фёдаравіч Лысенка зьдзіўляе многім. Найперш плёнам сваёй працы. Ён адкрыў старажытнае Бярэсьце. Ён раскопваў старажытныя Пінск, Тураў, Давыд-Гарадок, Слуцак, Клецак. Ён змог арганізаваць — ад раскопу ў чыстым полі да будаўніцтва павільёну і фармаваньня экспазыцыі — унікальныя археалягічныя музэі ў Бярэсьці і Тураве. Ён напісаў больш за сотню артыкулаў і дзясяткі кніг. Тыя зь іх, якія ў выходных дадзеных пазначаныя як «навукова-папулярныя», чытаюцца, як захапляльныя прыгодніцкія раманы. Дзякуючы ягонай працы жыцьцё стражытных гарадоў паўднёвай Беларусі зрабілася для тых, хто ім цікавіцца, значна больш зразумелым. Ды і тых, хто ім цікавіцца, стала значна больш!

Пётар Фёдаравіч падаецца чалавекам, які звык усё рабіць грунтоўна і як мага лепш. Магчыма, у гэтым імкненьні і звычцы рабіць усё належным чынам і крыюцца карані ягоных жыцьцёвых посьпехаў?

Цяпер Пятру Лысенку 76 год. Ён працягвае працаваць у Інстытуце гісторыі НАН РБ, займаецца палявымі дасьледваньнямі, публікуе новыя кнігі. Зь ім побач і ў археалягічным раскопе і на паверхні — вельмі прыгожая і энэргічная жонка Натальля Мікалаеўна Дубіцкая і сын Фёдар, вучань беларускамоўнай 23-й гімназіі. Менавіта Федзя ў 2004 годдзе на раскопках Турава першым знайшоў унікальны цагляны крыж памерамі 6,95х6,75 мэтраў... Што гэта такое, навошта — загадка дасюль...

Пра загадкі і праблемы беларускай археалёгіі, пра мінулае і сучаснасьць гутарыць зь Пятром Фёдаравічам Лысенкам карэспандэнтка «НН».

## Бярэсьце, якога ня ведалі

**«НН»: Пётар Фёдаравіч, давайце пачнем з Вашага, на мой погляд, самага эфэктнага тварэньня: археалягічнага музэю «Бярэсьце». Багацьце экспазыцыі ўражвае: сам старажытны горад з вуліцамі і дамамі, шматлікія знаходкі... Такога не даводзілася бачыць нідзе. Рыхтуючыся да размовы з Вамі, у адным са шматлікіх артыкулаў, прысьвечаных Вашым дасьледваньням Бярэсьця, прачытала, што Вам удалося знайсьці Бярэсьце таму, што Вы празорлівец і можаце бачыць**

**празь зямлю. Сапраўды так, Вам была нейкая відзежа?**

**ПЛ:** Ні ў якім разе! Ні ў якім разе! У першы ж мой палявы сэзон у асьпірантуры — гэта было ў 1961 годзе — мы з маім навуковым кіраўніком Валянцінам Васільевічам Сядовым праехалі па ўсіх гарадах старажытнай Тураўскай зямлі, у тым ліку былі і ў Бярэсьці. Тады яшчэ ня быў адчынены мэмарыял Брэскай крэпасьці, а на тое месца, дзе мог бы быць старажытны горад, трапіць было цяжка, бо там разьмяшчалася воінская часьць і пабочным асобам уваход быў забаронены. Тым ня менш, мы трапілі туды, куды нам было трэба, але ў той раз ніякіх сьлядоў старажытных паселішчаў не знайшлі. Я засеў за літаратуру, каб сабраць зьвесткі пра працу маіх папярэднікаў — людзей, якія раней спрабавалі знайсьці старажытнае Бярэсьце, вядомае нам па летапісах. Аказалася, што аўтар выдатнай кнігі «Горадабудаўніцтва Беларусі» Юры Ягораў лічыў, што шукаць яго трэба на адным з астравоў, якія ствараюць рукавы Мухаўца пры ўпадзеньні ў Буг.

**«НН»: Але ж, здаецца, там цяпер няма ніякіх астравоў...**

**ПЛ:** Справа ў тым, што за прамінулыя стагодзьдзі ляндшафт вельмі зьмяніўся. Некаторыя астравы зьніклі, некаторыя рукавы перасохлі. Да таго ж, ляндшафт быў вельмі зьменены штучна пры будаўніцтве Брэскай крэпасьці, калі сам горад быў перанесены ў іншае месца. Выдатны дасьледчык археалёгіі Палесься Юры Кухарэнка лічыў, што старажытнае гарадзішча загінула якраз пры будаўніцтве крэпасьці. Таму перш-наперш я стаў адшукваць пляны і красьлюнкі, якія выкарыстоўваліся пры будаўніцтве крэпасьці, пляніроўкі, дзе было відаць, якія зьмены адбываліся зь ляндшафтам, а таксама сьведчаньні старажытных вандроўнікаў, якія бывалі ў Бярэсьці — Шпілеўскага і іншых. Недзе ў 1964 г. у мяне ўжо склалася пэўнае ўяўленьне, дзе варта шукаць, і я выклаў свае здагадкі і меркаваньні ў навуковай працы. То бок, спачатку Бярэсьце было адкрытае на кончыку асадкі. У гэты ж час праводзіліся земляныя работы ля бастыёнаў на Шпітальным востраве, і мы знайшлі там кераміку XII—XIII стагодзьдзя. Гэта мяне натхніла. Мы заклалі шурфы і знайшлі выдатны культурны слой, які захоўваў нават дрэва. Потым заклалі ўжо раскоп на вялікай плошчы, і тут усялякія сумненьні ўжо зьніклі: мы сапраўды знайшлі старажытнае Бярэсьце.

**«НН»: Значыць, справа была не ў яснабачаньні, а ў строгім навуковым разьліку?**

**ПЛ:** Ня толькі ў разьліку... У 1969 годзе мы ўскрылі частку плошчы ля падножжа бастыёнаў. Знаходкі былі вельмі добрыя. Стала зразумела, што трэба шукаць і капаць далей. Але дзе менавіта? Там, на востраве, яшчэ ў мінулым годзе расла такая вялізная таполя. Дык вось, я тады тры дні сядзеў пад гэтай таполяй і ўсё стараўся ўявіць: калі старажытнае гарадзішча было менавіта тут, то як, па якой логіцы, яно магло быць збудаванае? Як маглі ісьці вуліцы, як маглі стаяць дамы? На мяне ўжо сталі нападаць супрацоўнікі, якія прыехалі са мною: маўляў, хопіць сядзець, трэба працаваць, палявы сэзон праходзіць! А я ўсё сядзеў і думаў, сядзеў і імкнуўся ўявіць старажытны горад... Нарэшце выбраў месца, пачалі працаваць. І гэта аказалася вельмі ўдалае месца. Менавіта на ім мы выявілі будынак на 12 вянкоў! А такія будынкі ў археалёгіі і дасюль невядомыя. Ужо нашто выдатны археалягічны помнік у Ноўгарадзе, там адкапана больш за 1000 будынкаў, але яны на 2—3 вянка. А ў нас аказаліся будынкі і на 8, і на 10, і на 12 вянкоў!

Знаходкі датуюцца XI—XIII стагодзьдзямі.

**«НН»: Якім было жыцьцё ў старажытным Бярэсьці? Ці можна сказаць, што гэта быў багаты горад?**

**ПЛ:** Бярэсьце не было вялікім, тут не было раскошы. Гэта быў перыфэрыйны горад з насельніцтвам, у розныя часы, каля 1000—5000 чалавек, дзе людзі жылі штодзённымі патрэбамі. Але гэтае жыцьцё было паўнавартасным: тут абраблялі нівы, пасьвілі быдла, працавалі рамесьнікі, воіны рыхтавалі адмысловую зброю, жанчыны насілі ўпрыгожваньні, дзеці бавіліся з цацкамі... І гэта быў усходнеславянскі горад дрыгавічоў. Гэта неаправержна даказалі менавіта археалягічныя дасьледаваньні.

Вы бачылі, якімі былі жылыя пабудовы: невялікія, часьцей за ўсё памерам 3,6х3,6 м хаціны, якія разьмешчаныя цесна адна ля адной. У іх жылі людзі, а паміж дамамі трымалі жывёл: кароваў, сьвіней, коней... Калі ў халодную пару году зьяўляўся прыплод, яго таксама бралі ў хату.

**«НН»: А вадаправод, каналізацыя?**

**ПЛ:** (*іранічна глядзіць на карэспандэнтку, пасьля паўзы*): Вадой забясьпечвалі рэкі, Буг і Мухавец, а што датычна каналізацыі, то было так, як яшчэ нядаўна на вёсках: за хату...

**«НН»: Калі знаходзісься ў Бярэсьці і разглядаеш тое, што зьбераглося ў зямлі, міжволі ўяўляеш, што навокал, пад нагамі, дасюль застаюцца яшчэ больш цікавыя знаходкі. Чаму раскопкі Бярэсьця не вядуцца далей?**

**ПЛ:** Археалягічныя работы — складаны працэс. Ня толькі ад археолягаў залежыць, што і дзе капаць. Але раскопкі Бярэсьця працягваюцца. Не далей як летам 2006 году мы праводзілі раскопкі на тэрыторыі цытадэлі крэпасьці, ля гарнізоннай царквы, дзе будаўнікі рыхтавалі катлаван для прыходзкага дому гэтай царквы. І вынікі аказаліся вельмі цікавымі. Нам удалося знайсьці кераміку XI стагодзьдзя, што служыць доказам, што тут, на Цэнтральным востраве, знаходзіўся акольны горад дзяцінца, які быў разьмешчаны там, дзе цяпер археалягічны музэй.

Ніжэй за гэты пласт знайшлі кераміку і некаторыя іншыя рэчы, якія датуюцца X стагодзьдзем. Значыць, пасяленьне тут узьнікла раней за дзяцінец на Шпітальным востраве! Нам удалося знайсьці глінабітную печ. Звод яе абваліўся, а пад зводам захаваліся кераміка трох гаршчкоў X стагодзьдзя! Такая знаходка — рэдкасьць. Мы змаглі перавезьці яе цалкам у музэй.

Таім чынам, Бярэсьце стала старажытней на 40—50 год.

## Цікавасьць да археалёгіі вырасла, а сродкі здабываць стала цяжэй

**«НН»: Скажыце, калі ласка, калі цікавасьць да археалёгіі была вышэй: 20—30 год таму, ці сёньня?**

Працяг на старонцы 34.

# Пётар Лысенка: чалавек, які зьдзіўляе

Працяг са старонкі 33.

**ПЛ:** Сёньня. Да археалягічных музэяў у Бярэсьці, у Тураве людзі едуць цэлымі аўтобусамі, прычым ня толькі з нашай краіны, але і з-за межаў. І паглядзіце, якія захопленыя водгукі яны пакідаюць!

**«НН»: У сваёй кнізе «Адкрыцьцё Бярэсьця» Вы вельмі маляўніча апісваеце, як з трох праектаў павільёну музею ў міністэрстве выбралі самы танны. З тых часоў нешта зьмянілася? Ужо зьявілася ва ўладных структурах разуменьне таго, што археалёгія вартая таго, каб укладаць сродкі? Сродкі здабываць стала лягчэй?**

**ПЛ:** Нашмат цяжэй! Раней мы мелі фонд, мы мелі сродкі для таго, каб працаваць у экспэдыцыі 3—4 месяцы. Цяпер мы маем сродкі толькі для таго, каб працаваць у полі 2 тыдні без усялякіх сродкаў на найм працоўнай сілы.

**«НН»: А як жа Вы працуеце?**

**ПЛ:** У многім за кошт ранейшых накапленьняў. Горка шкадую, што такіх магчымасьцяў, якія былі раней у нас, сёньняшняя археалягічная моладзь ня мае. Суровая рэчаіснасьць яшчэ далёкая ад ідэалу. Вось ужо 48 год я працую ў палявой археалёгіі. У мяне ёсьць што параўноўваць.

**«НН»: Дык, магчыма, менавіта гэтым недахопам сродкаў у навуковай археалёгіі тлумачыцца ўсплёск актыўнасьці так званых «чорных» археолягаў?**

**ПЛ:** І гэтым. Аднак ня толькі гэтым. Стымулююць работу «чорных археолягаў» попыт на старажытныя рэчы на «чорным рынку». Аднак галоўнае — слабасьць аховы нашых гістарычна-культурных помнікаў Міністэрствам культуры РБ і органамі мясцовай улады. У выніку — археалягічныя помнікі аказваюцца безабароннымі перад нашэсьцем «чорных археолягаў», што наносіць страшную страту нашай гістарычнай і культурнай спадчыне. І маральна разбэшчвае наша грамадзтва ў цэлым.

**«НН»: А ці ёсьць у беларускіх археолягаў магчымасьць атрымоўваць гранты для дасьледваньняў ад нейкіх міжнародных арганізацыяў, прыватных структураў?**

**ПЛ:** Ёсьць. У найбліжэйшы час, магчыма, у гэтым годзе, магчыма, у наступным павінныя быць вельмі цікавыя работы ў адным з гарадоў... У тым жа Бярэсьці. Калі мы знойдзем сродкі.

**«НН»: Бярэсьце ўнесенае ў сьпіс помнікаў ЮНЭСКА?**

**ПЛ:** На зьдзіўленьне, не. Гэта ўнікальны помнік, адзіны ў сьвеце. Тым ня менш, ён не ўваходзіць у сьпіс ЮНЭСКА.

**«НН»: Як жа такое магло адбыцца?**

**ПЛ:** Калі Беларусь прапаноўвала свае помнікі для гэтага сьпісу, то займаўся работай адзін чалавек зь Міністэрства культуры, і ён унёс тады той помнік, зь якім працаваў сам. Гэта, увогуле, называецца злоўжываньнем службовым становішчам.

## Пра музэй «Бярэсьце»

**«НН»: Калі восеньню гэтага году была ў музэі, мяне ўразіла, што там працякаў дах, і ад дажджу супрацоўнікі закрывалі раскоп плёнкай.**

**ПЛ:** Гэта якраз вынік таго, што некалі выбралі самы танны праект. Цяпер сродкі на рамонт даху выдзеленыя. У мінулым сэзоне мы займаліся кансэрвацыяй пабудоваў, паставілі іх на дубовыя лагі.

**«НН»: Пры многіх музэях міра існуюць музэйшопы: крамы, дзе наведвальнікі могуць набыць дакладныя копіі рэчаў, выстаўленых у музэі. Ці магчыма зьяўленьне такой крамы ў Бярэсьці? Я думаю, многія з задавальненьнем набылі б на памяць ці для выкарыстаньня тыя ж бранзалеты, пярсьцёнкі, фібулы, кілты, рукавічкі, керамічны посуд ды іншае.**

**ПЛ:** Думаю, гэта магчыма і неабходна. Аднак гэта патрабуе клопатаў, арганізацыі. І гэта па-за межамі нашай кампэтэнцыі і магчымасьцяў.

**«НН»: Думаю, кожны берасьцеец удзячны Вам за тое, што Вы адкрылі «адкуль ёсьць пайшла» зямля берасьцейская. Але сярод берасьцейскай інтэлігенцыі карыстаецца папулярнасьцю і ідэя ўзнаўленьня хаця б часткі гораду XVI—XVII стагодзьдзя, часоў яго росквіту, калі ў горадзе было многа прыгожых цэркваў, манастыроў, іншых будынкаў, ад якіх, на жаль, не засталося каменя на камені. Скажыце, калі ласка, як Вы ставіцеся да гэтай ідэі? І дзе, па-Вашаму, можна было б узьвесьці такі комплекс?**

**ПЛ:** Месца, дзе размяшчаўся горад XVI—XVII стст. кардынальна перабудаванае пры ўзьвядзеньні крэпасьці і стварэньні мэмарыялу. Аднак, магчыма і што-небудзь зрабіць. Я — за гэта. А як удасца — пакажа час. Патрэбная моцная зацікаўленасьць і падтрымка мясцовых уладаў.

## Працавітасьць і ўменьні — ад бацькі

**«НН»: Калі я чытала Вашую кнігу «Адкрыцьцё Бярэсьця», мяне ўразіла, як добра Вы разьбіраецеся ў «тэхпрацэсах» старажытных рамёстваў, у тым, што складала паўсядзённае жыцьцё гораду. Вы так апісваеце будаўніцтва дамоў, або работу жаронаў, або выплаўленьне жалеза, або працу старажытнага шаўца, што здаецца: дай Вам пэўны інструмэнт, і Вы і дом пабудуеце па старажытнай тэхналёгіі, і боты пашыеце...**

**ПЛ:** А гэта ў мяне ад бацькі Фёдара Кляментавіча. Ён мог і боты пашыць, і туфлікі жаночыя, ён і бондарную працу ўмеў, і сталярную — мэблю рабіў. І каля яго я вучыўся. Ён і сьлясарыў, і ровар мог наладзіць, і матор...

**«НН»: Значыць, тое, што Вы з маленства пагружаныя ў гэтае традыцыйнае, аўтэнтычнае жыцьцё рамесьніка, якое многае захавала ад прамінулых стагодзьдзяў, дапамагло Вам потым у прафэсіянальнай працы, ва ўзнаўленьні жыцьця нашых продкаў?**

**ПЛ:** Канечне! Ну і, канечне ж, існуе і спэцыяльная літаратура, якая дапамагае тэарэтычна падкавацца... А тата мой быў ня толькі страшна працавітым, але і фантазэрам, ён мог многае прыдумаць. Не было такой працы, зь якой ён ня мог бы справіцца. Ён мне многае даў. Сваю кнігу «Старажытны Пінск XI—XIII стагодзьдзяў» я прысьвяціў бацькам: Фёдару Кляментавічу і Ганьне Данілаўне, пінчанам.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»




**Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца.**




**Наталка Бабіна. Рыбін горад.** Раман




**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.**

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Актавая кніга Полацкага магістрату 1650. Зборнік дакумэнтаў.** Склаў і падрыхтаваў да друку М. Гардзееў. НАН Беларусі, Ін–т гісторыі. — Менск: Беларуская навука, 2006 — 270 с.

Захапляльная кніга для ўсіх, хто цікавіцца сярэднявечнай гісторыяй і жыцьцём у гэты час беларускіх гарадоў.

**Бяласін Я. Открытость людям.** — Берасьце, надрукавана прынтэрным спосабам, 2006. — 144 с.

Выданьне зьмяшчае артыкулы аўтара на розныя тэмы, надрукаваныя ў беларускіх перыядычных выданьнях на працягу апошніх 15 год. На расейскай і беларускай мовах.

**Гарэцкі М. Дзьве душы.** Аповесьць. — Менск: Мастацкая літаратура, 2006. — 110 с.

Клясычны, захаплялыны твор.

**Жук А. Слуцак, 37-ы...** — Менск: Выдавец В. Хурсік, 2006. — 52 с.

Краязнаўчае выданьне, якое адлюстроўвае некаторыя фрагмэнты жыцьця случчакоў у 1937 годзе.

**Ірванец А. Роўна/Ровно.** Выбраныя творы. Пераклад з украінскай У. Арлова. — Менск: Зьміцер Колас, 2007. — 176.

У кнігу ўвайшлі раман «Роўна/Ровно», п'есы і апавяданьне аднаго з найбольш чытаных сучасных украінскіх пісьменьнікаў.

**Коўтун В. Пакліканыя: раман-жыцие.** — Менск, Маст. літ., 2007 — 247 с.

Новы раман вядомай беларускай пісьменьніцы, прысьвечаны жыцьцю Эўфрасіньні Полацкай.

**Кобец-Філімонава А. Карэльскія Курапаты 1937—1938** (расстрэльныя сьпісы беларусаў і асуджаных у Беларусі). — Менск: Кнігазбор, 2007. — 180 с.

Кніга памяці, выданьне якой прымеркаванае да міжнароднага Году памяці ахвяраў палітычных рэпрэсіяў.

**Лысенка П. Адкрыцьцё Бярэсьця,** 2–е выданьне, з дап. — Менск: Беларуская навука, 2007 — 181 с.

У кнізе расказваецца пра адкрыцьцё старажытнага Бярэсьця і яго археалягічнае вывучэньне. Дадаўся разьдзел пра вынікі раскопак у 2006 годзе на тэрыторыі Берасьцейскай крэпасьці.

**Лысенка П. Старажытны Пінск XI—XIII ст.** — Пінск: Пін. рэг. друкарня, 2007. — 172 с.

Гісторыя Пінску па матэрыялах археалягічных дасьледаваньняў і пісьмовых крыніц.

**Лысенка П. Сказаньне пра Тураў** — Менск: Беларуская навука, 2006. — 118 с.

Гісторыя Турава па матэрыялах археалягічных дасьледаваньняў і пісьмовых крыніц.

**Мэтрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга №560 (1542 год).** Падрыхтаваў А. Дзярновіч. — Менск: Беларуская навука, 2007. — 157 с.

Гэтая кніга Мэтрыкі прысьвечаная дэмаркацыі мяжы паміж ВКЛ і Лівоніяй, утрымлівае зьвесткі пра лякальныя канфлікты на гэтай мяжы.

**Пра Івана Луцкевіча. Успаміны, сведчаньні.** Укл. А.Сідарэвіч — Менск: Кнігазбор, 2007. — 80 с.

Перавыданьне тэкстаў брашуры «Памяці Івана Луцкевіча ў першыя ўгодкі сьмерці Яго» з дадаткам, камэнтарамі і індэксам імёнаў.

**Содаль У. Волат зь Мігаўкі.** — Менск: Выдавец В. Хурсік, 2007.

Успаміны землякоў пра Аляксандра Ўласава, сабраныя і асэнсаваныя У.Содалем.

**Саракавік І. Гісторыя Беларусі у кантэксьце сусьветнай гісторыі.** — Менск: Современная школа, 2006. — 456 с.

Даецца кароткі агляд гісторыі Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён у кантэксьце сусьветнага гістарычнага працэсу.

**Чарняўскі М. Як пошуг маланкі. Расьціслаў Лапіцкі.** — Менск: Тэхналёгія, 2006. — 72 с.

Карпатлівае дасьледаваньне трагічнага і яркага лёсу Расьціслава Лапіцкага, які быў расстраляны ў 22 гады, у 1950 годзе за антысавецкую дзейнасьць.

**Шамякіна Т. Кітайскі каляндар і славянскі міталягічны бэстыярыюм. Паралелі.** — Менск: РІВШ, 2007 — 104 с.

Кніга для тых, хто цікавіцца бэстыямі. Іх чакае шмат цікавага.

**Алексиевич С. У войны не женское лицо.** — Москва: Время, 2007. — 416 с. — (Голоса утопии)

**Алексиевич С. Цинковые мальчики.** — Москва: Время, 2007. — 400 с. — (Голоса утопии)

**Алексиевич С. Чернобыльская молитва: хроника будущего.** — Москва: Время, 2007. — 384 с. — (Голоса утопии)

**Алексиевич С. Последние свидетели.** — Москва: Время, 2007. — 304 с. — (Голоса утопии)

Перавыданьні кніг, якія сталі сусьветнымі бэстсэлерамі.

**Белорусский эротический фольклор.** Издание подготовили Т. В. Володина, А. С. Федосик. — Москва: Научно–издательский центр «Ладомир», 2006. — 381 с. (Русская потаенная литература).

У зборнік уваходзяць артыкулы дасьледчыкаў тэмы, а таксама фальклёрныя матэрыялы.

**Гридьки.** Составитель — Жук С., 2003

Гісторыя вёскі Грыдзькі Пастаўскага раёну, складзеная са словаў аднасяльчанаў жыхаркай вёскі. Цудоўны краязнаўчы летапіс, які будзе цікавы не адно былым, цяперашнім і будучым жыхарам гэтай вёскі, але і шырокаму колу чытачоў — і выкладзенымі зьвесткамі, і як прыклад прыватнага мікрагістарычнага дасьледаваньня штодзённасьці.

**О Рождестве Христовом. Религиозное издание.** Худ. А.Романовская — Менск.: Издательство Белорусского экзархата, 2006.

Добра праілюстраванае выданьне месьціць адаптаваную для дзяцей гісторыю нараджэньня Ісуса Хрыста.

**Цвид А. Подивинки Полісся (Записки просвітянина).** — Луцак: Волинська обласна друкарня, 2006. — 132 с.

Апошняя кніга ўкраінскага пісьменніка зь Берасьцейшчыны Антона Цвыда, пасьля ягонай сьмерці ўкладзеная і выдадзеная ягонай жонкай.

**КП**

# Каханка Свабоды

*Жанчынай не нараджаюцца,
ёю становяцца.*
***С. дэ Бавуар***

*Беларусам не нараджаюцца,
ім становяцца.*
***А. Каўка***

(да стагодзьдзя з дня нараджэньня Сымоны дэ Бавуар)



**Сымона дэ Бавуар і Жан Поль Сартр.**

9 студзеня 2008 году спаўняецца 100 год з дня нараджэньня Сымоны дэ Бавуар, францускай гуманісткі, філёзафа-экзыстэнцыяліста, пісьменьніцы, фэміністкі, будзіцелькі францускай лявіцы, адзінай таварышкі і вечнай спадарожніцы Ж.-П. Сартра, непапраўнай і перакананай атэісткі, аўтаркі шматлікіх мастацкіх, эпісталярных і эсэістычных твораў, у прыватнасьці, выбітнага і рэвалюцыйнага эсэ «Другі пол», забароненага Ватыканам і СССР, які дасюль ня мае беларускага перакладу. Кабеце, якая зыначыла мэнталітэт многіх французаў і нават многіх заходнікаў наагул, ужо сто год. Але і пасьля сьмерці (1986 год) эўрапейская інтэлектуалка вымушае пераглядаць і перачытваць, падаецца, вядомую гісторыю блізкага XX стагодзьдзя. І пасьля сьмерці скандальная аўтарка дорыць новыя скандалы, новыя дадзеныя з уласнага жыцьця і жыцьця Сартра, нібы сумысьля яна пакінула некалькі сакрэтаў сваім нашчадкам, каб і потым яны цікавіліся ёю. Маецца на ўвазе апублікаваньне іхнага даваеннага ліставаньня, а таксама зьяўленьне ўспамінаў пра іх у самым канцы XX стагодзьдзя, адкуль даведваесься, напрыклад, пра іхную татальную бязьдзейнасьць у час вайны ці пра гомасэксуальныя амурэты выбітнай жанчыны-філёзафа. Але ж, відаць, таму і назвалі іх «каханкамі свабоды». Праўда, сапраўднай каханкай свабоды зь іх дваіх была яна.

Ейнае імя вядомае, але ж ці нагэтулькі добра, як імя Сартра? Нават у Францыі вакол яе існуе процьма стэрэатыпаў: часьцяком у кнігах, артыкулах і чалавечай памяці цыркулюе стэрэатып пра тое, што дэ Бавуар — «жонка» і «пасьлядоўніца» Ж.-П. Сартра. Гэта, безумоўна, насьмяшыла б іх абаіх і скандалізавала б пісьменьніцу, якая ўсё жыцьцё паважала выбар іншага/іншай, а таму хацела, каб навакольныя паважалі і ейны выбар. А як вядома, яна выбрала ня шлюб, ня статус жонкі Сартра. Дарэчы, панятак «выбар» — ключавы ў разуменьні філязофіі і твораў пісьменьніцы. Вядомы пастулят экзыстэнцыялізму пра тое, што жыцьцё будуецца самім чалавекам, а само жыцьцё — адначасова просты і цяжкі выбар той ці іншай мадэлі існаваньня, знайшоў у жыцьці дэ Бавуар просты водгук. На ўласным экспэрымэнце яна прадэманстравала, што быць жанчынай, чалавекам, пісьменьніцай, францужанкай, парыжанкай, інтэлектуалкай досыць проста, калі заставацца рэалісткай і ўспрымаць жыцьцё не як падарунак ці выпрабаваньне, а як штодзённую будоўлю, штодзённы выбар паміж млявасьцю і актыўнасьцю, аўтэнтычным жыцьцём і ўцёкамі ад яго, апусканьнем у містыку, тлумачэньнем усяго ілюзіяй пад назовам «бог».

Нарадзіўшыся ў клясычнай буржуазнай, праўда, зьбяднелай, сям'і, яна зь цягам часу адчула гідоту да ўсяго сямейнага; зьбядненьне сям'і, на дзіва, выратавала яе, бо адвяло ад яе багатых прэтэндэнтаў, вымусіла яе выбраць навуку, зарабляць самой на жыцьцё, паказала ёй сапраўдны кошт і смак жыцьця. І яна выбірае свой шлях: замест сямейнага жыцьця — інтэлектуальнае, замест шлюбу яна падпісвае з Сартрам своеасаблівы віртуальны пакт пра партнэрства (пра каханьне і інтэлектуальную вернасьць). І гэты пакт застаўся сталёвым і непарушным да скону абаіх.

Што датычыцца філязофскай кар'еры, то трэба нагадаць, што яна была прафэсійным філёзафам — выкладчыцай, адной зь першых выкладчыцаў філязофіі ў Францыі, бо традыцыйна гэту дысцыпліну выкладалі мужчыны. Ейны ўплыў на разьвіцьцё «сартраўскага» экзыстэнцыялізму дасюль недаацэньваецца: яна ўсё яшчэ лічыцца ягонай «пасьлядоўніцай». Хаця ў першых сваіх раманах, якія, дарэчы, зьявіліся раней за Сартравыя філязофскія эсэ, Сымона дэ Бавуар разважае пра чалавечае жыцьцё і складае сваю карціну сапраўднага, «аўтэнтычнага» жыцьця, крытыкуючы фаталізм і прадвызначанасьць. У рамане «Ўсе людзі ўміручыя» яна цудоўна вызначыла праз мастацкія сродкі асноўныя пастуляты будучага экзыстэнцыялізму-сартрызму ці ўсё ж такі бавуарызму? Ды і сам Сартр, дарэчы, ніколі не хаваў уплыву дэ Бавуар

ар на свае ідэі, у адным з інтэрвію ён заўважыў: «Філёзаф — яна, ня я». Далей у аповесьці «Вельмі мяккая сьмерць» яна апісвае сьмерць маці, але разам з тым разьвітваецца зь ёю і навучае чытача прымаць сьмерць. Наагул пісьменьніца заўжды давала рады ствараць ня толькі якасныя мастацкія творы, але пры гэтым заўжды сацыяльныя і вытрыманыя ў духу экзыстэнцыялізму.

І, канечне, размова пра дэ Бавуар будзе няпоўнай, калі не прыгадаць ейнай рэвалюцыйнай ролі ў адраджэньні фэмінізму ў ХХ стагодзьдзі — гэта ейная заслуга. Хоць не яна вынаходніца фэмінізму, тым ня менш, на сучасным этапе менавіта яна надала яму вагі, увяла яго ў філязофскае рэчышча, стала асноўным тэарэтыкам сучаснай фэміністкай думкі. Хаця, як зазначала сама філёзаф, яна не чакала скандальных водгукаў, калі пісала «Другі пол», бо яна проста спрабавала, між іншага, на параду Сартра, патлумачыць жаночую загнанасьць і адсутнасьць у гісторыі. І ёй удалося гэта — на гэтым эсэ вырасьлі некалькі генэрацыяў францускіх кабетаў, якія так і называліся «генэрацыі Бавуар». Але ня толькі францужкі ўдзячныя ёй. Іншыя эўрапейкі і паўночныя амэрыканкі, калі твор зьявіўся на іншых мовах, пачалі з новай сілай змагацца за вызваленьне ад прыгнёту — палітычнага і побытавага адначасова. На жаль, для сучаснага беларускага інтэлектуала, асабліва, калі ён належыць да правіцы, панятак «фэмінізм» дасюль выклікае страх і чараду манструёзных клішэ. Але сучасная Эўропа, куды так імкнецца наша правіца — гэта ня толькі шчыт ад Расеі, але якраз цэлая мудрагелістая філязофія і лад жыцьця, якія варта навучыцца паважаць, бо яны будуюцца якраз і на моцных каштоўнасьцях гендэрнага раўнапраўя, да якога, дарэчы, спрычыненая ў першую чаргу выбітная француская мысьлярка.

Сымона дэ Бавуар ніякім чынам не зьвязаная зь Беларусьсю, хоць і вандравала яна шмат па СССР, калі яшчэ не лічылася ворагам сацыялізму. Яна пакінула ўражаньні пра вандроўкі ў Прыбалтыку, ва Ўкраіну, у краіны Закаўказьзя і Сярэдняй Азіі — ніводнага слова пра Беларусь. Тым ня менш, ейную літаратурную і філязофскую спадчыну, хаця яна, збольшага, і невядомая беларусам, чужынскай не назавеш, бо традыцыя атэістычнага экзыстэнцыялізму нейкім дзіўным чынам вядомая беларусам. Прыгадайма хаця б раманы Кузьмы Чорнага ці пазьней Васіля Быкава. Творы першага напісаныя да зьяўленьня францускіх атэістычных экзыстэнцыялістаў, тым ня менш, яны прасякнутыя падобнымі ідэямі і каштоўнасьцямі жудаснага, штодзённага, але і непаўторнага існаваньня. Творы Быкава таксама любяць зьвязваць з экзыстэнцыялізмам — і сапраўды, карціна сьвету Быкава і праблема заўсёднага і складанага выбару ягоных герояў падобныя да карціны сьвету і праблемы выбару ў Бавуар.

Пісьменьніцы няма, яна больш за дваццаць год спачывае на могілках — і зноў у кампаніі Сартра, у любым Парыжы, застаўшыся да апошняй кропкі вернай сваім прынцыпам і каштоўнасьцям, а галоўнае — жаданьню быць чалавекам вольным і слабым, але чалавекам самастойным, будаўніком свайго жыцьця, які не абапіраецца на кульбаку, падстаўленую, як для многіх, богам. Да сконy Сымона дэ Бавуар ня здрадзіла сябе, Сартра, іхнюю супольную філязофію, іхны непарушны пакт, засталася каханкай свабоды, тады як ейны спадарожнік — выбітны Сартр — перад сконам пад уплывам свайго прыёмнага сына пачаў вагацца і сумнявацца ў іхнай філязофіі жыцьця і шчасьця. З горыччу прыняла гэта філёзаф, але ведала, што ў тым і заключаецца свабода чалавека — у здольнасьці памыляцца…

**Гарбацкі Ўладзь**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

# Новыя манаграфічныя выданьні па гісторыі Беларусі

**Бразгуноў А. Перакладная белетрыстыка Беларусі XV—XVII ст. / Навук. рэд. В.Чамярыцкі. Менск: Беларуская навука, 2007. 302 с.**

Вось якія папулярныя жанры старабеларускай перакладной літаратуры дасьледуе аўтар — рыцарскія раман і навэля, гістарычны раман і аповесьць. «Трышчан», «Александрыя», «Атыла», «Рымскія дзеі» і інш. разглядаюцца ў супастаўленьні зь іх эўрапейскімі крыніцамі. Сьвецкія гістарычны і рыцарскі перакладныя раманы «ўраўнаважылі» ў прыгожым пісьменстве Беларусі XV—XV ст. шырокую плынь літаратуры рэлігійнага зьместу.

**Дук Дз. Полацак XVI—XVIII ст.: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыцьцёвай прасторы насельніцтва беларускага гораду. Наваполацак: ПДУ, 2007. 268 с.: іл.**

Абгрунтоўваючы абраны храналягічны пэрыяд сваёй працы, аўтар канстатуе: «Раньні Новы час зьяўляецца пераломным у палітычным, эканамічным, і, як наступства, культурным жыцьці гораду. Менавіта ў гэты пэрыяд Полацак з квітнеючага і самага вялікага пасьля Вільні гораду Вялікага Княства Літоўскага, сталіцы намесьніцтва і ваяводзтва, пераўтвaрыўся ў павятовы горад у складзе Расейскае імпэрыі».

**CD: The 5th International Conference «History and Archeology of Polotsk and Polotsk Land». Polotsk National Historical Cultural Muzeum-Reserve, 2007.**

[V Міжнародная канфэрэнцыя «Гісторыя і археалёгія Полацку і Полацкай зямлі». Полацкі нацыянальны гісторыка-культурны музэй-запаведнік, 2007.]

Кампакт-дыск, які выйшаў напярэдадні V Міжнароднай канфэрэнцыі, утрымлівае электронныя копіі зборнікаў папярэдніх чатырох канфэрэнцыяў 1987, 1992, 1997 і 2002 г. Добрая дапамога для спэцыялістаў. На дыску таксама зьмешчана слайд-шоў пра Полацак. Інтэрфэйс у трох мовах — беларускай, расейскай, ангельскай. Хоць вокладка выкананая ў ангельскай мове.

**Марзалюк, І. Этнічны і канфэсійны сьвет беларускага гораду XVI—XVIII ст. (Этнаканфэсійны склад насельніцтва, этнічныя і канфэсійныя стэрэатыпы беларускіх гараджан). Магілёў: МДУ імя А. Куляшова, 2007. 164 с.**

Новая праца магілёўскага гісторыка і археоляга стала працягам ягонай папярэдняй кнігі — «Людзі даўняй Беларусі: этнаканфэсійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X—XVII ст.)» (Магілёў, 2003), якая выклікала немалы розгалас сярод гісторыкаў. Свой аналіз мэнтальнай адметнасьці гарадзкой цывілізацыі аўтар праводзіць асобна для двух гістарычных рэгіёнаў даўняе Беларусі — Літвы і Русі. Дыскусіі тае эпохі працягваюцца і сёньня.

**Алег Дзярновіч**

# Гарэлка



Ад акавіты да вадкіх грошай. Піша **Алесь Белы**.

Гарэлка зьявілася ў ВКЛ на мяжы XV—XVI ст. зь Нямеччыны, як сьведчыць і пачатковая назва — «вино горелое» (калька зь нямецкага Geprant Wein). Падобным чынам гарэлка называецца ва ўсіх народаў, што ўваходзілі ў Рэч Паспалітую — палякаў (gorzałka), украінцаў (горілка), літоўцаў (degtine). Праўда, у Польшчы цяпер значна больш пашыранае пазычанае ў расейцаў слова wódka. Да сёлетняга вэрдыкту Брусэля Польшча і Фінляндыя някепска зараблялі, карыстаючыся тым, што толькі напоі, атрыманыя са збожжа або бульбы, мелі права называцца на эўрапейскім рынку *vodka'й*, але лабісты масавых вытворцаў, якія гоняць алькаголь з чаго заўгодна, дамагліся скасаваньня ўсялякіх абмежаваньняў, і цяпер «водку» ў Эўропе можна рабіць зь любой арганічнай сыравіны.

Да XVII ст. гарэлка была адносна дарагой і маладаступнай, аднак па меры адноснага зьмяншэньня выдаткаў на яе вытворчасьць пачала паступова выцясьняць *піва* і асабліва *мёд пітны*, з канца XVII — пач. XVIII ст. заняўшы месца асноўнага алькагольнага напою. Рытуальная роля гарэлкі ў традыцыйных абрадах беларускага сялянства (вясельле, памінкі ды інш.) усталявалася параўнаўча нядаўна, прыкладна з XVIII ст., у глыбокай старажытнасьці яе адыгрывала піва. На прыкладзе дынамікі цэнаў у актавых кнігах магілёўскага магістрату бачны гэты паступовы працэс замены піва гарэлкай. Напрыклад, у 1710 г., калі Магілёў быў пакараны расейскім войскам за прыхільнае стаўленьне да швэдаў, у параўнаньні з 1697-м, суадносіны цаны гарэлкі й піва зьмяніліся ад 11:1 да 7:1 (на фоне таго, што цэны амаль на ўсё — хлеб, цукар, піва, боты — вырасьлі ўдвая, а заробак меней як на 20%). Сытуацыя, досыць падобная на сёньняшнюю Беларусь. Гэта значыць, што магілёвец стаў больш піць, стаў менш падобны да нямецкага бюргера, а болей на «порядочного русского мастерового», апісанага Гогалем.

У залежнасьці ад ступені дыстыляцыі мацунак гарэлкі вагаўся ад 15—20% (г.зв. «простая») да *акавіты* (каля 70%). У сучаснай беларускай папулярнай гістарычнай літаратуры акавітай часта называюць старадаўнюю гарэлку ўвогуле, але гэта не зусім карэктна. Агульнаэўрапейскім тэрмінам aqua vitae («вада жыцьця») з XIII ст. называлі гарэлку або вінны сьпірт, атрыманыя праз дыстыляцыю віна, пазьней таксама гарэлку з соладу, збожжа, мукі ды інш. У кельцкіх народаў скарочаны паслоўны пераклад лац. выразу «вада жыцьця» — *uisce beatha*с — стаў назвай нацыянальнага моцнага напою зь ячменнага соладу — віскі. Дарэчы, спачатку гарэлку, як і віскі, гналі пераважна з соладу, толькі не зь ячменнага, а з жытняга.

У сучасных скандынаўскіх краінах акавітай называюць моцную гарэлку (як правіла, з жыта), часам араматызаваную невялікай колькасьцю кмену, якую прынята піць зь невялікіх (50 г.) кілішкаў адным глытком. Такая гарэлка досыць блізкая да нашых старадаўніх узораў, але, на жаль, у нас не вырабляецца. Да сярэдзіны XX ст. ужываўся старадаўні жартаўлівы беларускі тост:

— Як ты называесься ?
— Акавіта.
— А з чаго ты ?
— З жыта.
— Пашпарт ёсьць ?
— Няма.
— Вось табе турма !
(пасьля чаго акавіту выпівалі).

Пачаткова акавіта ўжывалася як аптэчны сродак (найчасьцей для настойваньня зёлак і г.д.). Папулярнымі сярод шляхты былі розныя напоі — лікёры, настойкі і наліўкі на аснове гарэлкі, з дадаткам зёлак, мёду, спэцыяў, ягадаў, цукру — зуброўка, крупнік, крамбамбуля, траянка і г.д. Гарэлка з чыстага жытнёвага сьпірту, вытрыманая ў дубовых бочках на працягу 5—10 гадоў, называлася *старка*. Яна мела сьветла-бронзавы колер, падобны да віскі. Самай славутай у Рэчы Паспалітай лічылася гданьская гарэлка, або «залатая вада» (wódka gdańska, Goldwasser), традыцыйная настойка на зёлках і карэньнях. Апроч таго, у кожнай пляшчы плавала некалькі лісткоў тонкай залатой фольгі. Гданьскай гарэлцы прыпісваліся лекавыя і ледзь не цудатворныя ўласцівасьці. Шматвекавая слава гарантавана забясьпечыла ёй месца ў энцыкляпэдычнай паэме А.Міцкевіча «Пан Тадэвуш»:

Судзьдзя шкатулку ў гонар той аблавы
Дастаў, адкрыў, і пляшак бліснулі галовы.
Ён выняў самы большы буталь адмысловы
(Багаты падарунак ад ксяндза Рабака).
Гарэлка з Гданьска, дарагая для паляка.
«Няхай жыве!— сказаў Судзьдзя з паднятай чашай,—
Наш горад Гданьск, зноў быць яму ва ўладзе нашай!»

І па чарзе ўсім наліваў лікёр срабрысты.
Пакуль дно залатым не заблішчала лістам.

Асноўнай сыравінай для вырабу гарэлкі доўгі час было жыта, у т.л. солад, аднак з 1830-х сьпірт і гарэлку пачалі атрымліваць пераважна з бульбы, што рэзка зьнізіла яе сабекошт, а разам з тым і якасьць (гарэлку з бульбы цяжэй ачысьціць ад сівушных алеяў). У XIX ст. вытворчасьць гарэлкі была асноўнаю галіной харчовай прамысловасьці Беларусі, прыносячы вялікія прыбыткі вытворцам і дзяржаўнаму скарбу. Сотні дробных бровараў, пераважна з 4—5 працаўнікамі і гадавой вытворчасьцю каля 10 тыс. вёдраў (120 тыс. л) існавалі амаль у кожным буйным маёнтку. Падаткавая палітыка расейскага ўраду стымулявала перавагу гарэлкі над усімі іншымі алькагольнымі напоямі. У 1859 г. 46% прыбыткаў дзяржаўнага бюджэту Расіі давалі падаткі ад продажу і вытворчасьці алькагольных напояў (у асноўным гарэлкі), а ў Гарадзенскай губэрні на іх долю прыпадала 55% дзяржаўных прыбыткаў.

У канцы XIX ст., калі ў расійскай мове канчаткова замацавалася слова «водка», у Беларусі выраблялася больш за 16 л. гарэлкі на чалавека штогод. З 1894 г. у Расійскай Імпэрыі існавала дзяржаўная манаполія на продаж гарэлкі, з 1914 г. дзейнічаў «сухі закон», аднак у 1923 г. савецкі ўрад быў вымушаны ізноў легалізаваць гарэлку. Падчас абедзьвюх усясьветных войнаў гарэлка ў Беларусі набыла статус унівэрсальнага эквіваленту, свайго кшталту «вадкіх грошай», які захоўваўся праз усю савецкую эпоху.



# Самагон

Пакуль міліцыя выдумляе новыя прыстасаваньні для выкрыцьця самагоншчыкаў, хітрыя беларускія вяскоўцы працягваюць гнаць гарэлку. Такія апараты вы знойдзеце амаль у кожнай заходнебеларускай вёсачцы (на ўсходзе менш, там народ чамусьці аддае перавагу хімікатам, якія празвалі «максімкам»).

Сам працэс займае 5-6 гадзінаў і патрабуе значных фізычных высілкаў. З 200 літраў брагі (мука з дрожжамі) выходзіць 15-20 літраў самагонкі. Вяскоўцы настойваюць яго на зёлках і каранях, у кожнай сям'і свой рэцэпт, таму гарэлка ў розных рэгіёнах Беларусі розьніцца на смак.

Дарэчы, самагон выраблююць нават у Злучаных Штатах — там ён называецца «moonshine vodka» — «гарэлка, зробленая пры сьвятле месяца».

**Тэкст і фота Юліі Дарашкевіч**



## Кніга Белага па-беларуску й па-ангельску

**У траўні па-ангельску выйдзе кніга Алеся Белага «Беларуская кухня». Пра гэта паведамляе міжнародная бібліятэчная рассылка hippocrenebooks.com. Гэта — выдатнае дасьледаваньне па беларускай гісторыі і ежы, што зьведала габрэйскі ўплыў, — зазначаецца ў анатацыі.**

**Кніга ўключае разьдзелы пра закускі, супы, клёцкі, асноўныя стравы, дэсэрты, напоі, такія традыцыйныя беларускія стравы, як халаднік, гусь, фаршыраваная кашай і грыбамі, панцакі і калдуны, алькагольныя напоі ды інш.**

**Кніга Алеся Белага «Наша страва» выйдзе па-беларуску ў сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» ў красавіку.**

**Ул. інф.**


Карлаў мост прыносіць удачу

DBARCHITEKTURA.WEBZDARMA.CZ

# Легальная міграцыя — адкрыты шанец

**Ігар Л. нарадзіўся ў Беларусі. Скончыў фізыка-матэматычны факультэт аднаго з прэстыжных беларускіх унівэрсытэтаў. Пачаў займацца праграмаваньнем. Здольнасьці далі яму магчымасьць працаваць у розных краінах. Але ў 47 год ён усё ж такі вырашыў пасяліцца ў Чэскай рэспубліцы, скарыстаўшыся эміграцыйным праектам «Падбор кваліфікаваных замежных спэцыялістаў», які скіраваны на прыцягненьне ў Чэхію адмыслоцаў з-за мяжы. Ігар пагадзіўся адказаць на пытаньні нашага карэспандэнта.**

**— Калі Вы ўпершыню патрапілі ў Чэхію?**

— У сакавіку 2006 г. я прыехаў у Прагу на 10 дзён з турыстычнай групай. Але ў той час, калі ўсе астатнія наведвалі помнікі архітэктуры ды крамы, я імкнуўся больш даведацца аб эміграцыйным праекце, ну і, натуральна, разважаў аб тым, што, магчыма, менавіта ў гэтай краіне я б хацеў жыць. Ведаеце, калі я навучаўся ў Менску, у мяне былі аднакурсьнікі з Чэхіі. Яны часта распавядалі пра сваю радзіму, і гэта, канечне, мяне зацікавіла. Але ў Прагу я патрапіў толькі праз 20 гадоў. Адначасова я ўсьвядоміў, што калі ня буду імкнуцца знайсьці за мяжой хаця б часовую працу, то ніколі не пабачу сьвет.

**— Што паўплывала на Вашае канчатковае рашэньне аб удзеле ў гэтым чэскім праекце?**

— Я працаваў у Нямеччыне, потым у Дамініканскай рэспубліцы і Злучаных Штатах. Трэба сказаць, што з усіх краінаў, якія я наведаў, Чэхія мне падабаецца больш за ўсё. Я атрымаў некалькі прапановаў наконт працы зь іншых краінаў, напрыклад з Ірляндыі, але ў рэшце я вырашыў скарыстаць магчымасьць жыць і працаваць у Чэскай рэспубліцы. Я пераехаў у Чэхію ў сярэдзіне жніўня 2006 г. Калі б у мяне не было досьведу працы ў амэрыканскай кампаніі, то пачынаць было б нашмат больш складана. Уласна кажучы, я ўступіў у добра вядомае асяродзьдзе транснацыянальнай кампаніі і фактычна ня мусіў вучыцца новаму. Натуральна, акрамя спэцыялізацыі. Я ўсьвядоміў, што ў Злучаных Штатах жыць не магу. У мяне іншы характар, і я ня мог бы пастаянна жыць у грамадзтве, якое арыентаванае толькі на грошы. А чэскі мэнталітэт беларускаму вельмі блізкі. Я атаясамляю сябе зь імі.

**— Што было асноўнай прычынай Вашага ад’езду зь Беларусі ў Чэхію?**

— Асабіста для мяне гэта было складанае пытаньне. Не магу сказаць, што ў Беларусі ў мяне былі кепскія працоўныя месцы. Справы ішлі няблага, але я адчуваў, што не магу разьвіваць свае здольнасьці і не магу вывучаць усё новыя і новыя рэчы, якія патрэбныя для маёй працы. Я адчуваў, што ў сваёй сфэры магу страціць кантакт з эўрапейскімі спэцыялістамі, што праз нейкіх 10 год я б адстаў і стаў бы нікому не патрэбным. Мне пашанцавала, што я мог працаваць ня толькі ў Нямеччыне, але і за акіянам. Там я пабачыў сучасны ўзровень і магчымасьці навукі. Гэта прафэсійны бок. Але былі, натуральна, і эканамічныя прычыны. Хто б не разгледаў гэтае пытаньне?

**— Як Вы даведаліся аб эміграцыйным праекце «Падбор кваліфікаваных замежных спэцыялістаў»?**

— Наколькі памятаю, упершыню я прачытаў пра яго на інтэрнэтавых старонках tut.by. На той час ужо чатыры гады ў Чэхіі жылі мае сябры, так што яны мне спачатку дапамаглі зарыентавацца ў тым, да каго зьвярнуцца і г.д. Мне параілі, на якіх сайтах шукаць працу, іх досьвед дапамог мне разьлічыць выдаткі на жытло. Яны прыехалі ў Чэхію з сваёй ініцыятывы. Мне было прасьцей дзякуючы гэтай праграме. Яны таксама далучыліся да яе, але здолелі ня ўсе.

**— Як у Вас пачыналася жыцьцё ў Чэскай рэспубліцы?**

— У параўнаньні зь некаторымі землякамі, якія жывуць у Чэхіі, мне пашэнціла, бо ў мяне вельмі хутка атрымалася знайсьці працу і жытло. Калі я сюды патрапіў, то амаль адразу ж пайшоў пагладзіць скульптуры сьвятых на Карлавым мосьце. Я ведаў, што гэта традыцыя. Трэба сказаць, што мне гэта дапамагло (сьмяецца).

**— Не сумуеце па радзіме?**

— Натуральна, мяне цікавіць, што там адбываецца. Але я лічу сябе «грамадзянінам сусьвету» і ў гэтай ролі адчуваю сябе камфортна. Але я разумею людзей, якія сумуюць па Беларусі. Калі хочаш вярнуцца, то гэта магчыма зрабіць заўсёды. Я без праблемаў магу езьдзіць у Беларусь і еджу туды даволі часта. Цяпер мае абодва сыны ўжо дарослыя, адзін вучыцца ў Менску, другі — у Нямеччыне. Бачымся мы часта. Нямеччына і Менск ня так далёка, каб мы не маглі сустракацца. Я пляную, што да мяне пераедзе мая жонка, і цяпер мы якраз гэтым займаемся.

**— Ці былі ў Вас нейкія праблемы, калі зьбіралі неабходныя дакумэнты для сваёй жонкі?**

— Натуральна, на гэта патрэбны час. Але ў параўнаньні зь іншымі краінамі гэта ня так ужо і складана. А тыя некалькі гадзінаў, якія мусіце выстаяць у чарзе ў паліцыі для замежнікаў, у параўнаньні з вынікамі не такая ўжо вялікая перашкода. Канечне, гэта нялёгка. Самым складаным было знайсьці для яе працу і сабраць усе неабходныя дакумэнты. Я бачу праблему ў тым, што калі яна страціць працу, то ёй будзе складана знайсьці іншую і зноўку сабраць усе неабходныя дакумэнты. Мая жонка не далучаная да гэтага праекту. Я, як удзельнік праекту, у тым выпадку, калі страчу сваю працу маю права на 45 дзён ахоўнага тэрміну для пошуку новай працы. Заўсёды знойдзецца нейкае рашэньне. Толькі нельга дазволіць, каб падобныя складанасьці вас перамаглі.

**— Яшчэ ня так даўно казалі аб тым, што ў Чэскай рэспубліцы ўсё вельмі дорага ў параўнаньні зь Беларусьсю. Як Вы гэта адчуваеце?**

— Я спачатку таксама так думаў. Але за апошнія некалькі год, на маю думку, гэта выраўнялася. Кошты харчоў у Менску і ў Празе амаль аднолькавыя, у Празе, можа, нават і крыху таньней. А калі параўнаць зь сярэднім заробкам, то ў Чэхіі ўсё ня так і дорага, да таго ж і выбар большы.

**— Ці ёсьць у Вас праблемы з чэскай мовай?**

— Трэба прызнацца, што ёсьць. Чэскую мову ведаю вельмі кепска. Галоўным чынам гэта выкліканае тым, што на працы я размаўляю па-ангельску, а са знаёмымі — па-ангельску альбо па-расейску. Пастаянна сам сабе паўтараю, што мушу вывучыць мову, але рукі пакуль што не даходзяць.

**Праект рэалізуецца:** Міністэрствам працы і сацыяльных справаў Чэхіі

**Праект дае магчымасьць**: атрымаць дазвол на пастаяннае месца жыхарства ў Чэхіі праз **1,5 — 2,5 гады** (замест 5 год у адпаведнасьці са стандартнай працэдурай)

Патрабаваньні да кандыдатаў:

— наяўнасьць легальнай працы ў Чэхіі (**пошук працы ажыцьцяўляецца самастойна**);

— 25 і больш балаў па крытэрах падбору (адукацыя, узрост, сямейны стан, валоданьне мовамі і г.д.)

**Падрабязная інфармацыя:**

афіцыйная старонка праекту: www.imigracecz.org

інфалінія Прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Рэспубліцы Беларусь: (8 029) 33 33 031

### Чалавек умёрз у лёд

Трагедыя здарылася ў Гомелі. Рыбак трапіў у ваду, замёрз. Ягонае цела знайшлі ў глыбе лёду на адным з кар'ераў.

### Ізноў беларус забіты ў Расеі

На тэрыторыі складзкога корпусу ЗАТ «Нарт» на Сафійскай вуліцы, каля №24/7, знойдзены труп грамадзяніна Беларусі Сяргея Доды. Цяпер сьледчыя чакаюць заключэньне спэцыялістаў, якія робяць ускрыцьцё. 33-гадовы Дода быў камэрсантам і ў Пецярбург прыбыў зь дзелавой мэтай.

### Жанчына абліла каханку мужа кіслатой

4 гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчую ўстанову атрымала жыхарка Баранавічаў. Прыйшоўшы з працы, яна застала ў сваім ложку ня толькі мужа, але і аголеную маладую жанчыну. Раззлаваная кабета ўзяла на кухні бутэльку кіслаты і давай паліваць ёй госьцю. У выніку тая трапіла ў бальніцу.

### Чарга перад польскім консульствам у Менску засталася

Нягледзячы на павышэньне цэнаў на візы, перад консульствам Польшчы ў Менску ўсё адно стаіць вялікая чарга, а людзі запісваюцца ў адмысловы сьпіс, каб патрапіць на прыём. У сьпісе каля сямісот просьбітаў. Кожная асоба са сьпісу павінная штодзённа прыходзіць а 14 гадзіне на пераклічку. Людзі бавяць у чарзе па два—тры тыдні, а консульскія работнікі разводзяць рукамі: маўляў, яны нічога ня могуць зрабіць.

### Пагоня на вуліцах Сьветлагорску

1 студзеня вуліцы Сьветлагорску нагадвалі сцэны з амэрыканскага баевіка. Па вуліцах гораду на вялікай хуткасьці насіўся аўтамабіль «аўдзі». Яго даганяла міліцыя. Гэта цягнулася больш за гадзіну. Нарэшце «аўдзі» не ўпісаўся ў паварот і вылецеў з узбочыны. Кіроўцу ўрэшце затрымалі.

### Падлетак выратаваў прэзыдэнта

Жыцьцё прэзыдэнта Мальдываў, на якога быў зьдзейсьнены замах, выратаваў хлопчык, які перахапіў у зламысьніка нож.

Замах на 70-гадовага прэзыдэнта Маюма Абдул Гаюма быў зьдзейснены падчас публічнага выступу палітыка. Невядомы, які выскачыў з натоўпу з нажом у руцэ, паспрабаваў пырнуць Гаюма ў жывот. Але 15-гадовы хлопчык адрухова перахапіў нож. Гаюм не пацярпеў падчас інцыдэнту, а вось юнак быў дастаўлены ў шпіталь з парэзамі на руках.

Пасьля спробы замаху прэзыдэнт выступіў па радыё са зваротам да народу, у якім падзякаваў падлетку, а грамадзян заклікаў да спакою.

Гаюм кіруе Мальдывамі з 1978 г. Мальдывы — дзяржава на выспах у паўночна-заходняй частцы Індыйскага акіяну. Плошча — 298 кв. км, насельніцтва — 290 тыс. чалавек.

### Невыязныя беларусы яшчэ могуць выехаць праз Расею

Наяўнасьць у пашпарце беларуса дазвольнага штампа на выезд расейскія памежнікі ўжо не правяраюць, а сьпісу невыязных у іх няма, — так сьцьвярджае Эўрапейска радыё для Беларусі.

### Іранскія катэры пагражалі ўзарваць амэрыканскія караблі

Уначы з суботы на нядзелю пяць іранскіх хуткаходных катэраў правакавалі тры вайсковыя караблі ЗША, неаднаразова набліжаліся да іх і перадавалі па радыё, што маюць намер іх самабойча ўзарваць. Некаторыя аглядальнікі пішуць, што такім чынам іранцы проста правакуюць рост цэнаў на нафту, ад чаго Іран як нафтавая дзяржава мае зыск.

### 730 тыс. даляраў за беларуса

Нямецкі клюб «Гамбург» набыў у менскага «Дынама» паўабаронцу моладзевай зборнай Беларусі 20-гадовага Антона Пуцілу. Угода абышлася нямецкаму клюбу ў 500 тыс. эўра. На гэтым тыдні футбаліст павінен прыбыць у новы клюб, а ўжо 7 студзеня ён адправіцца з асноўным складам «Гамбургу» на збор у Дубаі.

### Чарговы дыктатар у Гаазе

Гэта былы прэзыдэнт Лібэрыі Чарлз Тэйлар, які абвінавачваецца ў ваенных злачынствах, парушэньнях міжнароднага гуманітарнага права і злачынствах супраць чалавечнасьці. Тэйлар стаў першым лідэрам афрыканскай дзяржавы, якога судзіць міжнародны трыбунал у Гаазе.

### Латвійскія чыноўнікі падраблялі беларусам пашпарты

Гаворка ідзе ня проста пра падробку дакумэнтаў — дадзеныя уладальнікаў пашпартоў уводзіліся ва ўсе рэгістры й электронныя сыстэмы дзяржавы. Паліцыя бясьпекі Латвіі аб'явіла пра раскрыцьцё злачыннай сеткі, якая складалася ў асноўным зь дзяржаўных урадоўцаў. Пад падазрэньнем знаходзіцца 19 супрацоўнікаў Упраўленьня грамадзянства й міграцыі Латвіі, гаворыцца ў прэсавым рэлізе МУС краіны.

### Азаранка атрымала траўму

Траўмай мышцы правага сьцягна скончыўся 7 студзеня для беларускай тэнісісткі Вікторыі Азаранкі матч турніру ў Хобарце (Аўстралія) супраць суайчыньніцы Вольгі Гаварцовай. У сусьветным рэйтынгу гульцоў наша мілая суайчыньніца ўзьнялася з 30-га на 26-е месца, паўтарыўшы найвышэйшае дасягненьне ў сваёй кар'еры.

**Буг; паводле БЕЛТА, «Прессбол», BBC, Фонтанка.Ру, Эўрапейскае радыё для Беларусі, Беларуская служба Польскага радыё**

# Падарунак для Дзеда Мароза

Тацяна Барысік. Апавяданьне

Гэта быў вечар напярэдадні школьнага Навагодняга ранішніку. Як звычайна, я распаліла ў грубцы і, замест таго каб легчы адпачыць, пачала праглядаць сцэнар заўтрашняга сьвята. Трашчалі паляніцы, застылая за дзень халупа паціху награвалася.

Я амаль беспасьпяхова змагалася з жаданьнем паспаць і ў чарговы раз шкадавала пра тое, што праз тры дні Новы год, а ня Радаўніца. Радаўніца зрабілася маім улюбёным сьвятам з тае пары, калі мяне, як кажуць настаўнікі, «дагрузілі» паловай стаўкі арганізатара.

На Радаўніцу з радзінай стрэнесься, на могілках пасядзіш, чарку вып’еш — вось і ўсё. Аніякага клопату! Ня трэба пісаць сцэнараў, шукаць магнітафон, пільна сачыць, каб ён ня змоўк у самы адказны момант. Ня трэба баяцца, што імпрэзу не ўпадабае дырэктар школы і цябе пазбавяць прэміі.

Леташняя Елка выйшла ня надта відовішчнай. Дырэктар папракаў за гэта ранейшага арганізатара ажно да Першамаю.

Хаця б цяперака ўсё прайшло гладка. Сцэнар сьвята я напісала па-беларуску. Школа была зь беларускай мовай навучаньня, пазаклясныя імпрэзы я ладзіла таксама на роднай мове. Усе прызвычаіліся.

Беларуская Елка вялікім дзівам ня сталася. Калегі падтрымлівалі, вучні навыперадкі прасіліся ўдзельнічаць.

Знайшлі і Сьнягурку, і злодзеяў, і карагоды павывучвалі.

Толькі вось Дзеда Мароза не было. Сёлета ніхто зь нешматлікіх хлопцаўстаршаклясьнікаў на гэтую ролю не пагадзіўся. Хто баіцца, хто словаў ня можа запомніць. Сядзець пад елкаю і падказваць — значыць ізноў раззлаваць дырэктара.

Тады Дзедам Марозам прапанавалі абраць мяне. Я згадзілася. Чорт яго бяры, іншага выйсьця ўсё адно няма. Спакайней будзе. Урэшце, жанчына ў ролі Дзеда Мароза, яшчэ з часоў майго дзяцінства — шараговая зьява, куды больш звыклая, чым Елка пабеларуску ў беларускай школе.

Гадзіньнік паказваў сем гадзінаў — час ісьці па малако. Я хуценька прабегла вачыма словы Дзеда Мароза і пачала апранацца.

У суседзяў за сьцяною ізноў усчалася сварка.

— Колькі можна есьці! Усё жарэш і жарэш! Трэба ж меру знаць! — раўла баба Сямёніха.

— І тут не ўгадзіў! Ага, я ж навалач, а вы тутэйшыя, — не саступаў яе разьюшаны зяць Вова на мянушку Малдаван.

Я ня стала слухаць працягу, узяла торбу і выбегла на вуліцу.

Ліхтары не гарэлі. Добра, сьнег выпаў, а то хоць вока выкалі.

На паўдарозе, непадалёк ад крамы, я заўважыла старую. Трымаючыся за плот, яна паўзла па сьнезе. Сівыя валасы распатлаліся, рукі імкнуліся ўхапіцца за штыкеціну.

З усяго відаць — кепска чалавеку. Я падбегла бліжэй і аслупянела: старая была абутая толькі ў адзін бот, а другая нага босая, нават без панчохі. Белы сьняжок навокал!

— Дзе вашая хата?

Бабка спрабавала нешта патлумачыць, але язык ня слухаўся. Толькі страшэнна патыхала перагарам, набралася як бэля. Гукамі і жэстамі яна ўсё-такі паказала кірунак хады. Я пагрузіла бабку на ганак роднай хаты, адчыніла дзьверы ў сенцы і рушыла далей.

Малако я купляла ў Мацюшэўскіх, што жылі ў доме з экзатычнай мянушкай — ЛТП.

Калісьці тут сапраўды месьцілася ЛТП. Пасьля ўстанову зачынілі, кватэры раздалі людзям.

Дом меў два паверхі і два пад’езды і быў збудаваны на балоце. Адсюль неверагодная вільгаць на першым паверсе, зьедзеныя грыбком, аж чорныя, рамы на вокнах, камар’ё ў трубах да зімы вядзецца.

Якраз у такой кватэры і пашчасьціла жыць Мацюшэўскім. Гаспадыні — Ніны — дома не было, даіла карову. Яе сям’я ў поўным складзе глядзела тэлевізар. Паказвалі КВК, выступ студэнцкіх камандаў. Нейкі лысаваты дзядзька, з выгляду 20 гадоў як не студэнт, лётаў па сцэне і мармытаў жарт, які аскомы нагнаў:

— Лінолеюм, міленіюм!

Маладым надакучыла, старэйшыя не разумелі.

— У гэтага пердзела старога мусі ўнукі ўжо ёсьць, а ён усё маладым прыкідваецца, — пачуўся голас гаспадара, Сяргея Мацюшэўскага.

— Няхай бы лепш унукаў гадаваў, чым дзяцініўся, — падтрымала бацьку дачка Іра.

Вось праз такіх зьдзяцінелых дзядзькоў Дзед Мароз ператварыўся ў жанчыну, — падумалася мне.

— Гэты бязьмен тут выдурняецца, а Дзеда Мароза даводзіцца граць дваццацідвухгадовым дзяўчатам.

У кватэру ўвалілася Ніна з даёнкаю і, не павітаўшыся, адразу пацікавілася ў мяне:

— Ты Аньку з другога пад’езду ведала?

— А што такое? — зь цяжкасьцю прыгадала я худзенькую, нязграбную постаць у зялёным палітоне.

За няпоўны год, што працую ў мястэчковай школе, шчэ не пасьпела ўсіх павывучваць.

— Сёньня хавалі. У хляве павесілася... Нібыта нармальная жэншчына, дарослых дзяцей двое, — працягвала Ніна.



**Тацяна Барысік**

жыве між вёскай Круглонева Бабруйскага раёну і Магілёвам, гадуе паўтарагадовае дзіця.

— Нашая Сьветка казала, што яна са сваім кавалерам нейкім пасварылася. А Кур'янчыкава нявестка бачыла, як яна плакала, калі ехалі ў машыне на працу, — уступіла ў гаворку Іра.

— Дурная баба, — буркнуў з кута Сяргей.

На адваротным шляху я сапраўды ўбачыла сьвежыя яловыя лапкі каля ганку ЛТП. Дзіўна, чаму не заўважыла адразу. Што й казаць — перадсьвяточны вечар! Лепей бы Радаўніца...

А назаўтра, нечакана для мяне самой, усё склалася інакш.

Калі б папрасілі ўзнавіць хроніку сьвята цалкам, я б, пэўна, ня здолела. Памяць захавала самыя яркія моманты, падобныя да ўспышкі фотаапарату, да мільгаценьня агеньчыкаў за шклом вечаровага аўтобуса.

Памятаю ўбраную Елку, паўнюткае фае местачкоўцаў — дзяцей і дарослых. Зайграла песьня:

— Прыйдзе зіма, і сьнежань лісьце заваліць сьнегам...

Выбеглі старшаклясьнікі ў карнавальных касьцюмах. Маленькія ў карагод пайшлі. Цудоўна! Чым больш карагодаў, тым мацней адчуваньне сьвята ў дзяцей — сьцьвярджала нашая завуч.

Я ўпотайкі назіраю за ранішнікам праз шчыліну ў дзьвярах кабінэту фізыкі і хвалююся. Пакуль усё добра.

Вучні малайцы, словаў ня блытаюць. І магнітафон малайчынка — шчэ ні разу ня змоўк. Дырэктар, задаволены, усьміхаецца. Там, у фае, Сьнягурка абвяшчае: «Злодзеі скралі мех з падарункамі ў Дзеда Мароза».

— Дзед Мароз! Дзед Мароз!

Усё, мой выхад.

— Я ішоў да вас з Усходу,
Ды з паўночнай стараны,
У Ляпляндыі далёкай,
Дзеткі, ўчора еў бліны!

А футра ў Дзеда Мароза аказваецца лёгкае, як сукенка. Дарэчы, я ўсё жыцьцё спачувала яму: даводзіцца парыцца і так у гарачай залі.

Ізноў карагод. Запальваюцца на Елцы агеньчыкі. А цяпер чытаньне вершыкаў. Нешта накшталт:

Что растёт на ёлке?
Шишки и иголки.

І так разоў пятнаццаць. Атрымаць падарунак ад дзядулі хоча кожнае дзіця. Усё нагадвае Елку ў сельскай мясцовасьці ў канцы пяцідзясятых.

І раптам — Максім Багдановіч. «Пагоня».

Ля елкі стаяла вучаніца пятай клясы Наташа. Яна таксама падрыхтавала верш для Дзеда Мароза.

Заля сьцішылася. Падабенства з ранішнікам канца пяцідзясятых імгненна зьнікла:

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, —
Ўспомню Вострую Браму сьвятую
І ваякаў на грозных канях...

Ад узрушэньня я шчэ мацней рукой сьціснула дзед-марозаўскі кій, змайстраваны з дрэўка піянэрскага сьцяга.

Адразу кудысьці адышлі падзеі ўчарашняга вечару: п'яная разутая бабка, ЛТП, Вова Малдаван, зьдзяцінелы кавээншчык...

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць...

Вось дык Наташа! Не паленавалася, знайшла і вывучыла. Упершыню за гэтыя два тыдні я не пашкадавала, што хутка Новы год, а ня Радаўніца. Я была перакананая — падарункі робіць Дзед Мароз, а выйшла — наадварот. Сьвята і мой дэбют прызналі выдатнымі, нават на ролю Дзеда Мароза ў мясцовы ДК запрасілі.

У жыцьці мястэчка, на жаль, асабліва нічога не зьмянілася.

Сьвежыя хвойкі на сьнезе шчэ не зьляжаліся. Надышоў яшчэ адзін вечар. Вуліцы безь ліхтароў, ЛТП, бязглуздыя жарты па тэлевізары, нават Воўка Малдаван зь цешчаю, здаецца, сварыўся. Ды я іх ня чула, сышоў адчай з душы, у сэрцы гучаў звонкі дзіцячы голас: «Максім Багдановіч. «Пагоня».





новае выданьне сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва»

# Ева Вежнавец Шлях дробнай сволачы

Ева Вежнавец — адзін з самых непаўторных празаічных галасоў сёньняшняй Беларусі. Яна піша па-жаночаму. Яна піша па-чарадзейску. Яе пяром прамаўляюць тыя, хто самі ня ўмеюць або ня хочуць трымаць пяро. Ад часу, калі ў першым нумары часопісу «ARCHE», у 1998 годзе выйшаў яе аповед «Мы два хохлікі», яна мае верных чытачоў.

«Шлях дробнай сволачы» — гэта першая кніга пісьменьніцы, што ўзрасла на Любаншчыне, а творча сфармавалася ў булёне менскай і варшаўскай багемы 90-х. Цяпер яна працуе ў Варшаве, а жыве ў беларускай культурнай прасторы.

пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў



# Казачка пра цмока Базылішка

Калядная казка. Запісалі яе **Сьцяпан Дзінь-Дзілевіч** і **Марынка Макаўка**.

І не сказаць каб даўным-даўно, а ўсяго гадоў так пяцьсот таму назад жыў у нас тут у Вільні цмок. Зваўся Базылішкам. Калісьці іх, гэтых цмокаў, многа вадзілася. А потым хто загінуў, хто ўцёк. Базылішак заставаўся апошнім. Уцякалі цмокі хто куды. Хто далёка за мора, ці яны там ацалелі — ніякага знаку няма. Іншыя ўцякалі ў другі бок, у дрыгву, у палескія балоты.

— Дарэмна, — казаў Базылішак, — яны і там вас дастануць, балоты асушаць і дастануць. Яны — гэта новыя жыхары, прыблуды. Называліся людзьмі, альбо чалавекамі. Раней такіх тут не вадзілася. Але вось прыйшлі, расьсяліліся, панабудавалі сваіх жытлаў, назвалі гэта горадам Вільняй і зусім жыцьця ня стала ранейшым жыхарам — зьвяр'ю, птаству ды рыбе. Найбольш цяжка давялося цмокам, бо яны былі самыя вялікія: не схаваесься нідзе. Спрабавалі цмокі з тымі прыблудамі ваяваць, але людцы аказаліся надта хітрушчымі, пераймалі ад цмокаў усе норавы ды білі тубыльцаў іхнай жа зброяй. Ваявалі цмокі зубамі ды кіпцюрамі — людцы парабілі сабе мячы і дзіды. Каб бараніцца, нарасьцілі цмокі на сабе панцыры — і людцы абляпілі сябе жалезнай лускаю. Спрабавалі цмокі паліць сваіх супернікаў агнём з пашчы — і гэтаму людцы навучыліся, плююцца агнём са стрэльбаў і гарматаў. Многія з гэных цмокаў адчаяліся ды кінуліся наўцёкі. Застаўся адзін Базылішак, які вырашыў змагацца да апошняга. Жыў Базылішак на беразе рэчкі Віленкі, непадалёк ад таго месца, дзе Віленка ўліваецца ў Вяльлю. Пячора ягоная мясьцілася на высокім, як бакшта, пагорачку. Суседнія горкі Туравая, Лысая і Крывая ўжо былі занятыя новымі жыхарамі, там высіліся іхныя замкі, і гэта ўсё людзі называлі вялікім і слаўным местам Віленскім. Змрочна паглядаў Базылішак на тую Вільню. А людзі са злосьцю і зайздрасьцю пазглядалі на гару Бакшанскую, яны б хацелі зьнішчыць цмока ды засяліцца на ягоным месцы. Насьпявала вялікая бойка. Апошняя і вырашальная.

Але сёньня быў яшчэ ціхі мірны вечар. Цмок сядзеў на сваім пагорачку разам зь сябром Чмялём. Яны хаця і выглядалі надта рознымі, але лічыліся найлепшымі сябрамі. Абодва любілі палётаць, пагойсаць высока ў небе. Абодва любілі пафарсіць яркімі адзёжкамі. Чмель быў апрануты ў вогненна-рудое футэрка, а Цмок меў бліскучую луску. На сонцы тая луска зіхацела ўсімі колерамі вясёлкі, а пры месячным сьвятле цмокава луска сьвяцілася жывым срэбрам. А яшчэ яны надта моцна любілі свой родны край і сваю свабоду. На гэтым і пасябравалі.

Цяпер Чмель бачыў, што сябар нейкі засмучаны, дык, каб разьвесяліць, клікаў Базылішка паляцець разам да аднаго недалёкага ляснога азярца. Там, маўляў, вадзіца — як гарбата, на дваццаці сямі зёлках настоеная. Напойчык той я называю тройчы дзіва — такі смак, такі водар, такі колер! А Цмок аднекваўся, ён болей любіў чыстую, белую вадзіцу зь Віленкі. А галоўнае, Цмок чакаў госьця і ня мог адлучацца з хаты.

— Я ж табе казаў, што яны, гэныя чалавечкі, пакралі ўсе нашыя знаходкі. Мы давай лётаць — і яны каней асядлалі, гойсаюць, што не дагоніш. Мы давай плаваць — а яны чоўны парабілі, і на вадзе нас дасталі. І вось чую я, што ўжо блізкі мой канец, зьляціць мая галава. А ведаеш, дружа мой малады, што можа зрабіць сапраўдны воін, якому адсеклі галаву? — запытаў Цмок.

— Дык што ж тут ужо зробіш, калі галаву адсеклі? — пытаньнем на пытаньне адказаў Чмель.

— Сапраўдны воін, якому адсеклі галаву, можа скрывіць страшную морду, каб сьмяротна напалохаць свайго суперніка. Дык вось, прыдумаў я навучыцца крывіць такую морду. Такую жудасную, што каб толькі глянуў і здранцьвеў твой вораг. А калі здранцьвее, замрэ, тады я яго лёгка цоп — і праглыну. Ну, а калі яны ўсё-ткі нешта прыдумаюць і мяне цопнуць, дык мне гэты фокус з мордай таксама спатрэбіцца. Запомняць мяне так, што і дзеці, і ўнукі будуць баяцца. Але пакуль у мяне такой жудаснай морды не выходзіць. Я ў лужыну пагляджуся — сьмех адзін, а ня морда. Дык я ўспомніў пра ваўка, усе ж баяцца ягонага ваўчынага пагляду. Я сёньня паклікаў яго да сябе — хай навучыць. Чакаю вось цяпер. Так што сёньня ўжо з табой нікуды не палячу.

— Ясна. Тады на заканчэньне гэтай сур'ёзнай размовы дазволь яшчэ адно пытаньне. Выбачай, можа, балючае. Але калі казаць, то ўжо казаць да канца. Ты не баісься? А калі сапраўды заб'юць?

— Не баюся. Я такі, што мне свабода — альбо сьмерць. І яшчэ адзін сакрэт скажу, чаму я сьмерці не баюся. Маю справу працягнуць мае нашчадкі. Бачыш во гэта? Думаеш, гэта проста гладкія каменьчыкі сярод хмызоў? Гэта гняздо з маімі яйкамі, яны тут грэюцца на сонейку. Зь іх, прыйдзе час, вылупяцца мае дзеці. Род Цмока Базылішка незьнішчальны!

— Чакай, як з такіх малых яйкаў могуць вылупіцца сапраўдныя вялікія цмокі?

— Прыйдзе час, ніхто ня ведае, калі ён прыйдзе, такі закон, але час той прыйдзе абавязкова — гэтыя яйкі пачнуць расьці. З тых вялікіх яек і вылупяцца сапраўдныя вялікія цмокі.

Іх размову перарваў шалёны парыў ветру.

— У-у-у-у, — завыла віхура.

— Во які вецер, — зьдзівіўся Чмель.

— Не, здаецца, гэта ня вецер, здаецца, гэта мой госьць, — адказаў Цмок.

— Угу-у-у-у, гэта я.

Каля Цмокавай пячоры зьявіўся Воўк.

— Здароў, браце,— сказаў Цмок госьцю, а сам цішком, хвастом нагарнуў лісьце на яйкі.

— Здароўце, землякі.

— Як пажываеш? — пытаецца Цмок госьця.

Той пачынае плакацца:

— Якое там жыцьцё, стары стаў, зубы раскрышыліся, няма як нават зайца за вуха ўкусіць.

— Дык гэта не бяды, давай я табе новыя ўстаўлю, залатыя, ведаеш, колькі ў мяне таго золата ёсьць? Я ж гэтых людцоў нямала пажэр, яны, моднікі, любяць паначапляць на сябе ўсякія залатыя цацкі. А яны ж неядомыя. Як злаўлю чалавечка, мяска ды костачкі зьем, а золатца сплюну. Во колькі набралася.

Давай, разяўляй тую пашчу, а ты, Чмель, ты меншы і спрытнейшы, устаўляй на месца.

І ў момант яны ўляпілі Ваўку і справа, і зьлева залатыя іклы. Воўк ашчэрыўся, зазірнуў у лужыну, як у люстэрка. Спадабалася.

— Ну што ж. Прыгожа. Чым магу аддзячыць?

— О, якраз такі можаш. Я рыхтуюся да бойкі з тымі прыблудамі, зь людзьмі. І трэба мне навучыцца крывіць страшную морду, каб ад аднаго майго пагляду зьмярцьвелі яны. А ў мяне не выходзіць. Дык я і паклікаў цябе, каб ты паказаў.

Воўк пасядзеў, падумаў, тады ашчэрыўся. Было не зразумела, ці гэта ён усьміхаецца, ці пагражае.

— Ты, можа, зьдзівісься, але я ня буду вучыць, як трэба вылупіць вочы ці высунуць язык. Давай я лепей навучу цябе, як трэба ўсьміхацца. Уяві сабе нашыя пушчы, дзе пасьцяцца незьлічоныя статкі такіх смачных дзікоў і аленяў. Вусны цмока пачалі расплывацца ў сытай, задаволенай усьмешцы.

— Успомні рэкі, дзе плюхаюцца такія смачныя самы ды стронгі. Успомні чыстае нашае неба, дзе лётаюць чароды тлустых апэтытных качак і гусей.

Цмокава морда засьвяцілася шчасьцем.

— А вось на пагорачку, каля сваёй пячоры сядзіш ты — гаспадар усяго гэтага багацьця. А вось побач яйкі, вялікія і гладкія. Вось там у сярэдзіне нешта пачало грукацца, вось пэнкнула шкарлупіна, і з твайго Цмокавага Базылішкавага яйка вылупіўся... чалавечак!

— Што! — морду Цмока перакасіла. Вочы ягоныя бліснулі такой злосьцю і гневам, што спапялілі б на месцы ўсякага. Воўк абачліва скочыў і схаваўся ў Цмокаву пячору і ўжо адтуль закончыў сваю навуку.

— Дык вось з такой мордай і выходзь на сваіх ворагаў. Як ты і хацеў, я цябе навучыў.

— Дзякуй. Але другі раз са мной так не жартуй. Заб'ю.

Пасьля гэткай навукі хеўра разьбеглася хто куды. Цмок заваліўся спаць у сваю пячору, Чмель паляцеў у сваю нару, а Воўк пабег да свайго логава, што знаходзілася на Воўчай Лапе.

— Дрэнь справы з нашым цмокам, — думаў ён па дарозе, — састарэў ён зусім, зьдзяцінеў. Мордачкі будзе крывіць. Хіба ж гэтым людзей пераможаш? Не, гэтых нічым не пераможаш. А раз так — сярод ваўкоў жыць, па-воўчаму і выць.

І ён зьмяніў кірунак бегу. На краі лесу ён адшукаў пень-выварацень. У пень быў уторкнуты нож. Воўк завыў, узьнялася віхура, і рэхам разьнесла гэты жудасны гук па навакольлі. Воўк пераскочыў цераз пень і абярнуўся ў чалавека — старога, патлатага ведзьмака ў ваўчыным футры і шапцы. Дастаў з пня нож, павесіў на поясе і пайшоў у Вільню. Прамінуў прадмесьце, падняўся на Замкавую гару, пастукаўся ў браму княскага замку. Князь упусьціў яго да сябе.

— Княжа! Ты прасіў мяне, каб я параіў табе, як перамагчы цмока. Дык вось, я прыдумаў. Цмока можа перамагчы толькі яшчэ больш моцны цмок.

— Дзе ж я табе яго вазьму?

— Стань сам.

— ???

— Жартую. Трэба зрабіць так. Вазьмі свой вялікі срэбны шчыт, нашмаруй яго да люстранога бляску і як выйдзеш біцца з цмокам, пакажы яму гэты шчыт. Цмок зірне на яго і ў люстэрку пабачыць злоснага вялікага цмока. Ад гэтага пагляду ён сам здранцьвее, а ты ў той момант адсячэш яму галаву.

— Цудоўна! Зараз жа гэта зраблю! А табе вось узнагарода — схадзі, пагуляй у карчме, — і насыпаў яму поўны кашэль талераў.

Вядзьмак-ваўкалак з удзячнасьцю прыняў княскую ўзнагароду і пайшоў выконваць загад. У карчме ён замовіў кварту медавухі і пачаў сам гуляць і ўсіх частаваць. Так гуляў ён аж да раніцы, а раніцай у карчму на пах медавухі прыляцеў Чмель. Той самы, наш знаёмы. Ён пачаў круціцца каля чаркі і рта Ведзьмака-выпівохі. І тут з жахам ён пазнаў залатыя зубы, якія ўчора сам жа і ставіў.

— Ты?!

— Я.

— Як ты мог?!

— А вось так, запраста. Паглядзеў я, што людзей не спыніць, і вырашыў — сярод ваўкоў жыць, па-воўчаму і выць, а зь людзьмі...

— Дык ты, можа, і пра цмока ўсё расказаў?!

— А што яго, старога, шкадаваць, ён усё роўна хутка здохне. І ты зараз здохнеш, вось прыхлопну цябе...

— Сам ты здохнеш, — Чмель стралою кінуўся проста ў рот Вядзьмаку і там уджаліў яго з усяе моцы ў самае горла. І хаця сам ён пры гэтым загінуў, але помста адбылася. Горла ў Ведзьмака распухла, дыханьне яму заняло, і ён задушыўся. Ніхто, праўда, на гэта не зьвярнуў увагі: падумалі, што проста ўпіўся і пад стол зваліўся.

А тым часам Князь ужо сабраў войска і выступіў на бойку з Цмокам. Апошнюю і вырашальную. Княскія гетманы і жаўнеры цягнулі гарматы, стрэльбы, мячы, дзіды, а Князь толькі пасьмейваўся. Ён жа меў яшчэ больш магутную сакрэтную зброю — вялікі, пукаты, нацёрты да люстранога бляску шчыт. І як толькі падышлі яны да Базылішкавай гары, Князь па-геройску рвануў наперад. Заспаны цмок, пачуўшы нейкі грукат і лязгат на двары, высунуў заспаную морду зь пячоры. А Князь яму тыц — і падсунуў пад самы нос шчыт-люстэрка. І ўбачыў наш Цмок сваё адлюстраваньне. Паколькі шчыт быў пукаты, то адлюстраваньне выйшла скажонае, страшэнна сьмешнае. Ад нечаканасьці Цмок зарагатаў, ды так моцна зайшоўся сьмехам, што сэрца ня вытрымала і пэнкнула. Яркай вясёлкаю ўзьляцела на неба цмокава душа і пасялілася на вялікай аблачыне. І з таго часу толькі аблокі на небе паказваюць нам, якія цмокі даўней вадзіліся на зямлі.

А Князь тады радасна закрычаў:

— Перамога! Горад наш! Цяпер мы разбудуем наша места шырока-шырока! Даю загад, каб усе на Вільню камяні цягалі!

Тут ён убачыў пад нагамі некалькі камянёў, якія ляжалі сярод гальля, як тыя яйкі на гнязьдзе. Ухапіў, падняў высока-высока. І абвясьціў:

— Во гэты камень я ўмурую ў сьцяну новага замку! А гэты —ў сьцяну новага палацу! А гэты — у сьцяну касьцёлу! За работу!

## Эпілёг

Кажуць, што гэта толькі казка, але вучоныя знайшлі некалькі фактаў, якія даюць падставу думаць, якія вымушаюць трохі засумнявацца. На Бакшанскай гары, дзе была Базылішкава пячора, сёньня месьціцца музэй, і месьціцца ён не абы-дзе, а ў падзямельлі, якое цалкам магло быць калісьці цмокавым жытлом. Пра гэта месца і пра цмокаў, якія тут вадзіліся, і сёньня яшчэ старыя віленчукі расказваюць нямала жудасных легендаў. Ля падножжа Замкавай гары археолягі знайшлі скамянелыя шкарлупіны вялізнага яйка, відавочна, з такіх яйкаў даўней вылупляліся цмокі. Цяпер пагледзець на гэта шкарлупіньне можна на вуліцы Ўрублеўскага. А яшчэ кожны турыст можа ўбачыць, што ў сьценах віленскіх замкаў, палацаў і касьцёлаў умуравана надта многа гладкіх каменьчыкаў, падобных на яйкі. А на касьцёле Сьвятога Казімера адзін з умураваных камянёў нядаўна пачаў падазрона павялічвацца, так што каля яго абвалілася тынкоўка...

**Сьцяпан Дзінь-Дзілевіч**
**і Марынка Макаўка**




Палітычная гісторыя незалежнай Беларусі. Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. — 744 с.: іл.




Катлярчук, Андрэй. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў. Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 303 с.




Беларуская палітычная сцэна і прэзыдэнцкія выбары 2006 году. Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. — 284 с.




Станкевіч, Ян. Язык і языкаведа. Выданьне другое, папраўленае і дапоўненае. Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 1214 с.







Булгакаў, Валер. Гісторыя беларускага нацыяналізму. Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. — 326 с.

пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў

## КАРНАВАЛ

**Стары Новы год**

**Паэтычны тэатар «Арт.С» 11 студзеня а 18-й** запрашае на літаратурна-музычную вечарыну-карнавал «Стары Новы год у Цёткі», якая адбудзецца **ў бібліятэцы імя Цёткі (вул.Талбухіна, 12а)**. У праграме бяруць удзел: акторка Людміла Баяўчук, барды Вадзім Клімовіч, Яраш Малішэўскі, Раман Яраш, казачніца Алена Масла, паэты Маргарыта Аляшкевіч, Мікола Кандратаў.Таксама вас чакаюць літаратурная варажба, конкурсы і іншыя сюрпрызы. У ролі Каралевы зімы народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч. Вядучыя Зьміцер Арцюх і Аксана Спрынчан.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## ІМПРЭЗА



**Ірванец у Менску**

**У сераду 16 студзеня** адбудзецца прэзэнтацыя кнігі выбраных твораў аднаго з найпапулярнейшых сучасных украінскіх пісьменьнікаў Аляксандра Ірванца «Роўна/Ровно», перакладзенай Уладзімерам Арловым. Удзельнічаюць: аўтар, перакладчык, выдавец Зьміцер Колас, а таксама Зьміцер Бартосік, Лявон Баршчэўскі, Вера Бурлак, Віктар Жыбуль, Алесь Пашкевіч, Барыс Пятровіч і Андрэй Хадановіч. **Пачатак а 17.30 на Ўправе БНФ (пр. Машэрава/Варвашэні, 8). Уваход вольны.**

## ВЫСТАВЫ

**Матыльда Жыль. Выстава на вынас**

**Да 13 студзеня ў арт-галерэі «Падземка» (пр. Незалежнасьці, 43)** працуе выстава фотаінсталяцыяў францускага фатографа Матыльды Жыль, якая сваімі фатапрацамі, зьнятымі ў Беларусі, Літве, Польшчы і Францыі, дэманструе асаблівы погляд на культуру кожнай краіны.

Кожны наведнік выставы можа зьнесьці з сабой любы ўпадабаны фатаздымак. Для гэтага трэба толькі даслаць на адрас фатографа абгрунтаваньне свайго выбару.

**Скульптура ў «Падземцы»**

**З 14 студзеня да 14 лютага ў «Падземцы»** працуе пэрсанальная выстава менскага скульптара Андрэя Капусьнікава. Усе працы выкананыя спэцыяльна для гэтай выставы і будуць паказаныя ўпершыню.

**Дзіцячы мастацкі праект**

**Да 14 студзеня ў музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасьці, 47)** працуе выстава працаў пераможцаў нацыянальнага адборачнага конкурсу Міжнароднага дзіцячага мастацкага праекту Unilever International Schools Art Project (UISAP 2007—2008).

**Стары Новы год**

**Мастацкая галерэя «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) запрашае 11 студзеня а 17-й гадзіне** на адкрыцьцё выставы «Стары Новы год» твораў мастакоў-жывапісцаў — Васіля Пешкуна і Ганны Сілівончык. Работы гэтага творчага тандэму найбольш арганічна раскрываюць тэму старанавагодняга сьвята.

Васіль Пяшкун у сваёй творчасьці працягвае традыцыі рэалістычнай школы, не цураючыся ў той жа час уплыву імпрэсіянізму. Ганна Сілівончык стварае свае мастацкія вобразы на аснове беларускага народнага жывапісу, трансфармуючы яго здабыткі сродкамі сучаснага мастацтва.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Пажада»

або барацьба з акупантамі ў ложку.

**Пажада** (Se, jie)

Кітай — Тайвань — ЗША, 2007, каляровы, 157 хв.

**Рэжысэр:** Энг Лі

**Жанр:** Драма

**Прызы:** «Залаты леў» Вэнэцыянскага кінафэсту, намінацыя на «Залаты глёбус» — усяго 12 узнагародаў і 14 намінацый

**Адзнака:** 8 (з 10)

Шанхай, акупаваны японцамі. Удзельнікі драматычнага гуртку вырашаюць забіць высокапастаўленага калябаранта Йі, які катуе падпольшчыкаў. Пекная акторка Ўон уваходзіць у давер да паліцыянта й выклікае ў яго пажаду. Але гульні зь юрам — нат і дзеля патрыятычных мэтаў — справа небясьпечная…

Акварэльная пекната кадраў, стрыманасьць рухаў — і цялесная пажада, твары-маскі, калі кожны вядзе некалькі гульняў, схаваныя намёкі — і першая кроў забойства.

Карціна Энга Лі дасканалая, як вытанчаная кічавая падробка — і як шэдэўр зь бязданьню сэнсаў.

Гэта не эратычны фільм, хаця сцэны непрыхаваныя й рызыкоўныя, амаль як у «Карыдзе каханьня» (кітайскія гінэколягі нат заклікалі не паўтараць акрабатыку). У ложку разгортваецца палітычная барацьба — зь цялесным дотыкам, садамазахісцкай нянавісьцю, недаверам.

Гэта й не падпольніцкая гістарычная стужка, калі здрада набывае наўпростае ўвасабленьне (а ўявіце падобны сюжэт у беларускім кіно!).

«Пажада» — гэта клясычная мэлядрама з канфліктам паміж пачуцьцём і абавязкамі, любоўным трохкутнікам і нявыказаным прызнаньнем — калі памылка гарантуе гераічную сьмерць, а ворагу застаецца раны ў сэрцы.

**Андрэй Расінскі**

## КАЛІ Б...

**...Скарына меў якасьці Зімоўскага — апошняга ляўрэата ордэну імя Скарыны.**



**Скарына:** Як бачыце, Ваша каралеўская мосьць, у выніку заснаваньня друкарні, улада атрымае эфэктыўны сродак барацьбы з палітычнымі апанентамі.

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Падарунак для Дзеда Мароза



Апавяданьне Тацяны Барысік.

Старонка 42.

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Дзякуй вялікі ўсім,** хто віншаваў Рэдакцыю з Калядамі і Новым годам праз пошту! Здароўя, посьпехаў, дабрабыту Вам і Вашым родным!

**Сяргею К. зь Менску.** Замалёўка «Татаў гасьцінец» выдатна прыдалася б у сакавіку 2006 году. Цяпер яна троху састарэла.

**Міколу Б. зь Сьветлагоршчыны.** Абодва Вашыя лісты атрымалі. Улічым.

**Васілю зь Віцебску.** Кідайце рэфлексаваць над асабістымі перажываньнямі. Зірніце на сьвет цэлы, як Купала колісь зрабіў. Вершаў ставім мала на старонку, бо паэзіі трэба свабода.

**Андрэю В. з Смургоняў.** «Думка аб Радзіме» не высякае з сэрца іскраў.

**Сяргею Т. зь Бегамля.** Усё, што Вы пішаце, слушна, аднак ужо само тое, што ў якасьці асновы для навагодняга кабарэ БТ бярэ клясычны твор беларускай літаратуры — гэта станоўчая тэндэнцыя.

**Міхасю Т. з Слуцку.** Успамін пра партызанаў надрукуем.




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 25.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВЯНЧАНЬНЕ

**31 сьнежня 2007 году** ў Касьцёле Сьв. Сымона і Алены вянчаліся Мікалай і Вольга Зайкіны. Сакрамэнт сужэнства ўдзяліў айцец Казімір Ляховіч. Маладыя шчыра дзякуюць айцу Казіміру, а таксама Аляксею і Антаніне Казанам і Алене Белавусавай! «Любоў церпіць доўга, умілажальваецца, любоў не зайздросьціць, любоў не праслаўляе сябе, не ганарыцца, не бушуе, не шукае свайго, не раздражняецца, не намышляе ліха, ня радуецца зь няпраўды, а разам цешыцца зь ісьціны; усё пакрывае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё пераносіць. Любоў ніколі не мінецца» (1 Кар 13, 4–8)

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** 20 студзеня (нядзеля) па маршруце: Менск—Солы—Жупраны—Кушляны—Данюшава—Крэва—Баруны—Гальшаны—Менск. 1–4 лютага: Катынь–Смаленск і ваколіцы. Т.: (017)292–54–58; (029)622–57–20; (029)509–12–16; (029)110–19–28

### КНІГІ

**Шукаю кнігу** з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» «Застаемся», аўдыё «Турбаміксэр», беларускую энцыкляпэдыю т. 1—8, кнігі па гісторыі, краязнаўстве, Энцыкляпэдыю Б.М., энцыякляпедыю «Гісторыя Беларусі» т. 1—6, «Іх імёнамі названыя вуліцы», матэрыялы па ВАВ, СВ. Т.: (029)753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Прапаную кнігі** з сэыі «Кнігарня «Наша Ніва», «Беларускі кнігазбор» (у тым ліку Мальдзіс), розныя кнігі па генэалёгіі, часопісы ARCHE, «Фрагмэнты», творы маладых аўтараў, многа іншага, дашлю сьпіс прапановаў. Т.: (029)753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Іншамоўныя кнігі**: Даведнік па беларусістыцы на ням. мове 1990—2000(дам пачытаць,скапіраваць), слоўнікі ням.–бел.–рас., «Незалежная прэса» (рас., бел., англ.), «Гістарычны шлях нацыі і дзяржавы» (англ., бел.), «Курапаты» (англ., бел — адзін асобнік у падарунак), іншае. Т.: (029)753–91–96. alesknigi@mail.ru

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Гэй, братка, ты, Новы годзе,
Што з сабою нам нясеш,
Што пасееш ты ў народзе,
Што на нівах ты пажнеш,

Ці разьвяжаш ты нам путы,
Ці ня будзеш нам ліхі?
Ці зноў будзеш такі ж люты,
Як той сёмы быў, стары?..

Гэй, скажы нам?..

**Ц-ка**

**«Наша Ніва». №1. 1908**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 09.01.2008.
Замова № 143.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.